# ПАМЯЦЬ

## ЧАШНІЦКІ РАЁН

МІНСК
«БЕЛАРУСКАЯ НАВУКА»
1997

# 1941

# 1945

## ГАДЫ СУРОВЫХ ВЫПРАБАВАННЯЎ

### Пачатак вайны

З трывогай сустрэлі жыхары раёна паведамленне аб пачатку вайны. Здавалася, што вайна дзесьці далёка і што Чырвоная Армія адгоніць ворага назад. Але ў хуткім часе гэтыя спадзяванні былі развеяны бамбёжкай нямецкімі самалётамі Чашнікаў і раёна, натоўпамі бежанцаў, якія рухаліся на ўсход, іх апавяданнямі, паведамленнямі радыё. Звыклы ўклад жыцця людзей разам парушыўся.

Калгасы, саўгасы, прадпрыемствы раёна пачалі спешна эвакуіраваць на ўсход трактары, аўтамабілі, статкі жывёлы, каштоўнае абсталяванне. Цэлымі сем'ямі жыхары раёна выязджалі з Чашнікаў у бок Бешанковіч. Людзі ля сваіх дамоў пачалі будаваць укрыцці — «акопы». Неўзабаве праз раён прайшлі адступаючыя часці Чырвонай Арміі. Фронт набліжаўся.

5 ліпеня 1941 г. Чашнікі былі заняты немцамі. Большую частку тэрыторыі раёна немцы занялі без баёў. Толькі каля вёсак Тоўпіна, Вялікія і Малыя Ліпавічы, Цотава, Горы праходзілі цяжкія баі часцей 17-й дывізіі з нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Паводле справаздачы аб баявых дзеяннях часцей 17-й дывізіі, 7 ліпеня 1941 г. арганізаваны перадавы атрад пад камандаваннем маёра Міхайлоўскага. У яго склад уваходзілі 1-ы батальён механізаванага стралковага палка, 1-ы дывізіён гаўбічна-артылерыйскага палка, 2-і батальён 33-га танкавага палка, батарэя супрацьтанкавай артылерыі 17-га матастралковага палка і ўзвод сапёраў. Перад атрадам была пастаўлена задача: рухацца па маршруце Сясна — саўгас «Беліца» — Вялікія Ліпавічы — Лепель, вечарам 7 ліпеня заняць Лепель і ўтрымаць яго да падыходу часцей дывізіі.

Але ў 18 гадзін атрад нечакана сустрэўся з праціўнікам у раёне вёсак Церабені, Горкі, Вялікія і Малыя Ліпавічы. Завязаўся бой. Раніцай 8 ліпеня атрад пад камандаваннем Міхайлоўскага, адкінуўшы праціўніка, заняў вёскі Церабені і Горкі. Але яго далейшы рух спыніў моцны кулямётна-артылерыйскі агонь немцаў, якія заселі ў вёсках Вялікія і Малыя Ліпавічы.

У напрамку Мялешкавічы — Васільеўскае да немцаў падыходзілі новыя батарэі дальнабойнай артылерыі і мотапяхоты. За 3 гадзіны прыбыло да 120 аўтамашын.

Тады камандзір дывізіі вырашыў падмацаваць перадавы атрад. З гэтай мэтай у дапамогу ён выслаў 2-і батальён

механізаванага стралковага палка, 1-ы і 3-і батальёны 33-га танкавага палка, 2-і дывізіён гаўбічна-артылерыйскага палка. Перад умацаваным перадавым атрадам камандаванне паставіла задачу: акружыць і знішчыць праціўніка. Пачатак атакі быў прызначаны на 9 гадзін раніцы 8 ліпеня 1941 г.

Атака перадавога атрада была паспяховай. Немцы пачалі адступаць. Было захоплена ў праціўніка: 24 гарматы розных калібраў, 3 танкі, 4 трактары, 3 аўтамашыны і інш.

Але вечарам у 18 гадзін немцы пайшлі ў контратаку. Сілы праціўніка былі значнымі — да 60 танкаў і 600 матацыклістаў. Камандны пункт штаба дывізіі 1-га і 2-га батальёна 33-га танкавага палка былі акружаны. Адначасова з 18 да 21 гадзіны нямецкая авіяцыя бесперапынна бамбіла часці дывізіі ў раёне вёсак Церабені, Малыя і Вялікія Ліпавічы. Праследавалася кожная машына. У выніку гэтага вечарам 8 ліпеня танкавы полк быў адрэзаны ад часцей дывізіі і акружаны. У раёне в. Цотава танкавы полк перайшоў да кругавой абароны. Але з-за адсутнасці гаручага большасць машын не магла рухацца. Спробы падвезці гаручае і боепрыпасы былі безвыніковымі з-за выключна актыўных дзеянняў нямецкай авіяцыі. З данясення камандавання дывізіі і ўспамінаў сведкаў танкавага бою бачны трагічны лёс 33-га танкавага палка: частка танкаў згарэла, частка без гаручага засталася на полі бою, некаторыя патанулі ў балотах. І толькі рэшткі палка на працягу 9—12 ліпеня 1941 г. выходзілі з акружэння.

Адначасова цяжкія баі вёў 17-ы мотастралковы полк. Раніцай 9 ліпеня 1941 г. полк у складзе 1-га і 2-га стралковых батальёнаў, дывізіёна 17-га гаўбічна-артылерыйскага палка, 2 гармат супрацьтанкавай артылерыі, 6 танкаў «ТБ-7» зрабілі налёт на нямецкія мотамехчасткі ля в. Тоўпіна. У выніку бою знішчана да 50 аўтамашын праціўніка. Мотастралковы полк страціў 5 танкаў.

Але вечарам гэтага ж дня полк быў абстраляны моцным артылерыйскім агнём немцаў з вёсак Тоўпіна, Баяры, Бельнякі. У 22 гадзіны полк адышоў у паўночна-заходнім напрамку ў лес ад в. Вяцера.

10 ліпеня з 6 гадзін раніцы немцы ў складзе пяхоты, танкаў і артылерыі зноў павялі наступленне на вёскі Вяцера, Цотава з мэтай знішчэння мотастралковага палка. 1-ы стралковы батальён пры падтрымцы батарэі 17-га гаўбічна-артылерыйскага палка ўступіў у бой з праціўнікам. Адначасова 2-і стралковы батальён у складзе 4-й і 6-й рот таксама ўступіў у бой ля в. Хотліна. У выніку бою знішчана да 40 аўтамашын, 200 немцаў, у іх ліку шмат афіцэраў.

У 13 гадзін немцы пачалі моцны артылерыйскі агонь па мотастралковаму палку пры падтрымцы авіяцыі. Адначасова з раёна Вяцера — Аўсянікі яны пачалі абходзіць правы і левы флангі мотастралковага палка. З 10 па 20 ліпеня полк выходзіў з акружэння.

За час бою і выхаду з акружэння 17-ы мотастралковы полк панёс страты: загінула 7 чалавек сярэдняга начсаставу, 16 чалавек малодшага начсаставу, 43 чырвонаармейцы. 100 чалавек атрымалі раненні. За трусасць і панікёрства расстраляна 4 чалавекі. Страчана чатыры 76-міліметровыя гарматы, 26 станковых кулямётаў, 102 ручныя кулямёты, 16 мінамётаў «БН-82», 27 «РМ-50», 325 аўтамашын, 8 бронемашын, рацыя «Б-АК», аўтобус. Мноства зброі і машын было закапана і схавана ў лесе з-за адсутнасці гаруча-змазачных матэрыялаў і боепрыпасаў.

Па выніках гэтага бою камандаванне 17-й дывізіі зрабіла вывады: «...были выявлены ряд существенных недостатков, которые мешали быстрейшей ликвидации фашистских банд. Части недостаточно вели разведку противника, не оценивали местность с точки зрения проходимости и маневра танков, недостаточно организовали наблюдение за полем боя с командных пунктов и особенно внутри

действующей части, подразделения. Вследствие этого большое количество материальной части было посажено в трясинах, болотах, часть расстреляна немецкой артиллерией. Плохо была организована эвакуация подбитых и застрявших в болотах машин».

Падзеі тых далёкіх часоў да падрабязнасцей захаваліся ў памяці многіх жыхароў вёскі Тоўпіна. ...Праз вёску ішлі адступаючыя чырвонаармейцы. Цёмныя ад поту плямы на іх гімнасцёрках, запыленыя боты, стомленыя твары сведчылі аб доўгім шляху. Услед ім маўкліва глядзелі жанчыны, старыя і дзеці. Апошнім ехаў трактар, які цягнуў зялёны фургон. Ён спыніўся ля р. Усвейкі на ўскрайку вёскі. З фургона выскачылі 7 чырвонаармейцаў. Прагна напіўшыся вады, яны пачалі ажыўлена аб нечым размаўляць і нават смяяцца. Не ведалі, бедалагі, што для чатырох з іх гэта будзе апошні прыпынак.

Раптам па вуліцы з грукатам прайшла нямецкая бронемашына і спынілася на беразе Усвейкі. Высунуўшыся з люка, немец спытаўся ў знямелых людзей, паказваючы рукой на дарогу: «Сянно?» І тут ён убачыў ля ракі чырвонаармейцаў. Аглушальна прагучалі стрэлы, і чатыры чырвонаармейцы засталіся ляжаць на беразе. Астатнія кінуліся пад мост і зніклі. Гэта была, мабыць, нямецкая разведка. У хуткім часе прайшлі адзін за адным яшчэ два бронетранспарцёры. А потым паехалі аўтамашыны з салдатамі, танкі, матацыклы. Праз вёску прайшло каля 20 танкаў і 100 аўтамашын.

Адвячоркам з Барсукоўскага лесу паказаліся тры савецкія танкі. Адзін з іх праехаў па вясковай вуліцы і адкрыў агонь па нямецкіх аўтамашынах. Выехаўшы з вёскі, ён накіраваўся ў бок Чарэі і раптам загарэўся. Другі танк развярнуўся і пайшоў назад — у бок Барсукоўскага лесу, трэці праз агароды прайшоў у жытнёвае поле і адкрыў агонь па ворагу. Па выразна бачнаму на фоне поля танку немцы пачалі страляць і збілі ў ім вежу. З яго выскачыў танкіст і пабег у бок сялянскай хаты. Ён зрабіў выгляд, што мае намер схавацца ў хаце, а сам, абмінуўшы яе, пабег да ракі і схаваўся пад абрывам.

Немцы каля вёскі занялі кругавую абарону. Усе зразумелі, што рыхтуецца засада. Ужо потым стала вядома, што паралельна з дарогай Орша — Чашнікі — Лепель рухаўся наш танкавы полк, на які немцы зрабілі засаду. Праз некаторы час вяскоўцы ўбачылі тры танкі, што выйшлі з Барсукоўскага лесу і накіраваліся ў бок Тоўпіна. За імі пачалі выпаўзаць яшчэ і яшчэ. У шахматным парадку яны набліжаліся да вёскі. І раптам грымнулі гарматы. Фашысты пачалі абстрэл нашай калоны. Зямля задрыжала ад выбухаў. На дапамогу падаспела нямецкая авіяцыя. З зямлі і паветра пачалася «апрацоўка» нашых танкаў. Адзін за другім яны спыняліся нерухомымі чорнымі грудамі. Гарэлі вёскі Тоўпіна, Малыя і Вялікія Ліпавічы, Барсукі. Калі бой заціх, на полі каля в. Тоўпіна засталіся стаяць помнікамі трагедыі 84 знявечаныя танкі. 20 ліпеня 1941 г. раён быў поўнасцю акупіраваны немцамі.

*Н. Кіндзяева*

## Параднёнасць

Здарылася гэта ў ліпені 1941 г. Немцы прайшлі праз в. Запружаны, жыхары яе затаіліся ў чаканні невядомага.

Аднойчы да Лідзіі Рыгораўны Альшэўскай — урача мясцовай бальніцы, якая кватаравала ў Матроны Маркаўны Унуковіч, прыбеглі хлопчыкі. Дзеці паведамілі, што мужчына прывёз траіх цяжка параненых, ім патрэбна хуткая дапамога. Лідзія Рыгораўна разам з медсёстрамі Галяй і Зінай (яны разам жылі на кватэры ў Матроны Маркаўны) пабегла да бальніцы. Параненым аказалі дапамогу, перавязалі, паклалі ў бальніцу. Не думала тады Матрона Маркаўна, што цесна перапляцецца яе лёс з лёсам гэтых людзей.

Як высветлілася пазней, параненымі былі курсанты мінамётнай школы, што размяшчалася ў Межыцы. Школу разбамбілі фашысты, шмат курсантаў загінула. А цяжка параненых туркмена Курбана Авезсапарава, татарына Фёдара Абузарава, медсястру Зіну немцы, не давёзшы да Чашнікаў, кінулі паміраць як безнадзейных. Падабраў іх селянін з в. Запружаны.

Праз колькі дзён у вёску прыехалі гітлераўцы. Бальніцу яны ўшчэнт разграмілі, а параненых хацелі расстраляць. Але выратаваў выпадак. Мясцовы жыхар Іван Кулеш крыху ведаў нямецкую мову. Аб чым ён гаварыў з прышэльцамі, ніхто не разумеў. Толькі было бачна, што тыя згаджаюцца, ківаюць галовамі, палагоднелі. Яны пагадзіліся пакінуць хворых у абмен на яйкі, сала і іншыя прадукты. Тут жа сабралі ўсё неабходнае і перадалі чужынцам.

Параненых курсантаў узяла да сябе Матрона Маркаўна Унуковіч. Разам з Лідзіяй Рыгораўнай яна даглядала і лячыла іх. Але праз два тыдні Лідзію Рыгораўну, на руках у якой была двухмесячная дачушка, забрала маці. Даглядаць хворых давялося адной Матроне Маркаўне. Чыстымі хусцінкамі перавязвала яна раны, паіла адварам лекавых траў.

Неспакойна было ў вёсцы. Аднойчы зрабілі аблаву, і больш дваццаці «акружэнцаў» забралі. Але «сваіх выхаванцаў» Матрона Маркаўна зберагла. Яна іх выхадзіла, паставіла на ногі, а потым пераправіла ў партызаны.

Многа гора прыйшлося перажыць жанчыне і яе сям'і. За сувязь з партызанамі фашысты амаль да смерці закатаваную Матрону Маркаўну цудам не расстралялі, а адправілі ў пачатку 1944 г. у канцлагер. Толькі надзея на перамогу, жаданне ўбачыць сваіх родных і хуткае вызваленне выратавала яе ад смерці. Дачакалася перамогі, радаснай была сустрэча з дочкамі Аленай і Людмілай, якіх у 1944 г. вывезлі ў Германію.

Але падарванае здароўе не вытрымала — у хуткім часе Матрона Маркаўна памерла.

Аб лёсе выратаваных Курбана Авезсапарава і Фёдара Абузарава Алена і Людміла даведаліся пасля вайны. Як высветлілася, Фёдар Абузараў загінуў, калі яго перапраўлялі ў тыл. А вось Курбан Авезсапараў прыслаў з далёкай Туркменіі паштоўку, дзе пытаўся пра здароўе сваёй «эне», што значыць «маці».

І сёння атрымліваюць Людміла і Алена паштоўкі ад свайго «дарагога брата» з калгаса «Камсамолец» Мургабскага раёна. Парадненасць, якая прайшла праз смяротную небяспеку, цяжкія мукі, кроў і жахі вайны, засталася з імі на ўсё жыццё.

*Н. Кіндзяева*

## СПРАВАЗДАЧА АБ БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯХ 17-й ДЫВІЗІІ 7—19 ЛІПЕНЯ 1941 г.

В 14.30 7.7.41 г. под командованием майора Михайловского был выслан передовой подвижной отряд в составе 1/17 мСП, 1/17 ГАП, 2/33 ТП, батарея ПА 17 МСП, взвод саперов с задачей: двигаться по маршруту Сясно, св. «Белица», Б. Липовичи, Лепель...

Подвижной отряд в 18.00 7.7.41 г. неожиданно встретился с обороняющимся противником в районе Теребени, Горки, Бол. и Мал. Липовичи. Завязался бой и к утру 8.7.41 г. подвижной отряд, отбросив противника, занял Теребени, Горки. Дальнейшее продвижение было остановлено сильным пулеметно-артиллерийским огнем противника из Бол. и Мал. Липовичей.

Противник вводил новые батареи дальнебойной артиллерии и подбрасывал мотопехоту с направления Мелешковичи, Васильевское. В течение трех часов подведено до 120 автомашин.

Командир дивизии решил: усилить передовой отряд 2/17 МСП, 1-3/33 ТП, 2/17 ГАП с задачей: окружить и уничтожить обороняющегося противника и в дальнейшем наступать на Лепель. Начало атаки в 9.00.

В 9.30 8.7.41 г. подвижной отряд атаковал Бол. Липовичи. Противник начал бежать. В результате атаки захвачено у противника и уничтожено: орудия разных калибров — 24, танки — 3, тракторы — 4, автомашины — 3, штаб гарнизона.

В 18.00 8.7.41 г. КП штадива 1,2/33 полка контратаковал с тыла противник силою до 60 танков и 600 мотоциклистов. С этого момента дивизия была окружена. Кроме того, с 18.00 до 21.00 авиация противника беспрерывно бомбардировала части дивизии в районах Теребени, Мал. и Бол. Липовичи. Танки оказать мощную помощь мотополку не имели возможности из-за преследования буквально каждой машины. В результате чего в 21.30 8.7.41 г. полк был отрезан от частей дивизии и оказался в окружении. К 23.00 сосредоточился в районе Цотово, где перешел к круговой обороне.

9.7.41 в 8.00 17 МСП в составе 1—2 стрелковых батальонов, дивизиона 17 ГАП, 2 орудия ПА, 6 танков ТБ-7 произвел налет на сосредоточение мотомехчастей противника в районе Толпино. В результате боя уничтожено до 50 автомашин противника. Потери полка — 5 танков.

В 18.00 9.7.41 г. полк подвергся сильному артиллерийскому огню из районов Толпино, Бояры, Бельняки.

А в 22.00 полк отошел в лес северо-западнее 1 км Вятеро.

10.7.41 г. с 6.00 противник до полка пехоты с артиллерией и танками в развернутых строях повел наступление в направлении Вятеро, Цотово, видимо, имея целью уничтожить МСП в районе Цотово.

1-й стрелковый батальон при поддержке батареи 17 ГАП вступил в бой с противником. Одновременно 2-й стрелковый батальон в составе 4-й и 6-й роты также вступил в бой в районе Хотлино. В результате боя уничтожено до 40 автомашин, до 200 человек убито, в числе убитых много офицеров.

С 13.00 10.7.41 г. противник открыл сильный артиллерийский огонь. Из района Вятеро — Овсяники, одновременно начав обход правого фланга 1 сб и левого фланга 2 сб при активном действии авиации.

Полк, израсходовав к этому времени боеприпасы, начал отходить...

С 10.7.41 г. по 20.7.41 г. полк выходил из окружения...

За время боя и выхода из окружения 17 МС полк имеет потери: убито среднего начсостава — 7 человек, младшего начсостава — 16 человек, красноармейцев — 42 человека. Ранено: среднего начсостава — 8 человек, младшего начсостава — 12 человек, рядового состава — 80 человек. За трусость и паникерство расстреляно 4 человека рядового состава. Потери в материальной части: 76 мм орудий — 4 шт., ст. пулеметов — 26 шт., ручных пулеметов — 102 шт., минометов «БН-82» — 16 шт., «РМ-50» — 27 шт., автомашин — 325 шт., бронемашин — 8 шт., рации Б-АК — 1 шт., автобус — 1 шт.

Примечание: Много оружия и материальной части зарыто и замаскировано из-за отсутствия ГСМ и боеприпасов.

33 танковый полк.

8.7.41 г. 2 батальона 33 танкового полка, действуя в составе подвижного отряда Михайловского, с утра атаковал Бол. Липовичи. Противник, бросая оружие на поле боя, в панике стал отходить... Из-за отсутствия горючего у большинства машин часть машин встала на поле боя. А в основном машины для преследования и окончательного уничтожения противника двигаться не могли. Часть машин, проникнув в глубокий тыл противника, не вернулась в район сбора.

При подвозке боеприпасов и горючего авиация противника не давала возможности дозаправки. Машины, возвращающиеся из атаки в район исходных позиций, также подвергались бомбежке, в результате которой часть машин сгорела.

В течение 9—12.7.41 г. машины 33 танкового полка выходили из окружения в восточном направлении.

Командир 17 дивизии — полковник Корчагин.
Комиссар 17 дивизии — батальонный комиссар Алексеев.
Начальник штаба 17 дивизии — майор Финогенов.

*ЦАМО РФ, ф. 3431, оп. 1, д. 1, с. 24, 25.*

## Фашысцкі «новы парадак» у дзеянні

Характэрнай асаблівасцю нацысцкай акупацыйнай палітыкі на Беларусі з'яўлялася знішчэнне населеных пунктаў разам з іх жыхарамі. Гэта была палітыка татальнага спусташэння захопленай тэрыторыі і масавага знішчэння людзей, якая праводзілася планава, самымі варварскімі метадамі і сродкамі, з'яўлялася штодзённай практыкай фашысцкіх акупантаў. Людзей знішчалі незалежна ад сацыяльнага становішча, узросту, полу, нацыянальнасці, без уліку таго, з'яўляліся яны ўдзельнікамі партызанскага і падпольнага руху ці не.

З пачатку вайны масавае знішчэнне жыхароў Беларусі з прымяненнем жудасных зверскіх форм вялося са спасылкамі на барацьбу з партызанамі. Партызанскі рух разглядаўся як зручная прычына для ажыццяўлення злачынных планаў «абязлюджвання» захопленых зямель. «Партызанская вайна,— падкрэсліваў Гітлер на нарадзе 16 ліпеня 1942 г.— дае нам магчымасць вынішчаць усё, што супраць нас»*. Начальнік аператыўнага штаба паліцыі бяспекі і СД у Мінску штандартэнфюрэр СС Піфрадэр у дырэктыве начальнікам разведвальных каманд ад 18 лістапада 1942 г. патрабаваў, каб спальванне вёсак абавязкова суправаджалася пагалоўным знішчэннем усіх іх жыхароў, бо, як указвалася ў гэтай дырэктыве, «вопыт вучыць, што калектыўныя расстрэлы, спальванне вёсак без поўнай ліквідацыі або высялення іх жыхароў прыводзіць толькі да адмоўных для нас вынікаў»**.

Аб тым, як рабіліся гэтыя жудасныя злачынствы, сведчаць данясенні і справаздачы войск СС і каманд СД, паліцэйскіх, жандарскіх і іншых спецыяльных падраздзяленняў фашысцкіх акупантаў.

З тых трагічных падзей прайшло шмат гадоў, многае сцерлася з памяці людзей, а дакументы ў архівах захаваліся далёка не ўсе. З гэтае нагоды камісіі па стварэнні Хронікі Памяці раёна, на вялікі жаль, не ўдалося ўстанавіць імёны ўсіх загінуўшых.

*У. Лемяшонак*

### З АДМІНІСТРАЦЫЙНАГА РАСПАРАДЖЭННЯ № 1 КАМАНДУЮЧАГА ТЫЛАМ ГРУПЫ АРМІЙ «ЦЭНТР» ГЕНЕРАЛА ПЯХОТЫ ФОН ШЭНКЕНДОРФА

**Пераклад з нямецкага**
**7.07.1941**

#### 1. О назначении бургомистров в волостях

1. На должности бургомистров в первую очередь должны быть назначены политически надежные и квалифицированные лица по возможности из числа белорусов.
2. Бургомистр является представителем волости.
3. Он является служебным начальником над всеми лицами, работающими в волости. Он принимает их и увольняет с работы.
4. Бургомистр несет ответственность за финансовые дела волости.
5. Все жители, проживающие в волости по состоянию на 21.6.1941 г., должны быть заново учтены и переписаны бургомистром.
6. Бургомистры немедленно должны позаботиться о том, чтобы все жители были обеспечены соответствующими документами, удостоверяющими их личность: фамилия и имя, время и место рождения, местожительство, состав семьи, профессия, пребывание и род занятий, социальное происхождение, вероисповедание, национальность, подданство.

* Преступные цели — преступные средства. Документы об оккупационной политике фашистской Германии на территории СССР (1941—1944). 2-е изд. М., 1968. С. 53.

** Преступные цели — преступные средства. С. 130—131.

7. Бургомистры привлекаются к ответственности за совершенные акты саботажа в вверенной им волости. Он должен всеми средствами предотвращать акты саботажа. В его обязанность входит охрана предприятий, расположенных на территории волости, особенно жизненно важных.
8. Бургомистров и их заместителей в населенных пунктах, насчитывающих до 20 000 жителей, назначает местный комендант, а в населенных пунктах свыше 20 000 жителей назначает комендант полевой комендатуры.

*НАРБ, ф. 4683, воп. 3, спр. 952, л. 1.*

*Падрыхтаваў да друку У. Лемяшонак*

## З АДМІНІСТРАЦЫЙНАГА РАСПАРАДЖЭННЯ № 1 КАМАНДУЮЧАГА ТЫЛАМ ГРУПЫ АРМІЙ «ЦЭНТР» ГЕНЕРАЛА ПЯХОТЫ ФОН ШЭНКЕНДОРФА

**Пераклад з нямецкага**
**7.07.1941**

### II. О запрещении оставления квартир в ночное время

1. В период с 21-00 до 5-00 утра населению запрещается покидать квартиры.
2. Исключения допускаются по письменному разрешению местного коменданта для лиц, работающих в ночное время на жизненно важных предприятиях, врачами, акушерками, на машинах скорой помощи.
3. Нарушители будут строжайшим образом наказываться местными комендантами. Как вспомогательными мерами наказания могут быть временный арест с ограниченным питанием, насильственное задержание и привлечение к работам.

### VIII. Создание вспомогательной полиции

1. Для проведения полицейских мер безопасности бургомистрам поручается привлечь в вспомогательную полицию надежных «фольксдойч» белорусов, и если таковых не имеется, то поляков, и использовать полицию по согласованию с начальниками команд полиции безопасности.
2. Служащие вспомогательной полиции, которые работают в тесном контакте с местными айнзатскомандами полиции безопасности и СД, могут поддерживать связь только с местными начальниками полиции безопасности и СД или назначенными ими органами.
3. Служащие вспомогательной полиции носят белую нарукавную повязку с надписью «Вспомогательная полиция».
4. Местные комендатуры до 20-го числа каждого месяца, а впервые к 20.7.1941 года, сообщают о численности и вооружении вспомогательной полиции.

*НАРБ, ф. 4683, воп. 3, спр. 952, л. 4.*

*Падрыхтаваў да друку У. Лемяшонак*

## З ЗАГАДУ КАМЕНДАНТА БЕЛАРУСІ КАМАНДУЮЧАГА ВЕРМАХТА «ОСТЛАНД»

**Пераклад з нямецкага**
**20.09. 1941**

14. В целях безопасности по всей Белоруссии для гражданского населения вводится комендантский час с 20-00 до 6-00. В это время ни одно гражданское лицо не имеет права находиться на улице. В особо срочных случаях, например, акушерки и лица, занятые на специальных работах, должны иметь от этих учреждений пропуск сроком на 48 часов. Нарушители приказа будут задерживаться патрулем, а при попытке к бегству расстреливаться. Бургомистры должны довести до населения изложенное выше распоряжение.

*НАРБ, ф. 4683, воп. 3, спр. 952, л. 10.*

*Падрыхтаваў да друку У. Лемяшонак*

## АКУПАЦЫЙНЫ РЭЖЫМ

З 5 ліпеня 1941 г. да 27 чэрвеня 1944 г. Чашніцкі раён знаходзіўся пад нямецкай акупацыяй.

Акупацыйны рэжым уяўляў сабой сістэму палітычных, эканамічных і ваенных мер, накіраваных на ліквідацыю сацыялістычнага грамадскага і дзяржаўнага ладу, рабаванне нацыянальных багаццяў і рэсурсаў, зняволенне і знішчэнне беларускага народа. Устаноўлены т. зв. «новы парадак» уяўляў сабой жорсткі каланіяльны рэжым беззаконня, гвалту, грабяжу і крывавага тэрору. Былі ліквідаваны савецкія органы ўлады, насельніцтва пазбаўлена элементарных грамадзянскіх правоў і чалавечых свабод. Любое супраціўленне акупацыйным уладам, невыкананне іх загадаў каралася смерцю без суда і следства. Акупацыйным уладам ставілася задача навесці жах на насельніцтва любымі сродкамі. Для эканамічнага рабавання і эксплуатацыі прыродных багаццяў быў створаны спецыяльны апарат. Рабавалася не толькі грамадская ўласнасць, але і асабістая маёмасць грамадзян.

У Чашніках і буйных населеных пунктах існавала нямецкая камендатура. Былі прызначаны бургамістры, створаны паліцэйскія атрады, у вёсках прызначаны старасты. Грамадзянскую ўладу ў Чашніках напачатку ўзначальваў бургамістр Сарока, а пасля яго гібелі ў маі 1942 г. на гэтую пасаду прызначылі Гутнікава. Бургамістру была падначалена і зямельная ўправа.

Галоўнай функцыяй грамадзянскай улады было ўсталяванне нямецкага парадку на падначаленай тэрыторыі. У гэтых мэтах вуліцы Чашнікаў былі падзелены на дзесяцідворкі, за якія адказвалі прызначаныя старасты. Праз іх перадаваліся патрабаванні бургамістра і нямецкай камендатуры, загады па выхаду на работу, праводзіўся збор падаткаў. Земуправа зрабіла абмер зямлі, што прылягала да Чашнікаў, і падзяліла яе паміж жыхарамі. Кожны гаспадар павінен быў плаціць нямецкай уладзе падаткі натуральнымі прадуктамі — салам, мясам, яйкамі, зернем і інш. Былі адчынены невялікія прадпрыемствы — па вырабу глінянага посуду, выпрацоўцы скур, валначоска, пачаў працаваць млын. З-за пашкоджанасці абсталявання папяровая фабрыка, спіртзавод і льнозавод не працавалі.

Пад кіраўніцтвам грамадзянскай улады былі адчынены школа, бальніца, лазня. Па ініцыятыве жыхароў Чашнікаў з дазволу нямецкага камандавання была ўзноўлена і пачалася служба ў Спаса-Праабражэнскай царкве.

Быў арганізаваны паліцэйскі атрад, у склад якога ўваходзіла каля 30 чалавек. Узначаліў яго жорсткі кат народа С. Цяслёнак. У пасляваенны час народны суд на адкрытым працэсе раскрыў страшэнныя злачынствы гэтага здрадніка, ён не пазбегнуў заслужанай кары. Пад наглядам паліцэйскіх людзі выконвалі розную работу: капалі канавы, спілоўвалі дрэвы, якія трапялялі ў сектар агляду наваколля, расчышчалі дарогі ад снегу, узводзілі абарончыя збудаванні.

Парушэнні парадку строга караліся. Ганебныя, зневажальныя адносіны да людзей з боку новых улад асабліва праяўляліся да жыхароў яўрэйскай нацыянальнасці. Гэта група людзей была вылучана асобна: да іх дамоў былі прымацаваны шасцікутныя зоркі, на іх вопратку прышыты жоўтыя кругі.

Без суда і следства немцы расстрэльвалі актыўных камуністаў, тых, хто пры савецкай уладзе займаў кіруючыя пасады. Былі расстраляны актывістка Таццяна Канстанцінаўна Баркевіч, якая працавала ў райздраўаддзеле, Захар Герасімавіч Вяцеорац — старшыня Іванскага сельсавета (да вайны яго прозвішча было занесена ў раённую Кнігу гонару), Кузьма Ульянавіч Міцькавец — дэпутат Альшанскага сельсавета, камсамолец Васіль Плют і інш.

З дапамогай сваіх стаўленікаў немцы забіралі ў насельніцтва прадукты харчавання, жывёлу, збожжа, адзенне,

абутак. У час правядзення такіх «аперацый» нахабнымі паводзінамі вызначаліся здраднікі — паліцаі. Разам з немцамі яны забіралі ў людзей апошняе — кажухі, валёнкі, рознае адзенне, прадукты харчавання. Разам з мёдам выдзіралі з вулляў соты. Нарабаваныя прадукты і жывёлу акупанты пастаўлялі сваёй арміі і вывозілі ў Германію, асуджаючы сялян на голад.

Для дасягнення сваіх мэт новыя ўлады не саромеліся ў выбары сродкаў. Быў створаны карны атрад, які ўзначаліў М. Новікаў. Тэрор, подкуп, правакацыі, падман, расстрэл — усё прымянялася для запалохвання мірных людзей і прыгнёту. Гітлераўскія карныя атрады часта праводзілі ў вёсках аблавы. Падазроных адпраўлялі ў турму. Чалавечае жыццё нічога не каштавала.

Асабліва жудаснымі былі падзеі канца 1941 г. — пачатку 1942 г. За гэты перыяд было знішчана звыш 3 тыс. жыхароў раёна яўрэйскай нацыянальнасці (гл. асобны артыкул).

Паводле плана «Ост» на Беларусі прадугледжвалася знішчыць і выселіць па ўсход 75 % насельніцтва, непрыдатнага па т. зв. расавых і палітычных адзнаках; 25 % беларусаў падлягалі анямечванню і выкарыстанню ў якасці сельскагаспадарчых рабоў. План быў разлічаны на 30 гадоў. Аднак фашысты імкнуліся як мага болей знішчыць людзей у час вайны, каб скараціць гэты тэрмін.

Страх панаваў усюды. І вось якраз 1 мая 1942 г. адбылося здарэнне, якое ўзрушыла ўсіх. Раніцай у цэнтры Чашнікаў людзі ўбачылі, што на слупе лунае чырвоны сцяг. Бургамістр Сарока, які стаў зрываць сцяг, загінуў ад выбуху міны, прымацаванай да дрэўка сцяга.

Сталі даходзіць чуткі аб партызанах, якія з'явіліся ў лясах. Дыверсіі партызан і падпольшчыкаў на дарогах, чыгунцы, захоп і расстрэл немцаў і іх паслугачоў, зрывы збору прадуктаў харчавання здараліся ўсё часцей. У аддаленыя, размешчаныя ля лясоў вёскі немцы амаль не наведваліся, па дарогах ездзілі пад аховай. Каб праехаць па шашы, яны загадвалі спачатку прайсці падводам з мясцовымі жыхарамі, і толькі потым праязджалі самі. Колькі коней і людзей падарвалася на дарогах — не злічыць. Пазней сяляне пачалі пускаць коней з падводай, а самі кіравалі імі ззаду доўгімі лейцамі.

У адказ на дзеянні партызан і падпольшчыкаў немцы кідалі ў турмы мірных жыхароў, расстрэльвалі іх, палілі дамы.

За гады вайны ў раёне было спалена 2440 двароў, знішчэнню падверглася 187 паселеных пунктаў.

9 мая 1943 г. разам з жыхарамі трагічна загінула в. Стайчаўка Латыгаліцкага сельсавета. Фашысты расстралялі 26 мірных жыхароў і ўсе 10 хат спалілі.

У верасні 1943 г. спалена в. Чырвоная Раніца Пачаевіцкага сельсавета.

За сувязь з партызанамі брыгады «Дубава» расстраляны жыхары пасёлка Беларусь Вятоха і Шумановіч, а ў кастрычніку 1943 г. фашысты абстралялі вёску з танка і спалілі 17 дамоў з 21. Былі спалены вёскі Двор Слідцы, Ярынова, Вішанькі, Асташова, пасёлак Беларусь.

Найбольш жорсткай расправе падвергліся мірныя жыхары в. Вішанькі. Раніцай 9 сакавіка 1944 г. акупанты сагналі ў дзве хаты 114 жыхароў вёскі і падпалілі іх. Перад гэтым непадалёк ад вёскі ў баі з партызанамі загінула каля 20 немцаў, былі ўзяты 2 «языкі». І вось за гэта немцы жорстка пакаралі мірных жыхароў.

У Чашніцкім раёне в. Вішанькі называюць роднай сястрой Хатыні (гл. асобны артыкул).

За сувязь жыхароў в. Асташова з партызанамі 22 красавіка 1944 г. немцы спалілі 45 хат, у агні загінулі 22 чалавекі, в. Ярынова Красналуцкага сельсавета спалена ў красавіку 1944 г. Цудам засталіся жывымі яе жыхары.

Такі ж лёс напаткаў і в. Двор Слідцы. Спачатку ў вёсцы забралі мірных жыхароў — старых Казлоўскіх, сыны

якіх былі ў партызанах. Адна за адной пусцелі хаты — людзі ішлі ў лес. Немцы спалілі ўсе 14 хат вёскі.

Фашысты знішчылі 26 двароў у в. Федзькі, 80 двароў з 82 у в. Стаўбцы, 55 двароў з 58 у в. Пасынкі, у в. Замошша застаўся не спалены 1 двор.

У верасні 1942 г. немцы расстралялі 24 жыхароў в. Ухлё за дапамогу падпольнай групе «Цэнтр». У час вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у чэрвені 1944 г. азвярэлыя фашысты, што выходзілі з акружэння, спалілі 54 дамы ў в. Ухлё. Уцалела толькі 4 дамы. Жыхары вёскі, якіх папярэдзілі партызаны, схаваліся ў лесе. У маі 1944 г. немцы спалілі 23 дамы з 28 у в. Карнілаўка. Цалкам у гэты час спалілі в. Мялешкавічы (усе 22 дамы). У пачатку вайны ў час танкавага бою і ў перыяд вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў знішчана 70 двароў у в. Тоўпіна.

Пасля жорсткіх катаванняў у лютым 1944 г. гітлераўцы расстралялі мужных патрыётаў з Чашнікаў М. В. Грышыну, В. К. Ваўчанкову, К. А. Вінядоўскую, Кацярыну Шостак, піянерку Тамару Унуковіч. За сувязь з партызанамі адпраўлены ў канцэнтрацыйныя лагеры многія жыхары раёна.

Вясной 1944 г. нямецкія акупанты здзейснілі сваю апошнюю трагічную акцыю — пагналі ў фашысцкае рабства 1640 жыхароў раёна (гл. асобны артыкул). Трохгадовая фашысцкая акупацыя прынесла жыхарам раёна незлічоныя беды, страты і няшчасці.

*Н. Кіндзяева*

## «Вырашэнне яўрэйскага пытання»

Адным з самых жахлівых бакоў фашысцкага акупацыйнага рэжыму было правядзенне генацыду ў адносінах да асоб яўрэйскай нацыянальнасці. Па ўказанню Гітлера фашысцкія верхаводы летам 1941 года пачалі распрацоўваць планы «канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання». Гэта «канчатковае вырашэнне» азначала знішчэнне ўсіх яўрэяў... Па звестках начальніка 4-га аддзела гестапа Германа Эйхмана, якому Гітлер даручыў правядзенне ў жыццё гэтай праграмы, было забіта 6 мільёнаў яўрэяў, што складала 1/3 частку яўрэяў усяго свету[1].

Звярыную палітыку знішчэння савецкіх грамадзян яўрэйскай нацыянальнасці гітлераўскія галаварэзы з беспрыкладнай жорсткасцю ажыццяўлялі на часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і па Чашніччыне. Сюды ўслед за войскамі вермахта прыбылі айнзацкаманды і іншыя карныя органы, у абавязкі якіх уваходзіла «вырашэнне яўрэйскага пытання». Менавіта яны адразу ж аддзялілі яўрэяў ад масавага насельніцтва, загналі іх у гета, абнесенае калючым дротам, а потым усіх знішчылі.

*У. Лемяшонак*

## Генацыд

Генеральным планам нямецкага камандавання «Ост» прадугледжвалася, што ад агульнай колькасці беларусаў павінна застацца не болей 25 %. Некаторыя народы, напрыклад яўрэі, падлягалі поўнаму вынішчэнню. Сваю мэту немцы пачалі здзяйсняць з першага года акупацыі. Жудасныя карціны паўстаюць з успамінаў сведкаў трагедый масавых расстрэлаў яўрэяў у 1941 і 1942 гг.

У канцы 1941 г. у раёне была праведзена першая карная аперацыя — расстраляны яўрэі в. Лукомль (каля 300 чалавек). Асабліва жудаснымі былі люты і сакавік 1942 г. 12 лютага карнікі знішчылі каля 1800 яўрэяў у Чашніках, а 5 сакавіка — 800 яўрэяў в. Чарэя — большая палова ў мінулым жыхароў мястэчка. Каля 300 яўрэяў расстраляна ў Красналуках.

---

[1] Приговор международного Военного трибунала//Сборник «Нюрнбергский процесс». М., 1961. Т. 7. С. 401—402.

Не толькі яўрэяў расстралялі фашысты каля Слабадскога поля за р. Улаю. Побач з магілаю яўрэяў была выкапана яшчэ адна вялікая яма, куды скідвалі замардаваных беларусаў, рускіх, палякаў з Чашнікаў і навакольных вёсак. Летам 1942 г. расстралялі групу цыган.

Людзі розных нацыянальнасцей ляжаць там, на высокім узвышшы. І калі б кожнага з іх пахавалі паасобку, то не хапіла б, бадай, усяго Слабадскога поля. Гэта самыя вялікія могілкі ў Чашніцкім раёне. Каля р. Уллянкі на ўзвышшы ля в. Зарэчная Слабада стаіць помнік з надпісам: «На гэтым месцы 12 лютага 1942 г. нямецка-фашысцкімі захопнікамі расстраляна 1805 мірных жыхароў Чашнікаў».

*Н. Кіндзяева*

## Крывавы восеньскі дзень 1941 года

Стаяла хмурая восеньская раніца 1941 г. Людзі моўчкі пакідалі свае дамы і разам са старымі і дзецьмі ішлі да прызначанага месца збору. Сем'ямі, невялікімі натоўпамі няшпарка крочылі людзі, падтрымліваючы хворых і знямоглых, суцяшаючы плачучых дзетак. Сумна развітваліся з сябрамі, сваякамі, бо ведалі, што гэта іх апошні шлях.

Старая Райце Рутман захацела развітацца са сваёй унучкай немаўляткай Ідай. Нявестка Надзея Іванаўна падала маленькі скрутачак у рукі бабулі. Тая пяшчотна прыціснула да грудзей маленькую, пацалавала яе. Слёзы руччом пацяклі з вачэй Райце Рутман. Але калі яна хацела перадаць маленькую Ідачку маці, паліцаі раптам забаранілі гэта зрабіць, загадалі бабулі несці ўнучку самой. У натоўпе ўзняўся лямант, гвалт, але паліцаі з лаянкамі і вокрыкамі пагналі людзей у бок яўрэйскіх могілак. Ніякія просьбы людзей аддаць немаўлятку яе маці не дапамаглі. З натоўпу крычалі, што гэта дзяўчо — дачка Надзеі Іванаўны Ружынскай, бацька якой з'яўляецца ўрачом мясцовай бальніцы, што яна беларуска. Усё было безвыніковым — паліцаі гналі гаротных людзей па слізкай восеньскай дарозе. Тады людзі пачалі перадаваць адзін другому скрутачак з немаўляці і ўпотай паклалі дзіцё ў канаву. Потым вяскоўцы падабралі і прынеслі Надзеі Іванаўне яе дарагую Ідачку, якая нарадзілася ў 1941 г.

Дачка мясцовага равіна Ісака Лапуса Эта хацела ўцячы. Яна кінулася ў бок в. Рудніцы, але куля паліцая абарвала яе жыццё. Эта Лапус адкрыла адлік той крывавай трагедыі.

Уцячы ўдалося толькі дзвюм сёстрам Гурэвіч — Кейлі і Роні. Яны да вайны настаўнічалі ў Багушэўскай школе. Даведаўшыся, што збіраюць усіх яўрэяў, сёстры пайшлі пешшу ў Багушэўск да гаспадыні, у якой яны раней жылі на кватэры. Жанчына, рызыкуючы жыццём, цэлы месяц хавала Кейлю і Роню ў сваім доме, а потым перапраравіла ў лес да партызан.

Звыш 250 чалавек было забіта ў той восеньскі дзень 18 кастрычніка 1941 г. Сярод іх 9 чалавек з сям'і Шмулмейшэ Люхтэра, 4 чалавекі з сям'і гандляра Рахміла Плаксіна, 6 чалавек з сям'і яго брата гандляра Толі Плаксіна, 10 чалавек з сям'і равіна Ісака Лапуса, 5 чалавек з сям'і печніка Бэні Когана, па 7 чалавек з сям'і Хайкла Каца, Юдэлі Шэрмана, па 6 чалавек з сямей Бэрэ Фейгіна, Залмана Шапіры, Давіда Штэйнбока, Борэха Когана і многіх іншых яўрэйскіх сямей.

На месцы трагедыі непадалёку ад яўрэйскіх могілак стаіць помнік ахвярам фашызму.

*Н. Кіндзяева*

## Трагедыя ў лютым 1942 г.

**Расказвае Барыс Яфімавіч Плаўнік — жыхар Мінска, які нарадзіўся і вырас у вялікай сям'і ў Чашніках**

Дывізія, у якой я ваяваў на Бранскім фронце, трапіла ў канцы кастрычніка 1941 г. у акружэнне. Вырвацца з яго аказалася немагчымым. Таму мы вырашылі выходзіць невялічкімі групамі. Я ішоў лясамі, начаваць прыходзілася дзе папала. На адным з хутароў мне ўдалося набыць старое сялянскае адзенне.

Вырашыў ісці да родных мясцін, дзе мяне ведаюць, і таму лягчэй там будзе знайсці прытулак. З вялікімі цяжкасцямі, нарэшце, у канцы студзеня 1942 г. дабраўся да Чашнікаў.

Да роднага дому падышоў, калі стала ўжо цямнець. Хоць і быў прыцемак, але ўбачыў на сцяне нашай хаты, пад дахам, прыбітую шасціканечную зорку. У той час я нават не ведаў, што азначае гэта зорка.

Калі ступіў на ганак, у доме было цёмна, нязвыкла ціха. Я ціхенька, затаіўшы дыханне, увайшоў у дом. У пярэднім, дрэнна асветленым пакойчыку ўбачыў за сталом маці. Сэрца моцна сціснулася, калі ўбачыў яе сівой і састарэлай. Ад яе я даведаўся, што мой бацька і браты, наогул усе яўрэі ў Чашніках на парозе смерці. Нямецкія ўлады загадалі прыбіць шасціканечныя зоркі да ўсіх яўрэйскіх дамоў.

Бацька і браты па загаду немцаў працавалі на дарозе паміж Чашнікамі і Лепелем. Снег зграбалі з дарогі. Усё рабілі, што загадвалі. У хуткім часе на парозе з'явіліся тры мужчынскія постаці — стомленыя, нядоленыя, пачарнелыя. Мы моўчкі абняліся.

З таго часу, як пачалася вайна, я ў той вечар упершыню лёг спаць на чыстым ложку сярод сваіх родных. І пацяклі страшэнна марудна ў маім закутку дні і ночы, напоўненыя трывогамі, адчаем і жахамі. Прызвычаіцца да такога жыцця было немагчыма.

Бацька і браты кожны дзень на світанку ішлі на нявольніцкую работу, а ўвечары вярталіся змарнелымі, галоднымі і пахмурнымі. Чаму ж было радавацца? Павячэраюць моўчкі — і спаць. Адна радасць, што побач свае. І ўсё ж я не страчваў надзеі на сувязь з партызанамі. Але, каб зрабіць задуманае, трэба было абавязкова звязацца са знаёмымі. Мне ж нельга было з'яўляцца на людзях. Маглі знайсціся такія, хто заявіў бы ў паліцыю ці гестапа, што з-за лініі фронту з'явіўся сын Хаіма Плаўніка. Яны б адразу расстралялі мяне і маіх родных. Пайсці ж блукаць па лесе — таксама немагчыма. Ведаць бы, куды ісці ў тыя лютаўскія марозы — паляцеў бы нават. Засталася адзіная надзея — перажыць іх.

Фашысты лютавалі. Малейшая падазронасць у сувязі з партызанамі — адразу расстрэл. Я добра ведаў Тамару Унуковіч. Вельмі ўсхвалявала ўсю сям'ю расправа над ёю немцаў. Западозрыўшы яе ў сувязі з партызанамі, дзяўчынку расстралялі. Змардавалі, а потым расстралялі немцы Васю Плюта — камсамольца і важака моладзі. Не пашкадавалі нават слабага розумам Міцьку з Міцькаўцоў, які жыў жабрацтвам, спяваў людзям «Па Дону гуляе». Было яму за трыццаць, але па разумоваму развіццю ён быў як дзіця. Ён усіх слухаўся і быў сапраўдным добразычліўцам. Асабліва сябраваў з дзецьмі, гуляў з імі ў лапту, спяваў песні, весела смяяўся. Фашысты прычапіліся да яго за тое, што ён паўтараў дзесьці чутыя ім словы аб тым, што вернуцца яшчэ нашы. Гэтага было дастаткова, каб Міцькі не стала. Калі забойца нацэліў на яго аўтамат, Міцька радасна засмяяўся, думаючы, што з ім забаўляюцца. Так і паваліўся мёртвым на зямлю з усмешкай на вуснах.

Што датычыцца яўрэяў, то іх забівалі толькі за прыналежнасць да нацыі. Наш знаёмы Арон Брук пайшоў у мястэчковую лазню. Адтуль яго павялі ў паліцыю, потым перадалі ў гестапа ў Лепель. Там, змардаваўшы і наздзека-

ваўшыся, Арона павесілі. Мой сябра Свярдлоў змог перабрацца з Чашнікаў у Чарэю. Там ён употай жыў у сваяка. Аб гэтым даведаўся сусед — паліцай (прозвішча не памятаю). Дык гэты паліцай не паленаваўся, паехаў у Чарэю і, знайшоўшы Свярдлова, застрэліў яго.

У пачатку лютага 1942 г. распаўсюдзіліся чуткі аб тым, што ў Лепелі, Чарэі, іншых месцах расстралялі ўсіх яўрэяў. Потым стала вядома, што вакол Чашнікаў узмацнілася ахова. Стала жахліва. Мае спадзяванні, планы на вызваленне, на сувязь з партызанамі страчваліся. І вось у гэтым месяцы немцы аддалі загад усім працаздольным яўрэям-мужчынам сабрацца разам, бо прадбачыцца тэрміновая работа. Колькі дакладна сабралася тады чалавек — не ведаю. Але прыблізна было ў тым смяротным страі чалавек дзвесце. Іх павялі ў бок Зарэчнай Слабады. Калі людзі ўзышлі на мост, вартавыя, адышоўшы ад маста, з усіх бакоў пачалі страляць у людзей. Пачуліся жудасныя крыкі, стогны. Рака была замёрзлай. Дык раненыя людзі з маста кідаліся ўніз, каб скараціць свае мукі. А забойцы глядзелі на гэта жудаснае відовішча і смяяліся.

Праз некалькі дзён пасля гэтага немцы выбралі невялікую групу маладых людзей і пагналі на работу. Сярод іх былі і мае браты Эфроім і Яша. Усіх астатніх яўрэяў сталі зганяць у будынак былога касцёла: рабілі гэта гестапаўцы разам з паліцаямі Васілём Чарняўскім і яшчэ адным (прозвішча не ведаю). Я схаваўся ў лазні.

...Позна ноччу я ў суседа-ўрача папрасіў халат і пайшоў у невядомасць.

Ужо пасля вайны я даведаўся, што ўсіх яўрэяў з Чашнікаў сабралі тады разам і пад аховай пагналі да Слабадскога маста. Ішлі сем'ямі. Немаўлятак неслі на руках. Старых і хворых падтрымлівалі пад рукі.

Калі натоўп прывялі да месца расстрэлу, пачалі з усіх здымаць вопратку. Потым людзей кідалі ў яму і там расстрэльвалі. Некалькі гадзін чуўся гвалт, страшэнныя крыкі і стрэлы...

Аб сваіх братах даведаўся пазней. У той дзень, калі іх пагналі на работу, немцы загадалі чысціць снег па дарозе Орша — Лепель. Выбраўшы зручны момант, браты шмыгнулі ў кусты ля дарогі, а потым зніклі ў зарасцях. Эфроім нарваўся на фашысцкі патруль. Яго расстралялі. А Яша перайшоў лінію фронту, быў накіраваны ў дзеючую армію. А праз некаторы час загінуў на Ленінградскім фронце.

Асабіста я перайшоў лінію фронту ў раёне Тарапца. Быў накіраваны ў Маскву, дзе пасля праверкі трапіў у стралковую дывізію, якая фарміравалася ў Белгарадзе. На Сталінградскім фронце камандаваў стралковым узводам. А на Курскай дузе пасля цяжкага ранення мяне прызналі непрыгодным да ваеннай службы. З'яўляюся інвалідам Айчыннай вайны. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны І ступені, Чырвонай Зоркі, а таксама медалямі.

Прайшло многа год з таго жудаснага часу, калі загінулі чашніцкія яўрэі. Маладое пакаленне ведае вайну толькі па кінафільмах і кніжках. Я ж, перажыўшы яе жахі, здзекі, пакуты, боль ад страты родных, ніяк не магу забыцца пра яе агідны, нечалавечы твар.

*Чырвоны прамень, 22 лютага 1992 г.*

## З успамінаў Марыі Лаўрэнцьеўны Краснік — сведкі трагедыі яўрэяў у Чашніках

Калі пачалася вайна, я была вучаніцай. Але добра помню ўсё, што адбывалася ў цяжкія гады фашысцкай акупацыі. Пакутавалі ўсе — ад старога да малога. Пакутавалі ад нястач, голаду, прыніжэння чалавечай годнасці, невядомасці аб лёсах блізкіх і родных на фронце, ад прыкрай чужой мовы, «новых» парадкаў, здзекаў і смерці нявінных людзей.

Але асабліва пакутавалі ў Чашніках яўрэйскія сем'і. Я гэта бачыла, бо ба-

дай палова маіх аднакласнікаў былі яўрэямі. Школьныя сябры не падзяляліся ў нас па нацыянальнасці. Мы ўсе паважалі выдатніцу, разумніцу Соню Якерсон, захапляліся прыгажуняй Рывай Талан, з усімі сябравалі. Свае дзявоцкія сакрэты я давярала сяброўцы Соні Генкінай. Немцы загадалі на яўрэйскіх дамах прыбіць шасціканечныя зоркі. Усе дарослыя яўрэі павінны былі насіць на рукавах жоўтыя павязкі і на спіне адзення жоўтыя кругі. У хуткім часе пайшлі чуткі аб забойствах яўрэяў і што такі ж лёс чакае іх у Чашніках. Аб гэтым нават страшна было падумаць.

Яўрэям забаранялася наведваць адзін аднаго, падтрымліваць сувязь з суседзямі-беларусамі, нельга было выходзіць за межы мястэчка. Ім не было чаго есці, бо магазіны ў Чашніках не працавалі. Таму беларусы, рызыкуючы жыццём, абменьвалі ў вёсках ці на базары іх адзенне і іншыя рэчы на прадукты харчавання. Немцы загадвалі яўрэям выконваць самую брудную і цяжкую работу. Зусім старых жанчын прымушалі вырываць траву каля тратуараў. За іх працай назіраў малады немец, які біў бізуном тых, хто, на яго погляд, выконваў работу не так, як трэба.

Немцы прыдумалі здзекі для пажылых мужчын. Каля пажарнай заўсёды стаяла на двухколцы вялікая бочка з вадой. У гэтую двухколку немцы запрагалі пажылога яўрэя, адзін з фашыстаў садзіўся на бочку і з рогатам гнаў бедалагу да ракі. З пустой бочкай можна было яшчэ так-сяк упраўляцца. Але ж яе трэба было напоўніць вадой і потым везці ўгару да пажарнай. Не кожны мог зрабіць гэта. І тады знясіленага старога чалавека фашысты пачыналі біць і катаваць.

Немцы загадалі выбраць сярод яўрэяў старасту. Ім стаў Чарэйскі, які да вайны працаваў у бальніцы загадчыкам гаспадаркі. Кожны дзень ён атрымліваў ад немцаў розныя заданні і павінен быў давесці іх да кожнага яўрэя, а вечарам зрабіць справаздачу аб выкананні загаду. Так прадаўжалася да лютага 1942 г.

У сярэдзіне лютага ў Чашнікі з боку Бачэйкава пешшу прыбыў атрад карнікаў. Нават знешні выгляд іх быў страшны. На шапках прымацавана эмблема — чалавечы чэрап і скрыжаваныя косці. Нават на іх твары было глядзець непрыемна — злыя, жорсткія, нечалавечыя. Яны загадалі яўрэям узяць з сабой самыя каштоўныя рэчы і сабрацца ў раённым Доме культуры (былы Мікалаеўскі сабор). Адтуль іх збіраліся везці ў яўрэйскае гета. Ніхто ў гэта не верыў, таму ў прызначаны час людзі не прыйшлі да Дома культуры. Апоўдні ў яўрэйскіх дамах з'явіліся немцы і паліцэйскія. Яны выганялі жыхароў на вуліцу. Чашнікі былі ачэплены. Нікога не выпускалі з Чашнікаў, не дазвалялі хадзіць па вуліцах. Ды і ніхто не спрабаваў гэтага рабіць, усе пахаваліся. Толькі натоўп старых, дзяцей і жанчын гналі карнікі да Дома культуры. Людзі галасілі, бо ведалі, што гэта іх апошні шлях. Некаторыя спрабавалі выратавацца ўцёкамі. Яны беглі праз раку ў напрамку да Слабадскога поля. Але на белым снезе чорныя постаці людзей былі добра бачны, і іх немцы расстрэльвалі з кулямёта. Некалькі трупаў ляжалі на лёдзе ракі, пакуль веснавы паводак не знёс іх. Фашысты забаранілі хаваць расстраляных.

Жудасную ноч правялі сагнаныя ў Дом культуры гаротныя людзі, чакаючы страшэннага прысуду. На світанку першую вялікую партыю яўрэяў прагналі па Чашніках. Уперадзе, падабраўшы крысы паліто, крочыла пажылая жанчына. Вецер развяваў яе сівыя валасы, чорныя вочы глядзелі ўдалячынь. Гэта была паважаная ў Чашніках дзіцячы ўрач Ліберман.

Група зрабіла спробу прыпыніцца ля сінагогі, але немцы не дазволілі гэта зрабіць. Натоўп пакорліва рушыў далей. Плакалі дзеці, многія галасілі, іншыя пляліся моўчкі, панура апусціўшы галаву.

З адчаем і болем углядалася я ў натоўп, бачыла твары сваіх школьных сябровак і аднакласнікаў. У першых радах прайшла са сваёй сям'ёй выдатніца Соня Якерсон. Бацька, маці, Соня і яе цётка брылі, абняўшыся, моўчкі. Замыкала калону мая сяброўка Соня Генкіна. Яна вяла пад руку бацьку — вядомага ў Чашніках краўца. Побач цягнулася маці.

У гэты дзень немцы схапілі аднакласнікаў Лізу Пухавіцкую, Абрама Пухавіцкага, Зяму і Раю Бадханаў, Абрама Дыкмана, Мэра Цынмана, Іду Давідсон, Соліка Кроза разам з іх сем'ямі. Невыносна жудасна і балюча было глядзець на твары знаёмых людзей.

Натоўп знік за ракой. Сведкі гэтай жудаснай трагедыі расказалі, што людзям давялося доўга чакаць смяротнага часу. Карнікі, прыпыніўшы натоўп, пачалі паглыбляць кар'ер узрыўчаткай. А спецыяльна мабілізаваная група мужчын рыдлёўкамі папраўляла ўтвораную яму.

Потым усім загадалі зняць вопратку, спусціцца ў кар'ер і легчы адзін каля аднаго. Побач лажыліся родныя, сваякі. Зверху на іх стралялі карнікі. Хто не пажадаў падпарадкавацца загаду, таго забівалі наверсе, а потым іншым яўрэям загадвалі скідваць мерцвякоў у яму.

Тры вялікія групы пакутнікаў прайшлі ў гэты нядзельны дзень праз Чашнікі. У царкве званілі, ішло богаслужэнне. Было свята — грамніцы. Але гэта ніколькі не засмучала, не трывожыла фашыстаў. Яны метадычна выконвалі крывавую справу.

У апошняй групе я ўбачыла настаўніцу нямецкай мовы Ганну Сямёнаўну Давідсон, якая мужна і, здавалася, спакойна ішла да месца пагібелі. Прайшлі тры сястры — Хана, Маня і Соня. Трывога і пакуты адбіваліся на прыгожым твары Рывы Талан. Двойчы немцы ад кар'ера вазілі яе ў Чашнікі. Расказвалі, што яна абяцала аддаць усе сямейныя каштоўнасці ў абмен на жыццё. Але яе, як і ўсіх іншых, расстралялі. Не абмінула куля і старасту Чарэйскага.

Некаторыя яўрэйскія сем'і спрабавалі хавацца, каб перачакаць страшныя гадзіны. Але мала каму пашанцавала. Іх знаходзілі, катавалі і расстрэльвалі. Так было з сям'ёй Беленькіх. Фашысты пяцёра чалавек знайшлі на гарышчы дома. А па вуліцы Луначарскага са склепа немцы выцягнулі сям'ю Саламонавых.

Гэта трагедыя адбылася 12 лютага 1942 г.

## Жыхары г. Чашнікі, расстраляныя 12 лютага 1942 г. каля в. Зарэчная Слабада

**АРАНСОН Яўрам**
**АРАНСОН Эстар Аўрамавіч**
**АРОН Гінус Самойлавіч**
**АРОН Муля** і яе 5 дзяцей
**БЕЛЕНЬКІ Гіля**
**БЕЛЕНЬКІ Кушэ Майсеевіч,** н. у 1887
**БЕЛЕНЬКІ Майсей Гілевіч,** н. у 1922, настаўнік Лукомскай СШ
**БЕЛЕНЬКІ Майсей Кушэлевіч,** н. у 1927, вучань
**БЕЛЕНЬКІ Міхаіл,** вучань
**БЕЛЕНЬКАЯ Галіна Майсееўна,** н. у 1889
**БЕЛЕНЬКАЯ Роза Гілеўна,** н. у 1935, вучаніца
**БЕЛЕНЬКАЯ Рыва Восіпаўна,** н. у 1988
**БЕЛЕНЬКАЯ Сара Кушэлеўна,** н. у 1889
**БЕЛЕНЬКАЯ Хана Гілеўна,** н. у 1929
**БЕЛЕНЬКАЯ Хана Рыгораўна,** н. у 1930
**БЕЛЕНЬКАЯ Юля Кушэлеўна,** н. у 1917, піянерважатая
**БЕЛЕНЬКАЯ Яўгенія Кушэлеўна,** н. у 1920, бухгалтар
**БЕНУМАН Цеска** і 2 дзяцей
**БЕТХЕН Лёва,** бухгалтар
**БЛЯХМАН Аляксей Восіпавіч,** н. у 1912, старшыня Чашніцкага пасялковага Савета
**БЛЯХМАН Восіп**
**БЛЯХМАН Ганна Антонаўна**
**БЛЯХМАН Тамара** (4 гады)
**БЛЯХМАН Уладзімір** (18 год)
**БОГАРАД Бейля Захаравіч,** н. у 1928
**БОГАРАД Ісак Захаравіч,** н. у 1925
**БОГАРАД Марыя Захараўна,** н. у 1920
**БОГАРАД Хова Барысавіч,** н. у 1892
**БОЧСАР Дода Лейбавіч,** н. у 1879
**БОЧСАР Нэдзя Лейбавіч,** н. у 1875
**БРУСЕР Аляксандр,** н. у 1924
**БРУСЕР Барыс,** н. у 1922
**БРУСЕР Беба,** н. у 1927
**БРУСЕР Муся,** н. у 1930

**БРУСЕР Сямён**, н. у 1923
**БРУСЕР Хоне**, н. у 1932
**БУКМАН Хацкель**
**БЯГУН Бася Якаўлеўна**
**БЯГУН Галіна Міхайлаўна**
**БЯГУН Маніс Міхайлавіч**
**ВАЙСБЕЙН Іслаер**
**ВАЙСБЕЙН Хая** і 2 дачкі (5 і 8 год)
**ГАУФМАН Давід**, н. у 1926
**ГАУФМАН Зальман**, н. у 1937
**ГАУФМАН Іда**, н. у 1924
**ГАУФМАН Маісей**, н. у 1902
**ГАУФМАН Мацільда**, н. у 1930
**ГАУФМАН Міхаіл**, н. у 1927
**ГАУФМАН Рэйза** (каля 55 год)
**ГАУФМАН Сімон**, н. у 1930
**ГЕРМАН Зінада**
**ГЛОЗМАН Гірша**
**ГЛОЗМАН Лёля**, н. у 1932
**ГЛОЗМАН Люба**, н. у 1920
**ГЛОЗМАН Міша**, н. у 1936
**ГЛОЗМАН Рыгор**
**ГЛОЗМАН Сара**
**ГОЛЬДЗІН Рубін**
**ГОЛЬДЗІНА Елізавета Самуілаўна**, н. у 1918
**ГРЫЖМАН Шэфра Барысаўна**, н. у 1890
**ГРЫЖМАН Янкель Барысавіч**, н. у 1881
**ГУБІЧ Міхаіл Аўрамавіч**, н. у 1939
**ГУЗМАН Эська**
**ГУРЭВІЧ Марыя**
**ГУТМАН Перла**, н. у 1923
**ГУТМАН Услаер**
**ГУЦІН Шалем Якаўлевіч**, н. у 1925
**ГУЦІНА Пая Якаўлеўна**
**ДАВІДСОН Барыс**
**ДАВІДСОН Хая Барысаўна**
**ДАНЯК Хая**, н. у 1924
**ЕЛЬКІНТ Паліна Барысаўна**
**ЗУСЯ Сеўра**
**ІОФЭ Іда**
**ІОФЭ Міша**
**КАДЗІНСКІ**
**КАЎМАН Айзіч**
**КАЦМАН Айзік Аруманавіч**, н. у 1888
**КАЦМАН Хац-Сара Мосіпаўна**, н. у 1870
**КАЧАН Маісей**
**КОТЛАН**
**КРУМГАНТ Восіп**, н. у 1892
**КРУМГАНТ Любоў Самуілаўна**, н. у 1910, настаўніца
**КРУГМАНТ Марыя**
**КРУГМАНТ Пая Саламонаўна**, н. у 1897
**КРЫВАЛАПАВА Муся**, н. у 1924
**ЛЕВІН Восіп**
**ЛЕВІН Орка**
**ЛЕВІН Рафаэл Якаўлевіч**
**ЛЕВІН Якаў Маісеевіч**, н. у 1925
**ЛЕВІН Яша**
**ЛЕВІНА Іда**
**ЛЕВІНА Лэя Маісееўна**, н. у 1901
**ЛЕВІНА Муся**, вучаніца 8 класа
**ЛЕВІНА Рая**
**ЛЕВІНА Роха**
**ЛЕВІНА Соня**
**ЛЕВІНА Эля Маісееўна**, н. у 1928
**ЛІЎСАН Бася Рыгораўна**, н. у 1899
**ЛІЎСАН Маісей Яўсеевіч**, н. у 1899
**ЛІЎСАН Капель Маісеевіч**, н. у 1930
**ЛІЎСАН Хайм Маісеевіч**, н. у 1934, вучань
**ЛІЎСАН Яўсей Капелевіч**, н. у 1871
**ЛЮХТАР Залман**
**МАВО Зінаіда Ісакаўна**, н. у 1917
**МІЛАШНІКАВА Марыя**
**МІЛЕР Бакламін Ісакавіч**, н. у 1892
**МІЛЕР Гіта**, н. у 1924
**МІЛЕР Іда Навумаўна**
**МІЛЕР Міхаіл**
**МІЛЕР Роха**, н. у 1923
**МІЛЕР Роха Міхайлавіч**, н. у 1867
**МІЛЕР Самбер**
**МІЛЕР Хося Якаўлеўна**, н. у 1892
**МІЛЕР Ціша**
**МІЛЕР Якаў Лазаравіч**, н. у 1862
**МІЛЕР Янкель**
**МІНЦ Рахіль Маркаўна**, н. у 1917, аптэкар
**МІНЦ Яфім Ісакавіч**, н. у 1939
**ОНУКЕЛЬ Багдана** і 4 дзяцей
**ОНУКЕЛЬ Залман Навумавіч**, н. у 1904
**ОНУКЕЛЬ Якель Навумавіч**
**ПАПКО Залман**
**ПАПКО Міхаіл**
**ПАПКО Мендэль**, яго жонка і 2 дзяцей
**ПАПКО Нахма**
**ПАПКО Хонда** і 2 дзяцей
**ПАПКО Шмуйла**
**ПАПКОВА Ліба**
**ПЕРАПЕЛЬЧЫК Галіна**, н. у 1938
**ПЕСМАН**
**ПЕСМАН Ідзік**, н. у 1927
**ПІКУС Бася**, н. у 1925
**ПІКУС Іда**
**ПІКУС Люта**
**ПІКУС Рыва**, н. у 1925
**ПЛАЎНІК Апанас Яфімавіч**, н. у 1924
**ПЛАЎНІК Бёля Давыдаўна**, н. у 1890
**ПЛАЎНІК Хайм Залмавіч**, н. у 1882
**ПЛЮТ Гаўрыла Харытонавіч**, н. у 1901
**ПОЛАЦКАЯ Роха**
**ПОЛАЦКІ Пейсак Маісеевіч**
**ПРАЙС Бэся**
**ПРАЙС Сара**
**ПУХАВІЦКАЯ Геля Барысаўна**
**ПУХАВІЦКАЯ Гіля Рахімаўна**, н. у 1934
**ПУХАВІЦКАЯ Дзіна Аркадзьеўна**, н. у 1900
**ПУХАВІЦКАЯ Дора Самуілаўна**, н. у 1910
**ПУХАВІЦКАЯ Ента Аўрамаўна**, н. у 1897
**ПУХАВІЦКАЯ Зяма Рахімаўна**
**ПУХАВІЦКАЯ Ліза**, н. у 1920, настаўніца
**ПУХАВІЦКАЯ Ліза**, н. у 1924
**ПУХАВІЦКАЯ Любоў Самуілаўна**, н. у 1914, настаўніца
**ПУХАВІЦКАЯ Марыя**
**ПУХАВІЦКАЯ Муся Ісакаўна**, н. у 1927
**ПУХАВІЦКАЯ Муся Маісееўна**, н. у 1906
**ПУХАВІЦКАЯ Позя Аўрамаўна**, н. у 1896
**ПУХАВІЦКАЯ Рахіла Маісееўна**, н. у 1907
**ПУХАВІЦКАЯ Рая Рахімаўна**, н. у 1934

**ПУХАВІЦКАЯ Роза Самуілаўна**, н. у 1907
**ПУХАВІЦКАЯ Сара Аўрамаўна**, н. у 1889
**ПУХАВІЦКАЯ Сара Лейбаўна**, н. у 1925
**ПУХАВІЦКАЯ Соф'я Самуілаўна**, н. у 1921
**ПУХАВІЦКАЯ Хая Самуілаўна**, н. у 1919
**ПУХАВІЦКАЯ Хая Самуілаўна**, н. у 1921
**ПУХАВІЦКАЯ Хова Рыгораўна**, н. у 1894
**ПУХАВІЦКАЯ Фаня Маісееўна**, н. у 1891
**ПУХАВІЦКАЯ Фейга Самойлаўна** і 2 дзяцей
**ПУХАВІЦКІ Цыпа-Эстэр**
**ПУХАВІЦКАЯ Элата Айзенаўна**, н. у 1926
**ПУХАВІЦКАЯ Эця**, н. у 1922
**ПУХАВІЦКІ Абрам**
**ПУХАВІЦКІ Айзік Абрамавіч**, н. у 1894
**ПУХАВІЦКІ Візар**
**ПУХАВІЦКІ Барыс Якаўлевіч**
**ПУХАВІЦКІ Ісак Маісеевіч**, н. у 1896
**ПУХАВІЦКІ Кауля**
**ПУХАВІЦКІ Лазар Навумавіч**
**ПУХАВІЦКІ Маісей**
**ПУХАВІЦКІ Раман Ісакавіч**, н. у 1931
**ПУХАВІЦКІ Рахіл Абрамавіч**, н. у 1884
**ПУХАВІЦКІ Самуіл Абрамавіч**, н. у 1887
**ПУХАВІЦКІ Лёва Абрамавіч**
**ПУХАВІЦКІ Хоця Маісеевіч**, н. у 1903
**ПУХАВІЦКІ Шмон Маісеевіч**, н. у 1887
**ПУХАВІЦКІ Якаў Навумавіч**
**РАНІТСОН Літман Лейбавіч**
**РАНІТСОН Шмуэл Маісеевіч**
**РАНІТСОН Эстэр Абрамавіч**
**РАПАПОРТ Гінда Міхайлаўна**, н. у 1872
**РАПАПОРТ Саламон Міхайлавіч**, н. у 1837
**РАПАПОРТ Хая**, н. у 1922
**САФРО Зэльман**
**САФРО Міхаіл**
**САФРО Сімха Янкелеўна**, н. у 1887
**САФРО Соня**, н. у 1924
**САФРО Рахіль Сімхаўна**, н. у 1926
**САФРО Хася Хаймаўна**, н. у 1895
**САФРО Эфрон Сімхаўна**, н. у 1928
**СВІДЛЕР Зуся і жонка**
**СВЯРДЛОВА Цесна**
**СЕМІЛЬГОР Хана**, н. у 1872
**СЕНЬКІТА Соня**, н. у 1924
**ТАЛАН Абрам**
**ТАЛАН Гета Генцэўна**, н. у 1871
**ТАЛАН Давід Лейбавіч**, н. у 1871
**ТАЛАН Залман Лейбавіч**, н. у 1890, рабочы папяровай фабрыкі
**ТАЛАН Лія Восіпаўна** і 2 дзяцей
**ТАЛАН Муся Давідаўна**, н. у 1935
**ТАЛАН Рыва**
**ТАЛАН Сіма Самуілаўна** і 5 дзяцей
**ТАЛАН Софья Давідаўна**, н. у 1921
**ТАЛАН Хая Давідаўна**, н. у 1914
**ФУСМАН Янкель**
**ХАЙМАН Аляксандр**, 3 гады
**ХАЙМАН Ніна Якаўлеўна**, н. у 1919
**ХЕЙФІС Рыгор**
**ЦАЛМАН Маісей**
**ЦЫЛМАН Моўша**, н. у 1923
**ЦЫЛМАН Нэра**, н. у 1923
**ШАПІРА Абрам**, н. у 1925
**ШАПІРА Барах Мeераўна**, н. у 1933
**ШАПІРА Зяма**, н. у 1936
**ШАПІРА Іда Мeераўна**, н. у 1928
**ШАПІРА Лева Мeераўна**, н. у 1936
**ШАПІРА Ліва Маісееўна**, н. у 1898
**ШАПІРА Меер Міхайлавіч**, н. у 1890
**ШАПІРА Соня Барысаўна**
**ШАПІРА Фоля Міхайлаўна**, н. у 1882
**ШАПІРА Энта Мeераўна**, н. у 1923
**ШПІЛЬМАН Бася**, н. у 1926
**ШПІЛЬМАН Земан**
**ШТЭНГАРД Абрам Явелевіч**, н. у 1924
**ШТЭНГАРД Блюма Явелевіч**, н. у 1930
**ШТЭНГАРД Лейба Явелеўна**, н. у 1927
**ШТЭНГАРД Люта**
**ШТЭНГАРД Сара**
**ШТЭНГАРД Сіма**
**ШТЭНГАРД Хаім**, н. у 1917
**ШТЭНГАРД Хасар Абрамаўна**
**ШТЭНГАРД Хая Явелеўна**, н. у 1932
**ШТЭНГАРД Явель**
**Шуб Таіс Барысавіч**
**ШУБ Хайроха Навумаўна**
**ШЭНКІН Міхаіл**
**ШЭНКІН Хайм** і жонка
**ШЭНКІНА Дойра Львоўна**
**ШЭНКІНА Маня**
**ШЭНКІНА Соня**
**ШЭНКІНА Хана**
**ЭБЕР Ніна Барысаўна**, н. у 1912, і 2 дзяцей
**ЭЛЬКІНТ Барыс**
**ЭЛЬКІНТ Нэся**
**ЭЛЬЯНАВА Марыя Абелеўна**
**ЭЛЬЯНАВА Соня Бенцаўна**, 4 гады
**ЭЛЬЯНАВА Хася Бенцаўна**, 6 гадоў
**ЭЛЬЯНАЎ Алмер Давыдавіч**
**ЭЛЬЯНАЎ Бенцман Алмеравіч**, н. у 1910
**ЭРТМАН**
**ЯКЕРСОН Бэрка Генухавіч**, н. у 1881
**ЯКЕРСОН Дора Лейбаўна**, н. у 1880
**ЯКЕРСОН Соня Бэркаўна**, н. у 1927
**ЯКЕРСОН Янкель** і яго дачка Соня

## На світанку 5 сакавіка 1942 года

У в. Чарэя напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны больш палавіны насельніцтва складалі яўрэі. З першых жа дзён акупацыі страх, які панаваў у яўрэйскіх сем'ях, набыў кульмінацыю пасля расстрэлу яўрэяў у Лукомлі і Чашніках. Людзі разумелі, што іх чакае.

Трагедыя адбылася ў пачатку сакавіка 1942 г. Атрад карнікаў, які напярэдадні прыбыў у Чарэю, на світанку 5 сакавіка пачаў выганяць з дамоў сем'і яўрэяў. Дзве вялікія калоны людзей

прайшлі праз вёску: адна — да сіласнай ямы калгаса «Колас», другая — да выкапанай у балоце ямы на другім канцы вёскі.

З нямецкай педантычнасцю і фашысцкай жорсткасцю акупанты загадвалі яўрэйскім сем'ям спускацца ў яму, дзе іх расстрэльвалі з кулямётаў. Да мёртвых у яму спускалася наступная група людзей. І зноў чуліся стрэлы. Так доўжылася, пакуль не быў забіты апошні чалавек.

Некаторыя з натоўпу спрабавалі ўцячы, але з устаноўленых на ўзвышшах вакол Чарэі кулямётаў іх расстрэльвалі. Былі спробы схавацца ў хлявах, сярод дроў, у склепах, стагах. Але карнікі пільна сачылі за ўсім як у Чарэі, так і ў навакольных вёсках. Яны знаходзілі людзей і расстрэльвалі.

Так, сям'я Шмуйлы Когана, які да вайны працаваў брыгадзірам рыбалавецкай арцелі, схавалася ў в. Вал. Але праз некалькі дзён карнікі напалі на іх след. Когана, яго жонку і дачку расстралялі. Выратаваліся толькі два сыны, якія пайшлі ў партызаны.

У в. Болюта схавалася сям'я гандляра Слеймы Гурэвіча. Яе таксама знайшлі і ўсіх расстралялі. Сям'я Бэркі Крэмера на шляху да лесу наткнулася на засаду карнікаў. Крэмера, яго жонку і дачку расстралялі. Толькі сыну ўдалося ўцячы. Загінуў ён на фронце ў канцы вайны. За некалькі дзён сакавіка карнікі знішчылі каля 800 яўрэяў. На месцы трагедыі стаіць помнік ахвярам фашызму.

*Л. С. Шайкоўскі*

## Аб гэтым забываць нельга

### З успамінаў жыхара в. Камянец Уладзіміра Паўлавіча Пазняка

З жахам я ўспамінаю падзею, якая адбылася ля нашай вёскі летам 1942 года. Аднойчы праз вёску немцы правялі пад канвоем каля 15 мужчын і загадалі ім за ваколіцай капаць роў. Калі роў быў даволі глыбокім, вяскоўцы ўбачылі натоўп людзей, які набліжаўся да вёскі. Каля 80 знямоглых, знясіленых жанчын, старых і дзяцей панура і пакорліва ішлі па пыльнай вясковай вуліцы.

Тады праводзіліся масавыя расстрэлы яўрэяў, весткі аб чым дайшлі і да нашай вёскі. Таму не цяжка было здагадацца, які лёс чакае гэтых людзей, бо яны таксама былі яўрэямі.

На наш двор раптоўна забегла жанчына з дачкой і папрасіла вады. Але не паспела яна наталіць смагу, як немец зноў заштурхнуў яе ў натоўп. Не заўважаная немцам, дзяўчынка засталася на нашым двары і моўчкі пазірала на нас. Яна не плакала, не крычала, толькі яе вочы як бы прасілі: «Выратуйце, мяне, людзі». Думаю, што маці зрабіла гэта знарок, каб уратаваць жыццё сваёй дачцы.

Мая маці, Вера Навумаўна Пазняк, хутка завяла дзяўчынку ў хату і пакарміла яе. Усе разумелі, што чакае маці і ўсю сям'ю, калі раптам аб гэтым учынку даведаюцца немцы.

Праз нейкі час за вёскай пачуліся стрэлы, якія болем адгукнуліся ў сэрцах вяскоўцаў. Хутка стрэлы заціхлі. Насыпаўшы вялікі пагорак над ровам, немцы пакінулі вёску.

Тыдні праз тры зайшла да нас настаўніца Марыя. Прозвішча яе ніхто не памятае. Вядома толькі, што яна з дачкой Ліляй прыехала з Масквы і працавала ў школе настаўніцай. Яна таксама была яўрэйкай. Жахлівая падзея падштурхнула яе, мабыць, прыняць рашэнне пайсці з вёскі і дзе-небудзь схавацца. Забраўшы сваю дачку Лілю і ўратаваную дзяўчынку, яна развіталася і пайшла з вёскі. Сумным было гэта развітанне.

Як склаўся далейшы лёс Марыі, Ліլі і той дзяўчынкі — ніхто не ведае. Як ніхто не ведае і аб тым, адкуль немцы прыгналі тых людзей. Усё жыццё пражыў я ў в. Камянец і ніколі не бачыў, каб хто-небудзь наведаў пахаваных у рове за вёскай. Але памятаць аб гэтым трэба.

**АКТ ГРАМАДЗЯН в. КРАСНАЛУКІ***
**ХАЛОПЕНІЦКАГА РАЁНА МІНСКАЙ ВОБЛ. І ПРАДСТАЎНІКОЎ ВАЙСКОВАЙ ЧАСЦІ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ АБ ЗВЕРСКІМ РАССТРЭЛЕ МІРНЫХ ЖЫХАРОЎ ВЁСКІ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІМІ КАРНІКАМІ Ў САКАВІКУ 1942 г.**

**30 чэрвеня 1944 г.**

Мы, жители дер. Краснолуки Холопеничского района Минской обл. Каменец В. С., Щетко Е. А., Бабариха Е. С. и представитель воинской части майор Алексеенко С. А., составили настоящий акт о нижеследующем:

В марте 1942 г. карательный отряд немецких бандитов окружил дер. Краснолуки, согнал в одно место 300 жителей села — мужчин, женщин и детей, а также 50 беженцев, выгнал их за село к яме и здесь расстрелял из пулеметов и автоматов. Одна тяжело раненная женщина выбралась из ямы и ушла. Но на второй день ее поймали и расстреляли.

*Жители дер. Краснолуки В. Каменец, Е. Щетко, Е. Бабариха и майор С. А. Алексеенко.*

* Цяпер в. Красналукі ўваходзіць у склад Чашніцкага раёна (заўв. рэд.).

## Узнаўленне святыні

### З успамінаў жыхароў Чашнікаў

Вялікі смутак агарнуў людзей, калі ў 30-я гады пачалі закрываць цэрквы ў Чашніках і вёсках раёна. У Мікалаеўскай царкве (былым касцёле) ўлады зрабілі Дом культуры, у будынку Праабражэнскай царквы — склад. Усе абразы, царкоўнае начынне выкінулі на цвінтар. З жалем і болем у сэрцы людзі падбіралі рэшткі знішчаных святынь і неслі да сваіх хат, бо знішчыць веру людзей у Бога такімі дзеяннямі ўлад было немагчыма.

Але ёсць такая народная прымаўка: «Як бяда да парога — мы ўсе да Бога». Так і здарылася, калі пачалася Вялікая Айчынная вайна. Жыхары Чашнікаў пачалі прасіць акупацыйную нямецкую ўладу адкрыць Праабражэнскую царкву. Немцы не пярэчылі, толькі прапанавалі знайсці святара. Людзі абралі царкоўнага старасту. Гэта быў разумны, разважлівы чалавек па прозвішчу Камендант. Яму і даручылі шукаць бацюшку. Камендант даведаўся, што ў вёсцы Касянічы — у Крупскім раёне, недалёка ад Чарэі — жыве дзяк Міхаіл Парашчанка. Яму і прапанаваў стараста пайсці служыць у Чашніцкую Праабражэнскую царкву. М. Парашчанка згадзіўся, але паставіў умову: адрамантаваць царкву, іканастас, знайсці абразы.

Людзі агульнымі намаганнямі зрабілі рамонт, мясцовы мастак Мітрафан Швара змайстраваў іканастас. Жыхары Чашнікаў і навакольных вёсак знеслі абразы. Гэта былі абразы з Праабражэнскай, Пачаевіцкай, Сялецкай, Вядрэнскай, Дварэцкай цэркваў. За мяшок жыта, які сабралі вернікі, жыхар Бачэйкава аддаў інтыміс — ручнік з вывай Ісуса Хрыста, які ён выратаваў пры пажары Бачэйкаўскай царквы. Прывезлі званы, якія і сёння звоняць у Праабражэнскай царкве. Жыхары вёскі Белая Царква сцвярджаюць, што гэта званы з Троіцкай (Белай) царквы. Так яно ці не, але звон у іх вельмі мілагучны.

У 1942 г. узнавілася служба ў Праабражэнскай царкве. Сюды збіраліся людзі з усяго раёна. Дзякуй Богу, царква працуе і цяпер. У 1975 г. святар Каляда прывёз у царкву з Заходняй Беларусі старажытны іканастас. Ён уяўляе сабой мастацкую разьбу па дрэве надзвычай

складанага прыгожага карункавага ўзору. Пасля рэстаўрацыі і ўстаноўкі іканастаса царква папрыгажэла. Не толькі старыя, але і моладзь наведваюць храм. Гэта ўсяляе надзею, што да нашых людзей вернуцца вера, сумленнасць, чэснасць, паважлівасць і чалавечнасць.

*Н. Кіндзяева*

## Яны прайшлі лагернае пекла

Вясной 1944 г., калі жыхары раёна чакалі хуткага вызвалення, у многія сем'і прыйшло вялізнае гора. 1640 жыхароў раёна, у большасці маладыя хлопцы і дзяўчаты, непаўналетнія, былі адпраўлены ў Германію. Дадому вярнулася толькі 1157 чалавек. Многія загінулі па дарозе ў Германію, ад цяжкай працы, хвароб, дрэннага харчавання, здзекаў. Аб жудасных падзеях таго часу засталіся ўспаміны вязняў канцлагераў Міхаіла Рыгоравіча Капусты з Чашнікаў, Пятра Рыгоравіча Шушкевіча з в. Болюта, Ніны Ісакаўны Радашковіч з в. Чарэя і інш.

Найбольшую колькасць моладзі адправілі з Антапольеўскага сельсавета — 257 чалавек, з Чарэйскага сельсавета — 221 чалавек. З в. Чарэя ў фашысцкае рабства трапіла 97 чалавек, з в. Гара — 95, з в. Болюта — 87 чалавек. Па 20 і больш чалавек трапіла ў Нямеччыну з вёсак Падмошша, Рыжанкі, Тоўпіна Антапольеўскага сельсавета. З невялічкай в. Крыўкі Красналуцкага сельсавета, дзе да вайны жыло 136 чалавек, немцы пагналі ў Германію 30 чалавек.

Вязняў прымушалі працаваць да знясілення, па-зверску катавалі, наўмысна заражалі інфекцыйнымі хваробамі, праводзілі на людзях забароненыя міжнароднымі законамі медыцынскія доследы. Каб паскорыць «натуральнае выміранне», вязняў трымалі пад адкрытым небам, марылі голадам.


Л. І. Шушкевіч


У. Я. Кароль


А. А. Александровіч


В. П. Садоўская


В. А. Александровіч (Казлоўская)


У. В. Улаховіч

## З успамінаў вязняў канцлагераў

### З успамінаў былога вязня № 326 Пятра Рыгоравіча Шушкевіча


П. Р. Шушкевіч

Май 1944 года жыхары нашай вёскі Болюта сустракалі з надзеяй на хуткае вызваленне. Ужо была чутна кананада баёў. Але 8 мая ад фашысцкіх бомб многія дамы ў вёсцы згарэлі. Людзі засталіся без даху над галавой. Ніхто і падумаць не мог аб далейшых жудасных выпрабаваннях. 12 мая немцы знянацку ўварваліся ў вёску, раздзялілі ўсіх жыхароў на дзве вялікія групы і, паставіўшы кулямёты, рыхтаваліся, як усе думалі, да расстрэлу. Ды тут прыехаў нейкі вялікі начальнік. Параіўшыся аб нечым, ён загадаў старых і малых адпусціць, а маладзейшых прыгнаць у Чарэю.

Мне тады ішоў шаснаццаты год. Я разам з аднавяскоўцамі брыў у Чарэю. Нас заперлі на ноч у хлеў. Людзей назбіралі столькі, што ні сесці, ні тым болей легчы было немагчыма. Давялося ўсю ноч стаяць. Раніцай пагналі ў Багушэўск. Там палонных пагрузілі ў эшалон і павезлі ў Мінск. Па дарозе зрабілі праверку, выгнаўшы на паўстанку з вагона, а потым з крыкамі «шнэль» і «падбадзёрваючы» дубінкамі, загналі людзей у вагоны.

На нейкім прыпынку нас выгрузілі і пагналі калонамі на захад. Гналі галодных некалькі дзён. Спачатку мы яшчэ неяк трымаліся, а потым многія сталі падаць ад знясілення. Іх забівалі. Пасля ночы, праведзенай пад адкрытым небам, многія не маглі падняцца — іх таксама расстрэльвалі.

Успамінаецца выпадак. Наш вясковец Сцяпан Еўдакімавіч Шурко намерыўся ўцячы, калі нас гналі жытнёвым полем. Ён кінуўся ў збажыну, а за ім — паліцай. На жаль, жыта скончылася, і на адкрытым месцы ўцекача паранілі ў плячо. Яго вярнулі ў калону.

Прыгнаўшы нас у Літву, без усялякага перадыху прымусілі капаць акопы. Нават цяжка ўявіць сабе, як нам прыходзілася галодным і знясіленым выконваць такую цяжкую работу. Кармілі варывам з крапівы і нейкім падабенствам хлеба. Тых, хто не мог капаць, білі палкамі, а потым расстрэльвалі. З вялікай колькасці маіх вяскоўцаў засталіся толькі чатыры чалавекі — Лявон Міхайлавіч Шушкевіч, Васіль Аляксандравіч Шушкевіч, Лаўрэн Булавіцкі і я.

Потым нас пагналі ва Усходнюю Прусію. Ад голаду людзі звярэлі. У адным гарадку, убачыўшы жанчыну, якая несла вялікі кошык з булачкамі, палонныя адразу расхапалі іх.

У Германіі, на другім беразе Эльбы, я стаў вязнем канцлагера пад нумарам 326. Адсюль трапіў на работу да бауэра, які жыў за 10 кіламетраў ад горада Біліфельд. У свае шаснаццаць гадоў я важыў усяго 32 кілаграмы.

Калі стаў набліжацца фронт, нас перагналі ў нейкую нізіну, якую, адкрыўшы шлюзы, збіраліся затапіць разам з вязнямі. Але мне і двум таварышам удалося ўцячы. Адзін з іх, Іван Іванавіч Літвінаў, быў з Талачынскага раёна, другі — Адам Антонавіч Барысневіч — з Лагойскага. Мы доўга блукалі па лесе. Дзякуй Богу, немцам было не да нас. Яны ратаваліся самі, хто як мог. У хуткім часе нас вызвалілі.

## Мне тады ішоў шаснаццаты

### З успамінаў былога асвенцімскага вязня Міхаіла Рыгоравіча Капусты

У маі 1944 года за сувязь з партызанамі (брат Мікалай быў у партызанскай брыгадзе «Дубава») маіх бацькоў і мяне з трынаццацігадовай сястрой забралі немцы і адправілі з Копцевіч у Лепельскую турму. Пасля допытаў сястру адпусцілі і яна, вярнуўшыся дамоў, гадавала трох застаўшыхся малодшых дзяцей. Нас жа адправілі ў Германію.

Мяне разам з іншымі арыштаванымі павезлі спачатку ў Мінск, адтуль — у лагер Асвенцім. Везлі ў перапоўненых вагонах — па 100 чалавек у кожным. У дарозе я захварэў тыфам, таму адразу трапіў у тыфозны барак. Калі ачуняў ад хваробы, мяне змясцілі ў 16-ы барак лагера Асвенціма. Нас, малалетак, не пасылалі на працу. Усе з барака раніцай ішлі на разборку зламаных самалётаў. А я заставаўся ў лагеры. Начальнік барака быў немец. Часамі ён загадваў пачысціць яму абутак. Тады сярод вязняў мелася шмат немцаў. Каб адрозніць вязняў, рускім на адзенне прышылі чырвоныя трохкутнікі, а немцам — зялёныя. Яшчэ насілі чорныя трохкутнікі, якія, як мне растлумачылі, прызначаліся злодзеям і бандытам.

Аднойчы нам стала вядома, што трое рускіх уцяклі ў час працы. Каля месяца пра іх нічога не было чуваць. Але ўсё ж іх злавілі, і немцы вырашылі павесіць іх перад усімі вязнямі на плацы для застрашэння. Нечакана для лагернага начальства гэта сцэна з павешаннем выклікала ў сведкаў гонар за мужнасць і гераізм нашых воінаў.

Аб набліжэнні фронту вязні з радасцю ўпотай гаварылі адзін аднаму. Пасля вызвалення я прыбыў у сваю вёску. Гэта было 18 мая 1945 года.

Лёс засцярог ад смерці ў канцлагеры Маўтгаўзен бацьку, а маці вярнулася з Польшчы толькі ў верасні 1945 года.



М. Р. Капуста

## Мне патрэбен толькі спакой

### З успамінаў былога вязня канцлагера Ніны Ісакаўны Радашкевіч з в. Чарэя

Нас, моладзь Чарэі, немцы забралі ў маі 1944 года. Прыгнаўшы ў Багушэўск, пагрузілі ў цялятнікі і павезлі ў Германію.

Вялікую знявагу перажылі мы ў Берліне, калі нас, абстрыжаных, гналі па вуліцах горада, а нямецкія дзеці беглі побач і крычалі: «Русіш швайн».

Спачатку палонныя працавалі 10 дзён на палетках бауэра ў Дахау, а потым іх пагрузілі ў вагоны і павезлі далей, у Альпійскія горы.

У горадзе Траништэйн нас пачалі прадаваць. У бауэра, да якога я трапіла, трэба было даіць 15 кароў і касіць. Кароў я даіла, а вось касіць не ўмела. За гэта гаспадар так мяне адлупцаваў, што я страціла прытомнасць. Калі ўся акрываўленая ачуняла, дома нікога не было. Праз вакно ўбачыла, што гаспадары і яшчэ двое рабочых косяць. Я вырашыла ўцячы. Пяць сутак я праблукала ў лесе, хаваючыся ад людзей. У хуткім часе мяне затрымалі, пачалі допыт, а потым пад нумарам 72892 адправілі ў канцлагер.

Давялося мне зведаць гора ў трох канцлагерах — Равенсбрук, Дортмунд, Бергін-Бельзін. Там, у Бергін-Бельзіне, нас вызвалілі амерыканцы.



Н. І. Радашкевіч

Цяжка ўспамінаць той час. Раніцай у любое надвор'е нас выганялі на апель (пляц каля баракаў) і трымалі па дзве — тры гадзіны. Вельмі невыносна было зімой, асабліва калі хто ўцякаў. Тады на холадзе, паўапранутых, трымалі асабліва доўга на апелі. Адлічвалі па некалькі чалавек (50 ці 100 — не ведаю), апошняму ў гэтым ліку загадвалі выходзіць наперад. Так набіралі смяротнікаў, якіх на нашых вачах расстрэльвалі. Памятаю, як аднойчы такі смяротнік стаяў побач са мной. А магла ж быць і я.

Лагер Бергін-Бельзін быў лагерам смяротнікаў. Агароджаны высокай мураванай сцяной і калючым дротам, па якім праходзіў электрычны ток, ён не даваў ніякай надзеі на ратунак.

Памятаю жудасны час у маім лагерным жыцці, калі нас павялі ў крэматорый. Мы разумелі, што гэта апошні шлях у жыцці. Але, мабыць, Богу трэба было, каб я засталася жывой. Нам загадалі зняць адзенне, прагналі праз пакой, дзе загадалі памачыць ногі нейкай непрыемнай вадкасцю. Пакой быў біткам набіты голымі людзьмі. Я ледзь трымалася на нагах, калі раптам адчыніліся дзверы і камендант спытаўся, ці ёсць тут рускія. Мы закрычалі, што тут ўсе рускія. Тады ўсім загадалі выйсці з пакоя.

Пасля таго, як мы памыліся і апрануліся, нас павялі ў барак. Упершыню ён здаўся такім прывабным і жаданым. Як потым даведаліся, крэматорый тэрмінова спатрэбіўся для таго, каб спаліць мадзьярскіх (венгерскіх) яўрэяў, якіх нечакана даставілі ў канцлагер. Цаною іх жыццяў мы выпадкова засталіся жывымі.

У гэтым жа лагеры ў нас, знясіленых, замучаных вязняў, бралі кроў. Многія ад гэтага паміралі.

Набліжаўся фронт. Здалёк чулася кананада, пачасціліся налёты на наш лагер. Аднойчы бомба трапіла ў крэматорый і разбіла яго. Тады мёртвых вязняў пачалі складваць як бярвенні ў штабелі. Красавік быў цёплы і ад мерцвякоў ішоў страшэнны смурод. Нельга без жудасці ўспамінаць пра гэта.

Настала 26 красавіка 1945 года. У гэты дзень, я памятаю, было свята — Вялікдзень. Раніцай нас чамусьці не выгналі на апель. Мы ўбачылі на бараках белыя палотнішчы з чырвонымі крыжамі. А ў 11 гадзін раніцы з'явіліся амерыканцы на танках. Усе мы — знясіленыя, хто на нагах, хто паўзком, выйшлі насустрач і крычалі «ўра», плакалі, абдымалі адзін аднаго.

Але нам загадалі ісці ў свае баракі. Сказалі, што хутка прыйдзе амерыканская кухня і нас накорміць, а таксама папярэдзілі, што з лагернай кухні нельга нічога браць, бо прыгатаваная там ежа атручана.

Вялікім святам для ўсіх стаў абед. На двух чалавек выдалі па буханцы хлеба і наварыстага супу. Толькі не кожны страўнік, што прывык да лагернай баланды, змог вытрымаць. Некаторыя вязні памерлі.

Я ўсё перанесла і, слава Богу, жывая вярнулася дамоў. Калі б мне ў той час сказалі, што я вярнуся дамоў, буду мець сваю сям'ю, выхаваю чацвёра дзяцей, дачакаюся шасцярых унукаў, я б не паверыла.

## Спаленыя вёскі

За перыяд акупацыйнага рэжыму шмат вёсак раёна падверглася знішчэнню. Некаторыя з іх былі спалены разам з жыхарамі.



Мемарыяльны знак на месцы в. Вішанькі

4 вёскі занесены ў спісы мемарыяльнага комплексу «Хатынь». Гэта вёскі Стайчаўка, Вішанькі, Красналукі, Лукомль.

Асабліва трагічным быў лёс в. Вішанькі.

9 сакавіка 1944 г. гітлераўскія карнікі спалілі яе разам з жыхарамі. 114 чалавек прынялі тут пакутлівую страшную смерць.

Цяпер на тым месцы стаіць помнік. Смутак назаўсёды застаўся ў вачах жанчыны. З нянавісцю глядзіць стары. Паміж імі дзяўчынка ад жаху прыціснула рукі да грудзей. Такі выгляд мае цэнтральная частка мемарыяла ахвярам фашызму, які адкрыўся 22 чэрвеня 1989 г. у в. Вішанькі. На ўрачыста-жалобную цырымонію сабраліся тысячы людзей. Былі сярод іх і нямногія ўраджэнцы спаленай вёскі.

З кожнага сельсавета была прынесена і захавана ля мемарыяльнага помніка зямля са спаленых вёсак.

Вішанькі — крэўная сястра Хатыні. Яна помнік спаленым вёскам і яе жыхарам у Чашніцкім раёне.

## Успамінаюць жыхары спаленых вёсак

### Улляна Верамееўна Бародзіч, былая жыхарка в. Вішанькі

Заўважыўшы карнікаў, мая маці сэрцам адчула бяду і загадала мне бегчы ў лес. Калі я вярнулася, Вішанькі дагаралі. Але родную хату, крайнюю ў вёсцы, агонь не зачапіў. Усё тут засталося па-ранейшаму, нават чыгунок з бульбай не паспеў астыць. Толькі не было і ніколі ўжо не будзе маці, якая прыгатавала гэты горкі абед і якой я двойчы абавязана жыццём...

**Вера Міхайлаўна Булынёнак. У мінулым вядомая даярка, паважаны чалавек у калгасе «Палац працы» Чашніцкага раёна.**

Тады цудам я вырataвалася ад смерці. У скульптуры спалоханай дзяўчынкі я ўбачыла сябе. Той жудасны дзень запомніўся мне ва ўсіх падрабязнасцях.

Калі пачалі страляць, я выбегла з хаты і кінулася да сваёй цёткі. Седзячы ў яе хаце, бачыла, як фашысты гналі па дарозе малых дзетак, жанчын, старых. Я моцна прыціснула да сябе стрыечных браціка і сястрычку. Да нас уварваліся немцы і загадалі выходзіць на сход. Больш не з'яўляліся. Мы рашылі нікуды не ісці. Калі там, на ўзгорку, дзе стаялі дзве хаты Шумановічаў і Пятуховых (у іх і спалілі людзей), немцы скончылі сваю чорную справу, яны яшчэ раз прайшліся па вёсцы. Зазірнулі і да нас. Адзін з іх прама з ганку пачаў з аўтамата страляць у нас, а потым у цётку, якая стаяла каля сцяны і, ломячы рукі, дзіка крычала: «Паночкі, што ж вы робіце, не чапайце, паночкі». Потым накіравалася да немца, а ён наставіў на яе аўтамат. Мяне параніла ў нагу, засталася жывая толькі таму, што засланілі сваімі цельцамі брацік і сястрычка, якіх я трымала на руках. Потым немцы кінулі мне на ногі салому і запалілі яе, а самі выйшлі на падворак і сталі глядзець, каб ніхто з нас не выбег з хаты. Калі яны адышлі ад хаты трохі далей, я ўстала і, перамагаючы боль, выскачыла з палаючай хаты...

**Аляксандр Абляцоў, былы разведчык брыгады «Дубава»**

За многа вёрст я ўбачыў клубы дыму над Вішанькамі. Разам са сваім сябрам, забыўшыся пра небяспеку і парушыўшы загад, кінуўся ў родную вёску, дзе толькі напярэдадні наведаў жонку і дваіх маленькіх сыноў. Знайшоў там толькі вуголле і попел...

У хаце, дзе я нарадзіўся, загінулі разам з аднавяскоўцамі мае бацькі і сястра. Ніколі мне не забыць гора і боль тых часоў.

**М. Катульскі, ветэран вайны і працы, жыхар в. Асташова Альшанскага сельсавета**

Ранняй вясной сорак чацвёртага года жыхары маёй роднай вёскі Асташова жылі ў чаканні хуткага вызвалення ад фашысцкай навалы. Ведалі, што Чырвоная Армія гоніць немцаў з нашай зямлі. Аб гэтым расказвалі лістоўкі, якія распаўсюджвалі партызаны ў Асташове і навакольных вёсках.

Пра сувязь асташоўцаў з партызанамі даведаліся немцы. Раніцай 22 красавіка азвярэлай зграяй уварваліся яны ў Асташова, патрабавалі паказаць, дзе хаваюцца народныя мсціўцы, хто трымае з імі сувязь. Ды толькі маўчалі мае землякі, не знайшлося здрадніка. Бачачы нязломнасць асташоўцаў, адчуваючы іх нянавісць да сябе, карнікі запалілі хаты, дзе жылі партызанскія сем'і. Гарачым полымем завіхурыў пажар. На вачах у вяскоўцаў гарэлі іх сядзібы, чорны дым развейваў набыткі людзей, усё тое, што складала іх жыццё. Ды ніводным словам не азваліся іх вусны, толькі прагай помсты гарэлі вочы.

А карнікі ўсё звярэлі. Збітых, замучаных асташоўцаў сагналі ў адну хату і падпалілі. Не пашкадавалі нікога: ні старых, ні жанчын, ні дзяцей. 22 жыцці загінулі ў полымі. У іх ліку і мая маці з трыма маімі сёстрамі. 45 дамоў спалілі карнікі ў Асташове. Засталася толькі адна — у ёй жылі сваякі паліцая. Мы, партызаны, не ведалі ў той дзень аб трагічным лёсе роднай вёскі і яе жыхароў. А таму і не маглі прыйсці ім на дапамогу, абараніць. Не ведалі і мы з бацькам, што няма больш у жывых нікога з нашай сям'і. Заставалася потым адно — помсціць. І дубаўцы — амаль усе асташоўцы былі байцамі 12-га атрада партызанскай брыгады «Дубава» — помсцілі ворагу.

**Іван Мадрыд, былы жыхар пас. Беларусь (Іванскі сельсавет)**

Быў непадалёку ад Іванска пасёлак Беларусь. Тут знаходзіўся цэнтр калгаса «Беларусь» — аднаго з першых калгасаў раёна. Былыя камунары, а потым калгаснікі нашага пасёлка не пакарыліся фашысцкім акупантам. За сувязь з партызанамі брыгады «Дубава» забіты Вятоха і Шумановіч. А ў кастрычніку 1943 года фашысты абстралялі вёску з танка.

**Я. Шапкоўская, былая жыхарка в. Двор Слідцы (Пачаевіцкі сельсавет)**

Вёска наша Двор Слідцы зусім маленькая — усяго 15 хат. І ва ўсіх іх з пачаткам вайны пасяліўся страх. Міма па бойкай дарозе часта ездзілі немцы. Аднойчы яны забралі старых Казлоўскіх за тое, што іх сыны былі ў партызанах. Больш пажылых людзей не бачылі. З таго часу пачалі пусцець хаты адна за адной.

Апошнія жыхары Двара Слідцы пайшлі ў лес. Калі вярнуліся, то на месцы вёсачкі знайшлі папялішча.

**І. Дзямко, былы жыхар в. Стайчаўка (Латыгаліцкі сельсавет)**

Майскі ранак 1943 года быў прыгожы. Асабліва тут, у вёсцы Стайчаўка, якую з усіх бакоў акружаў лес. Бяда падкралася нечакана.

Да каменданта гарнізона, які размяшчаўся ў Замошшы, за 5 кіламетраў ад Стайчаўкі, дайшлі весткі аб тым, што стайчаўцы трымаюць сувязь з партызанамі, пякуць ім хлеб. Прыехалі п'яныя галаварэзы ў нашу Стайчаўку і пачалі хадзіць з хаты ў хату. Ніхто з жыхароў нават і не здагадваўся аб тым, што ў дамах, дзе пабывалі паліцаі, жывым не застанецца ніхто.

Такі ж лёс напаткаў і маю сям'ю. Скошаныя варожымі кулямі, паваліліся жонка і сын. Я таксама быў паранены, але ўсё ж здолеў выпаўзці на двор. Гэта мяне і выратавала.

26 жыхароў Стайчаўкі загінулі тады. На месцы 9 дамоў засталіся папялішчы.

**Н. Ярох, былая жыхарка в. Чырвоная Раніца (Пачаевіцкі сельсавет)**

Гарэла зямля пад нагамі нямецка-фашысцкіх акупантаў. Білі партызаны гітлераўцаў у іх гарнізонах, нападалі з засад. Немцы жорстка помсцілі за гэта, зрывалі злосць за сваё бяссілле над мірным насельніцтвам. Вось і ў гэты вераснёўскі ранак, пасля начной атакі партызан, мы ўбачылі, як нашу вёску Чырвоная Раніца пачалі акружаць карнікі. Дабра ад гэтага нельга было чакаць. І старыя, і малыя кінуліся наўцёкі. Беглі, а наўздагон свісталі кулі. Не сталі ратавацца толькі мая маці Домна Сямёнаўна і суседка Марыя Дзмітрыеўна Вільчык. «Мы ўжо старыя, калі і загінем, нястрашна», — гаварылі яны і адмовіліся ўцякаць у лес. Пазней яны расказвалі, як фашысты здзекаваліся з іх: і да сценкі ставілі, і стралялі пад самыя ногі, і збівалі. А потым, мабыць, калі надакучыла, адзін з іх сказаў: «Яны і так хутка здохнуць, адпусцім іх». А самі пачалі падпальваць дамы, і хутка вёска ператварылася ў вялікае вогнішча. Мы бачылі гэта з лесу. Згарэла ўсё.

Так не стала нашай маленькай вёскі з паэтычнай назвай Чырвоная Раніца...

**Н. Паланевіч, былая жыхарка в. Ярынова (Красналуцкі сельсавет)**

Вялікая Айчынная вайна паклікала мужчын і нашай вёскі на абарону Радзімы. Большасць былі на франтах, а хто застаўся на часова акупіраванай ворагам тэрыторыі, узяў у рукі зброю, каб стаць у рады народных мсціўцаў. Састарэлыя і дзеці заставаліся ў хатах Ярынова. Я жыла з бацькам і маці, мужам Анатолем, ён быў інвалідам, і маленькай дачушкай Воляй.

Брат Леанід змагаўся ў партызанскім атрадзе, а брат Павел – на фронце. Чым маглі, дапамагалі партызанам і мы. То харчам, то адзеннем. Зімой 1944 года за сувязь з народнымі мсціўцамі бацька быў закатаваны фашыстамі – разам з іншымі партызанамі яго спалілі жывым.

І сёння перад вачыма жудасныя падзеі таго красавіцкага дня 1944 года. З самай раніцы прыехалі ў вёску фашысты. Пачалі выганяць з дамоў людзей, збіралі за ваколіцай. Нагамі, прыкладамі збівалі тых, хто не мог ісці. Сабралі ўсіх і загадалі чакаць, а самі прыняліся за сваю зверскую справу, пачалі падпальваць хаты. Аблітыя бензінам, яны ўспыхвалі, як свечкі. А нашы сэрцы смылелі ад болю, горычы. Фашысты хацелі расстраляць людзей. Але раптам пачуліся крыкі: «Партызаны едуць! Партызаны!» Толькі гэта выратавала нас, фашысты ледзь паспелі ўцячы.

## ПАДПОЛЛЕ

Падпольныя групы ў раёне пачалі арганізоўвацца летам 1941 г. з чырвонаармейцаў, якія апынуліся ў акружэнні, кіраўнікоў раёна, камуністаў і камсамольцаў. Падпольныя групы вялі арганізацыйную і палітыка-выхаваўчую работу сярод насельніцтва, умацоўвалі веру людзей у перамогу над ворагам, узнімалі іх на падпольную барацьбу супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў, стваралі партызанскія фарміраванні, распаўсюджвалі праўдзівую інфармацыю.

Дакументы Чашніцкага падпольнага райкома партыі і камсамола, успаміны Ганны Фёдараўны Баркевіч – настаўніцы Чашніцкай СШ № 2, Валянціны Маркаўны Буяльскай (дзявочае прозвішча Васюта) – завуча Чашніцкай СШ № 3, Аляксандра Кірылавіча Непляховіча і Ксеніі Рыгораўны Сціпук – дырэктара і настаўніцы Чашніцкай СШ № 2, Міхаіла Сідаравіча Марціновіча – дырэктара Чашніцкай СШ



І. Б. Пазнякоў, першы сакратар Чашніцкага райкома партыі, арганізатар камуністычнага падполля ў Віцебскай вобл.

№ 1 даюць падставу зрабіць вывад аб тым, што ў раёне існавала не адна падпольная арганізацыя, мелася немалая колькасць патрыятычна настроеных людзей, якія дапамагалі партызанам у зборы інфармацыі аб ворагу. Часцяком падпольныя групы дзейнічалі самастойна. Гэта пацвярджае і дакладная Чашніцкага падпольнага райкома камсамола Віцебскаму абкому камсамола: «В местечке Чашники имеется 3 подпольные организации. Секретари: Варгалионок Алексей, Козлова Екатерина и Шумович Соня. Секретарь Чашникского РК ЛКСМБ Заховаева».

### Падпольная група «Цэнтр»

У ліпені 1941 г. у раёне створана падпольная група Сяргея Емяльянавіча Папкова, былога загадчыка Чашніцкага рана. У групу ўвайшлі Павел Даніlavіч Лазарэвіч, Рыгор Ермалаевіч Корбан, Андрэй Ігнатавіч Засько, Фёдар Ульянавіч Смаляк, Ісак Іванавіч Удалы, Іван Усцінавіч Нікіцін, Іван Сяргеевіч Саламонаў, Васіль Яўстафавіч Вашчанка. Але пазней І. С. Саламонаў і І. У. Нікіцін, якія жылі ў Чашніках, страцілі сувязь з падполлем і былі выключаны з яго складу. На службу акупацыйным уладам перайшоў В. Я. Вашчанка – пачаў працаваць бургамістрам Дварэцкай воласці.

Арганізацыйна падпольная група аформлена 17 жніўня 1941 г. У яе склад увайшло 12 чалавек.

Былі акрэслены асноўныя задачы групы: дыверсійная работа на чыгунцы, шашэйных дарогах, знішчэнне тэлефоннай і тэлеграфнай сувязі, баз з боепрыпасамі, гаручым і харчовымі прадуктамі, арганізацыя партызанскага руху ў раёне.

На першым пасяджэнні групы «Цэнтр» зацвердзілі сетку канспіратыўных кватэр, сувязных, явачныя месцы, паролі і інш.

Канспіратыўныя кватэры былі ў хатах Марыі Захараўны Шлык і Праскоўі Фядотаўны Шлык, у в. Грыбіна ў хаце Данілы Максімавіча Лазарэвіча, у в. Ухлё ў хатах Е. Я. Дуброўскай, Васіля Паўлавіча Шлыка і Ефрасінні Паўлаўны Шлык, у пасёлку торфапрадпрыемства «1 Мая» ў хаце Пятра Іванавіча Шкалёнка, у в. Жэрына ў хаце Р. Е. Корбана. Зацвердзілі явачныя месцы: у в. Жэрына (на могільніку), урочышчы Ліпаўцы (каля крывой сасны), на Дубовым востраве каля в. Грыбіна. Тут жа прынялі і пароль: «Шукаю цёлку» — «Яе з'елі ваўкі».

Група ўстанавіла сувязь з камуністамі папяровай фабрыкі «Чырвоная зорка» і з дырэктарам Станкевічам. У склад фабрычнай падпольнай групы ўвайшлі Таццяна Баркевіч — да вайны працавала загадчыцай раённага аддзела аховы здароўя, Логінаў — загадчык медпункта і інш. Усяго 7 чалавек (прозвішчы ўсіх не ўстаноўлены). Падпольшчыкі фабрыкі дэманціравалі папераробчыя машыны.



Д. М. Лазарэвіч



П. І. Шкалёнак



С. Е. Папкоў

Дзейнасць падпольнай групы «Цэнтр» можна прасачыць праз дзейнасць яе членаў.

**Папкоў Сяргей Емяльянавіч,** да вайны працаваў загадчыкам Чашніцкага рана. 8 ліпеня 1941 г. накіраваны з Лёзна для арганізацыі падпольнай работы ў Чашніцкім раёне. Стварыў партыйна-падпольную групу «Цэнтр» і кіраваў яе работай з ліпеня 1941 г. па красавік 1942 г. Вясной 1942 г. немцы арыштавалі С. Е. Папкова і пасля катаванняў расстралялі.

**Гаваркоўскі Уладзімір Трафімавіч,** да вайны працаваў пракурорам Чашніцкага раёна. Быў пакінуты ЦК КП(б)Б для падпольнай работы. З ліпеня па снежань 1941 г. у складзе партыйна-падпольнай групы «Цэнтр» прымаў актыўны ўдзел у арганізацыі партызанскага руху і збору зброі. Па даручэнню «Цэнтра» разам з П. Д. Лазарэвічам наладзіў сувязь з групай чырвонаармейцаў, якія жылі ў вёсках Грыбіна і Рыбакоўшчына, праводзіў работу па стварэнню партызанскага атрада Васіля Апанасавіча Захарчанкі. Гаваркоўскі працаваў сярод насельніцтва, заклікаў не ўдзельнічаць у мерапрыемствах нямецкіх улад, распаўсюджваў зводкі Саўінфармбюро. У пачатку студзеня 1942 г. з-за хваробы страціў сувязь з падпольнай групай, якая ў гэты час пайшла ў невядомым накірунку, хаваючыся ад карнікаў. Потым Гаваркоўскі выяваў

у партызанскім атрадзе ў Мінскім раёне.

**Кіркіж Даніла Аляксеевіч,** да вайны працаваў старшынёй Альшанскага сельсавета. Устанавіў сувязь з камуністамі Дварэцкага сельсавета. Разам з членам групы М. П. Корбанам узначальваў аперацыю па вываду са строю абсталявання папяровай фабрыкі «Чырвоная зорка» і спіртзавода. Арыштаваны немцамі ў канцы сакавіка 1942 г. па падазрэнню ў дыверсіі на фабрыцы. Расстраляны пасля катаванняў і здзекаў у Чашніках.

**Корбан Мікалай Платонавіч,** працаваў да вайны дырэктарам Вішкавіцкай сямігадовай школы. У складзе групы прымаў удзел у распаўсюджванні лістовак, зводак Саўінфармбюро, заклікаў насельніцтва не выконваць распараджэнні нямецкіх улад. Устанавіў сувязь з падпольшчыкамі папяровай фабрыкі «Чырвоная зорка». Праводзіў падпольную работу сярод насельніцтва ў вёсках Альшанка, Шаўкоўшчына, Луцік, Вішкавічы. Схоплены фашыстамі ў сувязі з дыверсіяй на папяровай фабрыцы вясной 1942 г. і расстраляны.

**Корбан Рыгор Ермалаевіч,** да вайны быў калгаснікам, жыў у в. Жэрына. 8 ліпеня 1941 г. ЦК КП(б)Б накіраваў яго з Лёзна ў тыл ворага ў групу С. Я. Папкова. Выконваў даручэнне па арганізацыі сувязі з камуністамі Вяжоўскага і Іванскага сельсаветаў, удзельнічаў у зборы зброі, знішчэнні тэлеграфнай сувязі, праводзіў дыверсіі на чыгунцы. Распаўсюджваў зводкі Саўінфармбюро. Схоплены фашыстамі ў сакавіку 1942 г., мужна перанёс жорсткія катаванні. Расстраляны ў сакавіку 1942 г.

**Лазарэвіч Павел Данілавіч,** нарадзіўся ў в. Грыбіна, працаваў судавыканаўцам нарсуда Чашніцкага раёна. 8 ліпеня 1941 г. быў накіраваны ЦК КП(б)Б з Лёзна ў групу С. Е. Папкова. У складзе групы выконваў заданні па збору зброі і арганізацыі партызанскага атрада. Удзельнічаў у знішчэнні тэлефоннай сувязі і дыверсіях на чыгунцы Орша — Лепель. Схоплены фашыстамі ў канцы лістапада 1941 г. і закатаваны каля в. Жэрына.

**Марціновіч Міхаіл Сідаравіч** — адзін з арганізатараў партызанскага руху ў раёне. Да вайны працаваў настаўнікам у Чашніцкім раёне. У жніўні 1941 г. разам з Сухушыным арганізаваў партызанскі атрад, прымаў удзел у разгроме нямецкіх гарнізонаў, засадах і дыверсіях. У верасні 1941 г. наладзіў сувязь з Сенненскім партызанскім атрадам, праводзіў работу сярод насельніцтва вёсак Жэрына, Гурына, Луг, Барадаўкі, Ухлё, заклікаў насельніцтва хаваць ад нямецкіх улад харчы, жывёлу, ісці ў партызанскія атрады. Ад сувязных Сцяпанавай, Сцяпук атрымліваў звесткі аб масавых арыштах камуністаў раёна. У красавіку 1942 г. пайшоў у партызанскі атрад Лявонава, дзе быў камісарам атрада, сувязным Віцебскага падпольнага абкома партыі. Бацька, маці і сястра М. С. Марціновіча прымалі ўдзел у дзейнасці падпольнай арганізацыі. У 1942 г. бацька М. С. Марціновіча С. А. Марціновіч расстраляны немцамі за сувязь з партызанамі.

У пачатку 1942 г. немцы амаль цалкам знішчылі кіруючае ядро групы «Цэнтр». Загінулі С. Е. Папкоў, Д. А. Кіркіж, Р. Е. Корбан, М. П. Корбан, І. І. Удалы, Я. І. Калістаў, Ф. У. Смаляк, В. П. Шлык, Н. Р. Эйсманд, А. Ф. Мар-



У. Т. Гаваркоўскі (злева) і М. С. Марціновіч

кава, С. А. Марціновіч. Дзейнасць падпольнай групы «Цэнтр» спынілася. Члены групы, якія не трапілі ў рукі немцаў, уліліся ў партызанскія атрады. Так, атрад В. А. Захарчанкі арганізаваны з удзельнікаў падпольнай групы і ваеннаслужачых. У пачатку ліпеня 1942 г. гэты атрад аб'яднаўся з атрадам В. С. Лявонава.

## Падпольная група Дз. Ц. Міцькаўца

У раёне торфапрадпрыемства «1 Мая» дзейнічала падпольная група старэйшага рабочага торфапрадпрыемства Дзмітрыя Цімафеевіча Міцькаўца, якая была звязана з партызанскай брыгадай імя К. С. Заслонава.

У групу ўваходзілі Дзяніс Цімафеевіч Міцькавец, Іван Дзянісавіч Міцькавец, Андрэй Каваленка і Максім Мацвеевіч Міцькавец. У канцы 1941 г. падпольная група разабрала вузкакалейную чыгунку ад торфапрадпрыемства да Чашніцкай папяровай фабрыкі. Падпольшчыкі адчынілі харчовыя склады аддзела рабочага забеспячэння і раздалі тавары рабочым торфапрадпрыемства і жыхарам бліжэйшых вёсак. У ліпені 1942 г. спалілі і ўзарвалі 2 агрэгаты для вытворчасці торфу. Праз Васіля Мікітавіча Чарнова перадавалі ў брыгаду імя К. С. Заслонава звесткі аб варожых гарнізонах у Чашніках, в. Альшанцы, папяровай фабрыцы «Чырвоная зорка». Асабліва цяжкай і небяспечнай была работа сярод паліцаяў, якая праводзілася з мэтай агітацыі пераходу іх да партызан. У ліпені 1943 г. 32 паліцаі перайшлі ў 1-ю партызанскую брыгаду імя К. С. Заслонава.

Група праводзіла разведвальную і дыверсійную работу, у 1944 г. непасрэдна ўдзельнічала ў ліквідацыі акружаных нямецкіх войск. Актыўны ўдзел у рабоце групы прымалі Дз. Ц. Міцькавец, А. Ц. Караткевіч, Я. Ф. Сафонаў, К. Р. Сянько, А. Ф. Барадаўка,



А. Ц. Караткевіч

П. Ц. Міцькавец, З. Р. Міцькавец, Л. П. Лапатнёва і інш. Члены падпольнай групы Я. Ф. Сафонаў, К. Р. Сянько і іншыя загінулі ў барацьбе з ворагам.

## Чашніцкая падпольная група М. Р. Грышынай

Адразу пасля вайны настаўніца Чашніцкай школы № 2 Наталля Аляксееўна Цыганкова па сваёй ініцыятыве сабрала ўспаміны жыхароў Чашнікаў Валянціны Маркаўны Буяльскай, Паліны Якаўлеўны Рызо, Елізаветы Пятроўны Чэпік аб дзейнасці групы падпольшчыкаў — у асноўным жанчын — пад кіраўніцтвам Марыі Раманаўны Грышынай. Як сведчаць запісы Н. А. Цыганковай, М. Р. Грышына была членам партыі, у пачатку вайны прыбыла ў Чашнікі і пасялілася на кватэры ў завуча Чашніцкай школы Веры Кірылаўны Ваўчанковай (па мужу Турута). Вера Кірылаўна ўладкавалася працаваць у ларку, дзе абменьвала жыхарам Чашнікаў і навакольных вёсак прадукты харчавання і лекавыя травы на соль, запалкі і інш. Потым, калі пачалі дзейнічаць партызанскія брыгады, яна праз сувязных перадавала партызанам звесткі аб дзеяннях немцаў у Чашніках, іх колькасці, узбраенні. Даставала медыкаменты, бінты, нямецкія аусвайсы праз машыністку камендатуры Ксенію Андрыянаўну Вінядоўскую і перадавала партызанам. Сувязь трымала праз настаўніка Гілянскай школы партызана

брыгады «Дубава» Сцяпана Пятровіча Коласа і юнага партызана Ваню — «хлопчыка ў шэрай кепцы».

З-за гібелі асноўнай часткі членаў падполля нельга дакладна ўстанавіць яго падрабязную дзейнасць. Не захавалася звестак і ў архівах. Але аб некаторых дыверсійных актах, здзейсненых падпольшчыкамі разам з партызанамі, вядома было ўсім тагачасным жыхарам Чашнікаў. Аб іх расказалі партызаны.

Першы дыверсійны акт быў праведзены ў Чашніках 1 мая 1942 г. Яго здзейсніў камсамолец, сын галоўнага ўрача Чашніцкай бальніцы П. Я. Церашкова Аляксандр Паўлавіч Церашкоў.

Ноччу, напярэдадні 1 мая 1942 г., ён устанавіў у цэнтры мястэчка непадалёку ад дома бургамістра М. Сарокі чырвоны сцяг.

Значнай падзеяй у Чашніках стала знішчэнне начальніка паліцыі Новікава і яго намесніка Пушнова. Аб гэтым ва ўспамінах паведамляе інструктар Чашніцкага падпольнага райкома камсамола А. К. Непляховіч. З іх бачна, што гэта зрабілі самі немцы. Падставай жа да гэтага з'явіўся ліст, які падпольшчыкі праз дзяўчынку-сувязную Памалейка перадалі Пушнову, дзе было напісана наступнае: «Гражданин Пушнов, переходите пока не поздно вместе с отрядом на сторону партизан. Своего начальника «Н» не опасайтесь. Партизаны». Пушноў паказаў ліст немцам, якія без разбораў павесілі ў Чашніках у скверы начальніка паліцыі Новікава і яго намесніка Пушнова.

Каб пастаянна быць у курсе спраў, ведаць намеры фашыстаў, камандаванне атрадаў накіроўвала асобных партызан «на службу» да немцаў. Падобнай работай займалася і К. А. Вінядоўская. Яна працавала машыністкай чашніцкай камендатуры, мела доступ да сакрэтных дакументаў. Вядома, такі момант не магла не скарыстаць. Немцы высачылі Ксенію, і ў лютым 1944 г. расстралялі. Яе, як успамінаюць тыя, хто сядзеў разам з ёй у турме, катавалі асабліва жорстка. Але яна зрабілася нейкай абыякавай, каменнай, не размаўляла ні з кім, як быццам аглухла і аслепла. Потым яе змясцілі ў асобную камеру. Зусім знявечаную ўбачылі Ксенію Андрыянаўну Вінядоўскую перад расстрэлам.

Як успамінае З. К. Кунцэвіч (дзявочае прозвішча Капусціна), якая таксама была напачатку ў групе Грышынай і з'яўлялася сувязной партызан, а потым стала партызанкай брыгады «Дубава», многа жыццяў выратаваў перакладчык па прозвішчы Шурынаў. Ён як мог дапамагаў людзям. Аб гэтым расказвала і Вера Кірылаўна Ваўчанкова. Яна ведала нямецкую мову і, калі яе па даносу ўпершыню дапытвалі, уважліва сачыла за перакладам Шурынава. Абвінавачваў яе бухгалтар Кашпар у сувязі з партызанамі. Каб дапамагчы Веры Кірылаўне, Шурынаў растлумачыў каменданту, што Кашпар помсціць жанчыне за адхіленае каханне і таму зрабіў такі данос. Камендант адпусціў Веру Кірылаўну. Узрушаная, яна расказала аб гэтым падпольшчыкам.

Вялікую дапамогу аказваў партызанам С. Я. Казлоў, які служыў у паліцыі. Для атрада Лявонава ён здабываў патроны, гранаты, паведамляў аб намерах немцаў і паліцаяў, выведваў паролі.

У канцы 1943 г. пачаўся разгром Чашніцкага падполля. Немцы арыштавалі М. Р. Грышыну, В. К. Ваўчанкову, Г. Ф. Баркевіч, К. А. Вінядоўскую, сувязную-піянерку Тамару Унуковіч і яе маці Г. П. Унуковіч, партызанскага шаўца Марка Васюту і інш.

Усе, хто ведаў кіраўніка падпольнай групы Марыю Раманаўну Грышыну, адзначалі мужнасць, вытрымку, прадбачлівасць гэтай пажылой жанчыны. Асабліва спатрэбіліся гэтыя якасці ў часы турэмнага зняволення. Марыя Раманаўна падтрымлівала сілу волі арыштаваных у хвіліны адчаю, па-мацярынску даглядала за хворымі пасля катаванняў.

9 лютага 1944 г. фашысты пасля жорсткіх здзекаў і катаванняў расстралялі на беразе р. Улы (там, дзе сыходзяцца



В. К. Турута-Ваўчанкова

разам вуліцы Пралетарская і Луначарскага) 23 чалавекі. У іх ліку былі М. Р. Грышына, В. К. Ваўчанкова, К. А. Вінядоўская, Кацярына Шостак, піянерка Тамара Унуковіч. У скверыку павесілі Марка Васюту. Арганізацыя спыніла сваё існаванне за 4,5 месяца да вызвалення раёна.

*Н. Кіндзяева*

**З успамінаў кіраўніка падпольнай групы ў раёне торфапрадпрыемства «1 Мая» Дз. Ц. Міцькаўца**

Вялікая Айчынная вайна застала мяне на пасадзе начальніка ўчастка здабычы торфу торфапрадпрыемства «1 Мая» Чашніцкага раёна. У ліпені 1941 года мяне пакінулі для падпольнай работы ў тыле ворага.

Я арганізаваў групу з 5 чалавек, у якую ўваходзілі Дзяніс Цімафеевіч Міцькавец, Іван Дзянісавіч Міцькавец, Андрэй Каваленка і Максім Мацвеевіч Міцькавец.

У канцы 1941 года група пашкодзіла вузкакалейную чыгунку, якая вяла ад торфапрадпрыемства «1 Мая» да папяровай фабрыкі ў Чашніках, бо немцы планавалі па ёй вывезці абсталяванне і тэхніку торфапрадпрыемства. Пасля гэтага група ўзламала дзверы складоў аддзела рабочага забеспячэння. Прадукты харчавання разабралі рабочыя торфапрадпрыемства і сяляне навакольных вёсак.



Дз. Ц. Міцькавец

У 1942 годзе немцы размясцілі на торфапрадпрыемстве нямецкі гарнізон і ўмацавалі яго. Яны арганізавалі аднаўленчыя работы для вытворчасці паліва, рамантавалі агрэгаты для здабычы торфу. Завод пачаў працаваць.

У ліпені 1942 года падпольная група пад маім кіраўніцтвам спаліла 2 агрэгаты здабычы торфу і 1 агрэгат узарвала.

У пачатку 1943 года мы ўстанавілі сувязь з Васілём Мікітавічам Чарновым, ад якога атрымалі заданне: устанавіць колькасць, узброенасць, размяшчэнне ўмацаванняў у нямецкіх гарнізонах Чашнікаў, Альшанцаў і г. д. Сабраныя звесткі праз В. М. Чарнова перадаваліся ў штаб партызанскай брыгады імя К. С. Заслонава.

У чэрвені 1943 года нам стала вядома, што ў в. Жэрына размяшчаецца 1-ы партызанскі атрад брыгады імя К. С. Заслонава. Ад яго камандавання мы атрымалі даручэнне распрапагандаваць салдат аховы варожага гарнізона і схіліць іх да пераходу на бок партызан. Пачалася цяжкая і карпатлівая работа па разлажэнню гарнізона. Кіраўніцтва атрада гарантавала жыццё тым, хто пяройдзе, пры ўмове актыўна ўдзельнічаць у барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. У ліпені 1943 года 32 паліцэйскія перайшлі да партызан. Адразу прынялі рашэнне неадкладна атакаваць і разграміць астаткі гарнізона. Але фашысты, даведаўшыся аб наступленні партызан, уцяклі ў Чашнікі.

Атрад знішчыў усё абсталяванне торфапрадпрыемства. Гарнізон быў ліквідаваны. Многія жыхары пасёлка пайшлі ў партызанскі атрад.

Па заданню намесніка камандзіра партызанскага атрада К. В. Грышчанкова група вяла разведку ў гарнізонах Чашнікаў, пасёлка папяровай фабрыкі, а таксама Бачэйкава і Бешанковічаў.

У пачатку 1944 года група знішчыла варту каля нямецкага танка, які заграз у балоце побач з Малой Вядрэнню.

Некалькі пазней мы даведаліся, што нямецкія сувязісты пракладваюць лінію Чашнікі – Бешанковічы. Падпольшчыкі разам з партызанамі знішчылі афіцэра сувязі і некалькі фашыстаў, знялі ў многіх месцах кабель і без страт адышлі.

Праз сувязных мне стала вядома, што нямецкі салдат і некалькі паліцаяў жадаюць перайсці да партызан. Са згоды Грышчанкова адбылася сустрэча. У выніку нямецкі салдат Пауль Лен быў дастаўлены ў партызанскі атрад. Ён даў каштоўныя звесткі аб нямецкіх гарнізонах, прымаў актыўны ўдзел у разведцы, баях з фашыстамі аж да злучэння з часцямі Чырвонай Арміі.

Перад вызваленнем раёна ад нямецкіх захопнікаў у падпольную групу ўваходзіла звыш 40 чалавек. З'явіліся больш шырокія магчымасці для правядзення дыверсійных актаў і разведвальнай работы. Групе стала вядома, што ў раёне Бешанковіч фашысты наводзяць пантонны мост праз Заходнюю Дзвіну. Схему мясцовасці, дзе шчыраваў пантонна-маставы атрад, мы перадалі Грышчанкову. У хуткім часе наша авіяцыя дакладным ударам знішчыла пантонны мост.

Падпольная група ў час вызвалення раёна ад захопнікаў разам з партызанскім атрадам «Дзядзя Косця» затрымала і перадала штабу палка, які размяшчаўся ў вёсцы Вялікая Вядрэнь, звыш 300 немцаў, што трапілі ў акружэнне. Падпольшчыкі даставілі ў Чашнікі 6 фурманак з трафейнымі вінтоўкамі, аўтаматамі і гранатамі.

Актыўны ўдзел у дзейнасці групы прымалі Дзяніс Цімафеевіч Міцькавец, Апанас Пятровіч Караткевіч, Ягор Фёдаравіч Сафонаў, Карп Раманавіч Сянько, Антон Барадаўка, Павел Цімафеевіч Міцькавец, Захар Рыгоравіч Міцькавец, Лідзія Пятроўна Лапатнёва і інш.

На ўсё жыццё ўдзельнікі падполля захавалі добры ўспамін аб сваіх загінуўшых таварышах – Я. Ф. Сафонаве, К. Р. Сянько і інш.

*Успаміны захоўваюцца ў фондах Аршанскага музея імя К. С. Заслонава.*

### З успамінаў Ганны Фёдараўны Баркевіч

У першыя дні вайны да мяне прыходзілі школьныя сяброўкі з бліжэйшых да Чашнікаў вёсак. Часам яны прыносілі лістоўкі, скінутыя з самалётаў, зводкі Саўінфармбюро, якія мы распаўсюджвалі ў Чашніках.

Пазней для партызанскіх атрадаў мы збіралі звесткі аб нямецкім гарнізоне, здабывалі медыкаменты і перавязачны матэрыял у бальніцы і ветлячэбніцы. Усё гэта перадавалі праз сувязных.

Работа стала больш акрэсленай і мэтанакіраванай, калі ў хаце маёй сваячкі Ксеніі Рыгораўны Сцяпук пасяліліся «бежанкі» – Марыя Раманаўна Грышына і Ксенія Андрыянаўна Віпядоўская. Ксенія Андрыянаўна ўладкавалася працаваць машыністкай у райуправу, дзе здабывала каштоўныя для партызан звесткі. Марыя Раманаўна Грышына перадавала іх праз сувязных у атрад.

Аднойчы М. Р. Грышына прыслала да мяне К. Р. Сцяпук з даручэннем – паведаміць партызанам аб маючым адбыцца выездзе карацеляў. У вёсцы Дварэц я ўпершыню сустрэлася з Вячаславам Васільевічам Старынскім – супрацоўнікам штаба Чашніцкай партызанскай брыгады «Дубава», якому і расказала пра намер фашыстаў. Партызаны падрыхтавалі карацелям «сустрэчу».

Праз які час ад Старынскага да мяне прыйшла Ніна Антонаўна Вашчанка. У шпіталі адчуваўся востры недахоп хірургічных інструментаў. Іх пералік запісаў на паперцы К. П. Чэпік — начальнік медыцынскай службы брыгады «Дубава».

Я звярнулася за дапамогай да знаёмай медсястры Клаўдзіі Паўлаўны Фраловай. Яна падрыхтавала інструменты, але вынесці іх не змагла, бо знаходзілася, як жонка супрацоўніка НКУС, пад наглядам гестапа. Як толькі я паклала скрутак у сумку, у кабінет медсястры ўвайшоў нямецкі салдат. Клава яму растлумачыла, што я зайшла праведаць хворага, але яго ўжо выпісалі з бальніцы. Усю дарогу дадому мне здавалася, што салдат ідзе следам, нават страшна было азірнуцца.

Праз некалькі дзён па інструменты прыйшла Ніна Вашчанка. Мы паклалі іх у кошык, а зверху прыкрылі мяшочкам з соллю. Я ўзяла граблі і пайшла правесці Ніну гародамі за Чашнікі, тым больш што ў гэтым напрамку быў наш участак сенакосу. Гадзіны праз дзве я вярнулася дадому.

Ніна пазней расказвала аб сваім далейшым шляху да партызан. Як толькі яна наблізілася да вёскі Проземля, насустрач ёй паказалася група фашыстаў. Дзяўчына спалохалася. Мільганула думка схаваць скрутак з інструментамі ў невялікім стажку сена каля дарогі. Але фашысты набліжаліся і ўважліва пазіралі ў яе бок. Калі яны падышлі бліжэй, то адзін з іх, зазірнуўшы ў кошык, спытаўся: «Матка, яйка?» «Ды не, паночак, солі вось набыла». Ад страху яна ледзь не заплакала. Немцы пайшлі сваёй дарогай, а дзяўчына, здранцвелая ад страху, рушыла далей.

Потым партызанам спатрэбілася мазь ад каросты. Я звярнулася да сваёй школьнай сяброўкі Вольгі Адамаўны Палітыка. Яе бацька Адам Ільіч працаваў у ветлячэбніцы. Некалькі разоў ён рыхтаваў мазь, перадаваў таксама ёд, рэваноль, перавязачны матэрыял. Часцей за ўсё іх забіраў сувязны, дарожны рабочы з вёскі Тараскі Ягор Ціханавіч Атрашкевіч. На фурманцы ў сене ён перавозіў гэтыя медыкаменты ў партызанскую брыгаду «Дубава». Праз Ніну Антонаўну Вашчанка і Ягора Ціханавіча Атрашкевіча мы перадалі партызанам звесткі аб зерневых складах у мястэчку і месцы знаходжання запасаў узбраення ў нямецкім гарнізоне ў Чашніках.

З маёй дапамогай удалося пераправіць у партызанскі атрад сына начальніка медслужбы К. П. Чэпіка. Алік і яго цётка Елізавета Пятроўна (сястра К. П. Чэпіка), якім пагражала фашысцкая кара, былі выратаваны і пераpraўлены самалётам за лінію фронту.

22 лістапада 1943 года мяне і Ганну Вікенцьеўну Цімошчанка арыштавалі. Пасля допыту Ганну адпусцілі дадому. Мяне дапытваў следчы Марозаў. Але дакладных абвінавачванняў супраць мяне не мелася, бо пра падпольную маю работу ніхто не ведаў. І ўсё ж мяне адправілі ў турму, дзе ўжо знаходзіліся М. Р. Грышына, Г. П. Унуковіч і яе дачка Тамара. У камеры ўсе сядзелі і спалі на падлозе. Толькі каля вакна была прыбіта жалезная рашотка, якая служыла і лавачкай і сталом. Я здзіўлялася мужнасці і вытрымцы М. Р. Грышынай. Кволая на выгляд, яна не толькі з годнасцю трымалася сама, але і падбадзёрвала іншых зняволеных. Аднойчы ноччу яна падышла да мяне. Спыталася, за што мяне арыштавалі. Сама ж паведаміла, што яе абвінавачваюць у тым, што з'яўляецца камуністам. Яна сказала мне, што ў камеры ёсць правакатар, таму трэба быць асцярожнай. Марыя Рыгораўна параіла мне ні ў чым не прызнавацца, сказала, што мяне павінны хутка выпусціць.

Аднак у турме я захварэла тыфам. Мяне змясцілі ў турэмную бальніцу, дзе разам ляжалі мужчыны і жанчыны, у адной палаце. Каля ўваходу стаяў вартавы з аўтаматам. Побач са мной ляжала Вера Кірылаўна Турута, якую з бальніцы забралі раней за мяне. Калі мяне вярнулі зноў у турму, там былі

ўжо іншыя людзі. У камеры я сустрэла Валю Васюта – дачку партызанскага шаўца Марка Васюты, а таксама Вольгу Палітыка. Мы шырока раскрытымі вачыма глядзелі адна на адну, але размаўляць не маглі.

Выразна памятаю жахлівую ноч 9 лютага 1944 года. Мы прачнуліся ад гаворкі, стуку падкоў фашысцкіх ботаў. Усе прыслухоўваліся, чакалі. Яшчэ днём забралі з камеры жыхарку Чашнікаў Н. І. Вішнеўскую. Нам стала вядома, што яе разам з Маркам Васютам, Мікалаем Новікавым і Сцяпанам Пушновым павесілі ў скверыку.

Раптам дзверы камеры адчыніліся. Выклікалі Марыю Раманаўну Грышыну, Тамару Унуковіч і Кацярыну Шостак. Іх расстралялі на беразе р. Улы.

На досвітку ў камеру ўвайшлі паліцаі. Яны абвясцілі, што нас адпраўляюць у лагер зняволеных.



Тамара Унуковіч (справа)

## Юная патрыётка

Бязмерна цяжкім было гора Ганны Піліпаўны Унуковіч – яна страціла адзіную горача любімую дачку. Седзячы за кратамі гестапа, яна разам з Тамарай рыхтавалася да смерці. Але каб вось так — сама засталася жывой, а дачку расстралялі — гэта невыносна для сэрца маці.

Ведала Ганна Піліпаўна, што не гуляць хадзіла яе Тамара ў Чашнікі з Запружан, куды пераехалі ў час вайны з мястэчка. Трывожна было на сэрцы за дачку, бо рана ці позна гэта дапамога партызанам магла скончыцца трагічна. Дачка не вельмі таілася ад маці, ведала, што тая з ёю згодна ў самым галоўным — нянавісці да ворага. Часам яна раілася з Ганнай Піліпаўнай, як лепш выканаць даручэнне партызан, да каго звярнуцца ў Чашніках за дапамогай. Па заданню партызан брыгады «Дубава» Тамара перадавала ў нямецкі гарнізон зводкі Саўінфармбюро, лістоўкі, праводзіла савецкіх людзей з нямецкага гарнізона ў партызаны, збірала звесткі аб праціўніку, агнявых кропках гарнізона.

Аднойчы Тамару пры выкананні задання арыштавалі. За нямецкія краты трапіла тады адразу некалькі чалавек, у іх ліку і маці Тамары — Ганна Піліпаўна. Доўга дапытвалі, катавалі дзяўчынку. Але яна нікога не выдала. 9 лютага 1944 г. яе разам з 23 патрыётамі Чашнікаў расстралялі на беразе р. Улы. Ёй тады толькі споўнілася 15 гадоў.

Калі Тамару забіралі з камеры на расстрэл, усе ўголас заплакалі. Маці прытуліла дачку да грудзей, потым прышчапіла да яе сукенкі сваю брошку і сказала: «Ідзі, дачушка, хутка і мы за табой».

Дзяўчынка выпрамілася, абвяла вачыма людзей і сказала:

— Не трэба плакаць. Хутка прыйдуць нашы. Ім, катам, будзе кепска. А на нашых магілках пасадзяць кветкі.

*Н. Кіндзяева*

## Ён зрабіў усё, што мог

Пра яго расказваюць многія былыя партызаны Чашніччыны. Сярод іх Піліп Якаўлевіч Садоўскі, які за партызанскую дзейнасць атрымаў ордэн Леніна, іншыя ўрадавыя ўзнагароды. Яму асабіста прыйшлося дзейнічаць разам з гэтым юнаком, імя якога — Алік Церашкоў.


Алік Церашкоў

Алік — сын галоўнага ўрача Чашніцкай бальніцы Паўла Яфімавіча Церашкова. Перад самай вайной скончыў дзесяцігодку. Збіраўся вучыцца далей, але… З прыходам фашыстаў камсамолец Церашкоў стаў народным мсціўцам. Аб ім расказваюць нешта падобнае на легенду.

На групавым фотаздымку выпускнікі, што скончылі Чашніцкую школу перад самай вайной. Звяртае на сябе ўвагу юнак з задумлівым позіркам, светлавалосы, сярэдняга росту. На лацкане пінжака — значок варашылаўскага стралка. Гэта Алік Церашкоў. Такім ён запомніўся ўсім, хто ведаў яго да вайны. І толькі яго сябры па зброі могуць дадаць некалькі новых рыс, якія выявіліся ў характары гэтага знешне спакойнага, сціплага хлопца.

…Ноч выдалася цёмная. Час перад світаннем. Моцна спіць Смалянецкая вуліца. Знік вартавы паліцай, што стаяў ля дома бургамістра Сарокі. Ніхто не бачыў, як у цемры прабіраліся двое… Вось, нарэшце, зніклі іх постаці. Сцішылася ўсё.

Наступіла першамайская раніца 1942 г. Ззяла сонца. І вельмі ярка пералівалася ў яго промнях прымацаванае да слупа палотнішча чырвонага сцяга. Павыходзілі з хат жыхары гарадскога пасёлка. Сцяг пераможна лунаў якраз насупраць вакон бургамістравага дома. Радасна і здзіўлена глядзелі людзі ў той бок. Але вось расчыніліся дзверы і на ганку з'явіўся раз'юшаны гаспадар. Фашысцкі паслугач кінуўся да слупа. Рукі яго пацягнуліся да дрэўка… У наступны ж момант моцны выбух страсянуў наваколле. Вывернуты слуп і каля яго шматкі таго, што засталося ад бургамістра, — вось што ўбачылі людзі…

Такой на ўсё жыццё запомнілася жыхарам Смалянецкай (цяпер Ленінскай) вуліцы тая першамайская раніца. Людзі былі ўдзячны невядомаму герою. А ён, Алік Церашкоў, быў тут жа, у натоўпе, і з усмешкай сачыў за гітлераўцамі. Ён зрабіў тое, што да гэтага не ўдавалася яго таварышам, — знішчыў здрадніка, даўно прысуджанага да смерці.

Гэта толькі адзін эпізод баявой дзейнасці юнака-патрыёта.

Герой не дажыў да перамогі. Ён загінуў пры мініраванні чыгункі. Алік заклаў міну пад рэйку. Было вядома, што цягнік ідзе без суправаджэння. Аднак здарылася інакш. Наперадзе цягніка ішла дрызіна.

І дрызіна не ўзарвалася. Чаму?! А цягнік, цяжка пыхкаючы, няўмольна набліжаўся. Што рабіць?

Рашэнне прыйшло імгненна. Церашкоў кінуўся на чыгуначнае палатно. Ён паспеў своечасова.

*Чырвоны прамень, 10 красавіка 1965 г.*

# ПАРТЫЗАНСКІ РУХ

Партызанскія атрады ў лясах Чашніччыны сталі ўтварацца ў 1942 г. Іх аснову складалі воіны, якія па розных прычынах трапілі ў акружэнне. Потым яны пачалі афармляцца ў партызанскія брыгады, якія мелі тэрытарыяльныя зоны кантролю. Партызанская ваенная барацьба супраць нямецкіх захопнікаў мела вялікае ваеннае і маральна-палітычнае значэнне, наносіла значныя страты войскам ворага, дэзарганізоўвала яго тыл, зрывала мерапрыемствы ваенных улад і адміністрацыі акупантаў, стварала для іх нясцерпныя ўмовы на акупіраванай тэрыторыі, умацоўвала ўпэўненасць прыгнечанага народа ў канчатковай перамозе.

У жніўні 1941 г. у раёне пачаў дзейнічаць партызанскі атрад на чале з Цімафеем Яўсеевічам Ермаковічам.

У верасні 1941 г. у лясах ля Чарэі арганізаваны партызанскі атрад з чырвонаармейцаў, якія трапілі ў акружэнне. Камандзірам атрада стаў лейтэнант Чырвонай Арміі Васіль Шчукін.

Восенню 1941 г. пры садзейнічанні падпольнай групы «Цэнтр» арганізоўваюцца невялікія партызанскія атрады, якія пазней уліліся ў Чашніцкую партызанскую брыгаду «Дубава», Сенненскую партызанскую брыгаду і інш. Так, пры дапамозе члена групы «Цэнтр» М. С. Марціновіча арганізаваны партызанскі атрад пад кіраўніцтвам Сухушына, які пазней увайшоў у склад Сенненскай партызанскай брыгады.

У верасні 1941 г. у Кашчынскіх лясах з Вялікай зямлі прыбыў атрад пад камандаваннем Г. М. Лінькова. Ён дзейнічаў у Кашчынскіх і Красналуцкіх лясах. Дапамогу яму аказвалі жыхары вёсак Забор'е, Пасынкі, Гілі, Сарочына, Маскоўская Гара, Сіманавічы, Гурэц і інш. Вясной 1942 г. у атрад улілося шмат новых байцоў. У маі 1942 г. атрад перамясціўся на тэрыторыю Заходняй Беларусі.

За гады вайны на тэрыторыі раёна дыслацыраваліся Чашніцкая брыгада «Дубава», 1-я Смаленская, 1-я Беларуская і 2-я Беларуская імя П. К. Панамарэнкі (2-га складу), 1-я і 2-я імя К. С. Заслонава, Багушэўская (2-га складу), 1-я Віцебская (2-га складу), «Граза» М. П. Гудкова, імя А. Ф. Данукалава, Лёзненская, Сенненская партызанскія брыгады, партызанскі полк Смаленскі і асобны партызанскі атрад Ц. Я. Ермаковіча.



А. Е. Агарак (справа), інструктар падпольнага райкома партыі

Партызаны паралізавалі дзейнасць чыгункі Орша — Вятны — Чашнікі — Лепель, узрывалі масты і станцыйныя будынкі, знішчалі палатно чыгункі. Праводзілі дыверсіі на дарогах Чашнікі — Копцевічы — Іванск — Дзямідавічы — Бачэйкава, Чашнікі — Прoземля — Залессе — Лепель, Чашнікі — Пачаевічы — Лукомль — Стражавічы — Чарэя, грамілі варожыя гарнізо-

ны ў вёсках і Чашніках, зрывалі нарыхтоўку прадуктаў харчавання, адзення для нямецкай арміі, утваралі партызанскія зоны, ратавалі людзей ад гібелі, угону ў Германію, вялі патрыятычную работу сярод насельніцтва раёна.

Сенненская партызанская брыгада разграміла варожыя гарнізоны ў вёсках Чарэя (снежань 1942 г.) і Лукомль (кастрычнік 1943 г.). Чашніцкая брыгада «Дубава» ў выніку 3-дзённых баёў знішчыла ільназавод і пякарню ў Чашніках (студзень 1943 г.), варожыя гарнізоны на чыг. станцыі Чашнікі (сакавік 1943 г.), у вёсках Цяпіна, Варкі, Залессе (ліпень 1943 г.). У кастрычніку 1943 г. байцы Смаленскага партызанскага палка вялі жорсткія баі супраць гітлераўскага гарнізона ў Чашніках, разграмілі варожы гарнізон у Чарэі.

Чашніцкая брыгада «Дубава» ўтворана 28 жніўня 1942 г. на базе вылучаных з брыгады «Смерць фашызму» 9-га і асобнага 68-га атрадаў. Камандаваў 9-м атрадам Ф. Ф. Дуброўскі, 68-м — У. Е. Лабанок. Камандзірам брыгады стаў Ф. Ф. Дуброўскі, камісарам — У. Е. Лабанок.

Спачатку партызанская база знаходзілася ў 2 км ад в. Антунова ва Ушацкім раёне. Створаны пры брыгадзе артдывізіён і кавалерыйскі эскадрон дазвалялі праводзіць дзеянні не толькі на тэрыторыі Ушацкага, але і Чашніцкага раёнаў. Згодна з распараджэннем БШПД і ўказаннем Віцебскага падпольнага абкома КП(б)Б, 1 чэрвеня 1943 г. брыгада узбуйнілася. Атрады 3, 4, 8, 9, 13-ы і частка асабовага складу артдывізіёна ўключаны ў Лепельскую брыгаду імя І. В. Сталіна. Камандзірам Чашніцкай брыгады «Дубава» быў Ф. Ф. Дуброўскі, а Лепельскай брыгады імя І. В. Сталіна — У. Е. Лабанок. Пазней у Чашніцкай брыгадзе «Дубава» ўтвораны новыя атрады: 2-гі (былы 2-гі атрад перайменаваны ў 3-ці), 4, 5, 8, 9, 11, 13, 14-ы. Кавалерыйскі эскадрон атрымаў назву 16-ы атрад, артдывізіён — 15-ы атрад. У такім складзе партызаны брыгады «Дубава» кантралявалі тэрыторыю Чашніцкага раёна да вызвалення яго ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў 28 чэрвеня 1944 г. Месцам яе дыслакацыі напачатку была Сасlayгоўская пушча ля в. Васькаўшчына, потым в. Маскоўская Гара.



У. Е. Лабанок



І. С. Бурдыка (злева) і І. Я. Алісіевіч, удзельнікі партызанскага руху

Паспяховым дзеянням брыгады садзейнічала работа падпольных арганізацый у Чашніках і раёне.

Некаторыя маладыя падпольшчыкі працавалі ў немцаў, каб мець магчымасць здабываць дакладныя звесткі. Так, Сцяпан Казлоў, які працаваў у паліцыі, паведаміў аб тым, што немцы рыхтуюць напад на партызанскі атрад.



М. М. Пахолак, камандзір 4-га партызанскага атрада брыгады «Дубава»



Н. І. Грыбоўская

Вялікую дапамогу аказвалі партызанам камсамольцы Алег Церашкоў, Алег Варгалёнак, Люба Закрэўская, Валя Хадатовіч, Вольга Сяўцова, Валя Шнітко, Аня Чэпік, Аня Баркевіч і інш.

У 1943 г. Чашніцкая партызанская брыгада «Дубава» ўжо набыла вопыт барацьбы з ворагам, мела шырокую сетку падпольных арганізацый, была добра ўзброена. У гэты час пачалася сапраўдная вайна ў тыле ворага. Партызанскія брыгады грамілі варожыя гарнізоны ў Чашніках, вёсках Чарэя, Лукомль, Цяпіна, Варкі, Залессе і інш. Пачалі праводзіцца сумесныя ўзгодненыя дзеянні партызанскіх брыгад супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

У кастрычніку 1943 г. партызанскія брыгады зоны вырашылі разграміць шэраг буйных нямецкіх гарнізонаў, у т. л. у Лепелі і Чашніках. Для гэтага былі аб'яднаны 18 брыгад пад кіраўніцтвам Ф. Ф. Дуброўскага. Наступленне пачалося ноччу на 20 кастрычніка 1943 г. У наступленні на Чашніцкі гарнізон прымалі ўдзел партызаны брыгады «Дубава» і Смаленскі партызанскі полк.

У ходзе жорсткіх баёў аб'яднаныя брыгады ў Чашніках, Лепелі і вёсках знішчылі 500 фашыстаў, захапілі 39 кулямётаў, 18 мінамётаў, іншыя трафеі. Страты партызанскіх атрадаў — каля 300 чалавек. І хаця разгромленыя гарнізоны ўтрымаць не ўдалося, але партызаны ў значнай ступені паралізавалі тылавыя камунікацыі ворага, што стала істотнай дапамогай Чырвонай Арміі.

Здаралася, што населеныя пункты раёна неаднойчы пераходзілі з рук немцаў у рукі партызан. Так, напрыклад, у в. Чарэя 5 разоў змянялася ўлада. Першы раз варожы гарнізон тут разграміла Сенненская партызанская брыгада ў снежні 1942 г., але немцы зноў захапілі Чарэю. У лютым 1943 г. Смаленскі партызанскі полк разбіў варожы гарнізон у Чарэі і захапіў вёску. Праз 3 месяцы пачалася метадычная бамбёжка вёскі, якая працягвалася каля 2 тыдняў. У час яе загінула шмат дзяцей, жанчын, старых, згарэлі дамы і пабудовы. У маі немцы зноў захапілі Чарэю. У верасні 1943 г. Чарэю адбілі партызаны.

У партызанскім руху ўдзельнічалі жанчыны і дзеці. Кемлівай і смелай



В. М. Мурасіна



М. П. Салаўёва

разведчыцай была Надзея Ільінічна Грыбоўская. Ёй даводзілася хадзіць у разведку не толькі ў Чашнікі, але нават і за лінію фронту. Адважна ваявалі медыцынскія сёстры Марыя Нічыпараўна Белюкова, Вольга Аляксандраўна Чэпік, Кацярына Сямёнаўна Лісоўская, Марыя Іванаўна Калітуха, Вольга Мікалаеўна Мурасіна, Лідзія Платонаўна Звонава, Марфа Пятроўна Салаўёва, начальнік медыцынскай службы 1-й партызанскай брыгады імя К. С. Заслонава ўрач Марыя Станіславаўна Завадская.

Вялікую дапамогу партызанам аказвалі дзеці. Многія з іх загінулі ад рук нямецка-фашысцкіх захопнікаў. У 1941 г. немцы схапілі і жорстка катавалі 16-гадовую Валю Махрову — выхаванку Чарэйскага дзіцячага дома за сувязь з партызанскім атрадам Васіля Шчукіна. Потым яе расстралялі.

2 снежня 1942 г. трагічна загінуў Алег Каралёў у в. Навазёмава. 13-гадовы хлопчык збіраў зброю для Сенненскай партызанскай брыгады. Гэта стала вядома немцам. У вёску быў накіраваны паліцэйскі нарад, каб арыштаваць хлопчыка. Якраз у гэты час ён нёс партызанам вінтоўку. Паліцаі ўбачылі яго і хацелі схапіць. Алег пачаў адстрэльвацца. Канчаліся патроны, і ён апошнюю кулю пакінуў сабе.

З публікацыі У. Р. Бекашова ў газеце «Усход Алтая» стала вядома пра подзвіг юнага разведчыка Мікалая Грыня з атрада «За Радзіму» Сенненскай партызанскай брыгады. Немцы па-зверску закатавалі хлопчыка.

Цяжка прыйшлося партызанам брыгады «Дубава», іншых брыгад у час правядзення ў красавіку — маі 1944 г. карнай аперацыі немцаў пад кодавай назвай «Свята вясны». Яе задачай было знішчыць партызан усёй Полацка-Лепельскай зоны. На працягу трох тыдняў ішлі жорсткія баі, у ходзе якіх загінула шмат партызан.

Калі ў часы правядзення аперацыі «Баграціён» у Віцебскім «катле» аказалася звыш 5 дывізій і шмат разрозне-



П. І. Мурасін



А. К. Непляховіч



П. Я. Садоўскі



А. М. Шнітко



В. Р. Зімніцкі




Камсамольскі білет В. Р. Зімніцкага, прабіты кулямі

ных часцей 3-й нямецкай танкавай арміі агульнай колькасцю 50 тыс. чалавек, то дапамагалі арміі ў ачышчэнні ад нямецкіх часцей тэрыторыі Віцебшчыны партызаны. Яны знішчылі 400 і захапілі ў палон 1400 нямецкіх салдат і афіцэраў.

Шмат партызан брыгады «Дубава» праявілі мужнасць і гераізм, былі адзначаны высокімі ўрадавымі ўзнагародамі. Сярод іх жыхары Чашніцкага раёна Мікалай Аляксеевіч Амос, Міхаіл Карпавіч Апанасенка, Сцяпан Пятровіч Колас, Віктар Гаўрылавіч Белюкоў, Надзея Ільінічна Грыбоўская, Васіль Венядзіктавіч Даніч, Барыс Паўлавіч Звонаў, Васіль Рыгоравіч Зімніцкі, Пётр Іванавіч Мурасін, Іван Васільевіч Собаль, Іван Гаўрылавіч Чарноў, Кірыл Пятровіч Чэпік. Сцяпан Міхайлавіч Шнітко і інш.

Сярод 1808 партызан брыгады «Дубава», якія злучыліся з часцямі Чырвонай Арміі 28 чэрвеня 1944 г., былі людзі розных нацыянальнасцей. Разам з беларусамі змагаліся з ворагам 252 рускіх, 33 украінцы, 58 чалавек іншых нацыянальнасцей. Так, напрыклад, у 5-м атрадзе камандзірам быў рускі Іван Гаўрылавіч Чарноў, камандзірам узвода — украінец Олік, палітрукамі — яўрэй Скварцоў, прадстаўнікі азіяцкіх народаў Сулімаў і Асанаў. На ўсю партызанскую брыгаду былі вядомы сваімі баявымі дзеяннямі грузін Гаргішэлі, рускі Б. П. Звонаў, беларус С. П. Колас.

Многа гераічных спраў на рахунку брыгады «Дубава». На жаль, у час баявых аперацый загінула шмат смелых і мужных партызан. Сярод іх камандзіры атрадаў Андрэй Арцёмавіч Су-


С. П. Колас


М. Я. Казлоўскі



Група партызан брыгады Дубава

конька, Міхаіл Максімавіч Дзідэнка, Васіль Фёдаравіч Вітко, Міхаіл Іванавіч Чайкін, Панцялей Міхайлавіч Акімаў, Мікалай Сцяпанавіч Шчэрбік, Васіль Спірыдонавіч Клопаў, камісар Апалінарый Ігнатавіч Караннік і інш.

*ЦАМА РФ, ф. 235, воп. 2074, спр. 31, л. 119.*

*Н. Кіндзяева*

## Партызанскія фарміраванні, якія дзейнічалі на тэрыторыі раёна

**Партызанская брыгада 1-я Беларуская** (другога складу).

Дзейнічала на акупіраванай тэрыторыі Віцебскай (Сенненскі, Чашніцкі, Лепельскі раёны), Мінскай (Халопеніцкі раён) абласцей. Створана ў верасні 1943 на базе вылучанага ў ліпені 1943 з партызанскай брыгады 1-й Беларускай партызанскага атрада А. Дз. Гурко (створаны ў лютым 1942).

**Партызанская брыгада 1-я Віцебская** (другога складу).

Дзейнічала на акупіраванай тэрыторыі Віцебскай (Бешанковіцкі, Чашніцкі раёны) і Вілейскай (Смаргонскі раён) абласцей. Створана ў кастрычніку 1943 на базе атрадаў, вылучаных з партызанскай брыгады 1-й Беларускай. Камандзір брыгады П. З. Патапенка, камісар В. М. Казлоўскі, начальнік штаба І. А. Цімошчанка. У кастрычніку 1943 нанесла ўдар па апорнаму пункту праціўніка ў в. Дуброва. Брыгада (574 партызаны) 27 чэрвеня (атрады 3-і і 5-ы) і 2.7.1944 (атрады 1-ы, 2-і, 4-ы і штаб брыгады) злучыліся з Чырвонай Арміяй.

**Партызанская брыгада 1-я імя К. С. Заслонава.**

Дзейнічала на акупіраванай тэрыторыі Віцебскай (Аршанскі, Сенненскі, Багушэўскі, Талачынскі, Чашніцкі раёны) і Мінскай (Халопеніцкі раён) абласцей.

Створана ў ліпені 1942 на базе атрада «Дзядзі Косці» (К. С. Заслонава, арганізаваны ў лютым 1942 з групы, якая дзейнічала ў Аршанскім камуністычным падполлі), М. П. Харланава, В. П. Комлева і групы аршанскіх падпольшчыкаў. У красавіку 1943 разгра-

мілі чыгуначную станцыю Вятны. У кастрычніку 1943 удзельнічалі ў баях за Чашнікі. Камандзіры брыгады К. С. Заслонаў, Л. І. Сяліцкі, Б. К. Іваноў; камісары Л. І. Сяліцкі, М. Ц. Любімцаў, Б. К. Іваноў; начальнікі штаба П. П. Лімаеў, В. Р. Палажэнцаў, В. Н. Смірноў. 28.6.1944 брыгада (1826 партызан) злучылася з Чырвонай Арміяй.

**Партызанская брыгада 2-я імя К. С. Заслонава.**

Дзейнічала на акупіраванай тэрыторыі Віцебскай (Аршанскі, Сенненскі, Талачынскі, Лепельскі, Чашніцкі раёны) і Мінскай (Халопеніцкі раён) абласцей. Створана ў верасні 1943. Камандзір брыгады В. П. Комлеў; камісар В. Е. Бяляеў; начальнікі штаба В. Р. Палажэнцаў, М. М. Бальшуноў, М. С. Загер.

Партызаны брыгады ўчынілі дыверсіі на чыгунцы Лепель — Чашнікі. У чэрвені 1944 сумесна з часцямі Чырвонай Арміі вялі баі на рубяжы в. Пасынкі — Кажары — Гілі. 27.6.1944 г. брыгада (905 партызан) злучылася з часцямі Чырвонай Арміі.

**Партызанская брыгада 1-я Смаленская.**

Дзейнічала на акупіраванай тэрыторыі Смаленскай (РСФСР), Віцебскай (Сенненскі, Талачынскі, Чашніцкі, Лепельскі раёны) і Мінскай (Халопеніцкі, Крупскі раёны) абласцей. Створана ў сакавіку 1942 у Смаленскай вобл. пад назвай 1-ы батальён. У маі 1942 батальён перайменаваны ў партызанскую брыгаду 1-ю. Камандзіры Ф. Я. Апрэтаў, А. І. Яўстратаў, М. П. Пятровічаў, У. І. Цалішчэўскі; камісары А. Р. Багдановіч, М. П. Пятровічаў, І. Х. Вайзулін; начальнікі штаба А. І. Яўстратаў, Дз. М. Несцераў, А. В. Прусакоў, С. Дз. Жылін. У час наступлення Чырвонай Арміі аднавілі 6 мастоў на дарозе Лукомль — Вялікія Хальнявічы. 26.6.1944 брыгада (390 партызан) злучылася з Чырвонай Арміяй.

**Партызанская брыгада 2-я Беларуская імя П. К. Панамарэнкі** (другога складу).

Дзейнічала на акупіраванай тэрыторыі Віцебскай (Бешанковіцкі, Талачынскі, Чашніцкі раёны) і Мінскай (Крупскі раён) абласцей. Створана ў верасні 1943. Камандзір М. І. Дзячкоў, начальнік штаба Р. А. Махоткін. Партызаны наносілі ўдары па шашэйных і грунтавых дарогах Чашнікі — Бешанковічы, Чашнікі — Сянно.

27.6.1944 брыгада (394 партызаны) злучылася з Чырвонай Арміяй.

**Партызанская брыгада Багушэўская** (другога складу).

Дзейнічала на акупіраванай тэрыторыі Віцебскай (Багушэўскі, Чашніцкі і Лепельскі раёны) і Мінскай (Халопеніцкі раён) абласцей. Створана ў верасні 1943 на базе атрада імя А. В. Суворава, вылучанага з партызанскай брыгады 1-й імя К. С. Заслонава, асабовага складу, вылучанага з партызанскай брыгады Сенненскай, і з мясцовых жыхароў. Камандзір брыгады Я. М. Прахарэнка; камісар П. М. Шарыпа; начальнікі штаба В. П. Лаўкоў, С. Б. Лісецкі. У сакавіку 1944 у цяжкіх баях стрымлівала наступленне ворага на рубяжы вёсак Горы — Вяцера. Каля в. Чарэя перарэзала шлях да адступлення праціўніку, што дапамагло часцям Чырвонай Арміі захапіць у палон вялікую колькасць гітлераўцаў. 29.6.1944 брыгада (651 партызан) злучылася з Чырвонай Арміяй.

**Партызанская брыгада «Граза».**

Дзейнічала на акупіраванай тэрыторыі Віцебскай вобл. (Талачынскі, Чашніцкі раёны). Створана ў жніўні 1942 на базе атрада «Граза». Камандзіры брыгады М. А. Рашэтнікаў, С. М. Нарчук, Дз. М. Катлярчук, А. Дз. Варашэнь; камісар С. М. Нарчук; начальнікі штаба Дз. М. Катлярчук, Л. К. Кіпрыянец, Р. М. Аўчыннікаў. У кастрычніку 1943 вялі баі за ўтрыманне лініі абароны ля вёсак Ча-

рэя, Стражавічы, Белая Царква. 26.6.1944 брыгада (673 партызаны) злучылася з Чырвонай Арміяй.

**Партызанская брыгада М. П. Гудкова.**

Дзейнічала на акупіраванай тэрыторыі Віцебскай (Талачынскі, Сенненскі, Чашніцкі, Лепельскі раёны) і Мінскай (Халопеніцкі, Крупскі раёны) абласцей. Створана ў жніўні 1942 на базе атрадаў М. П. Гудкова і В. С. Лявонава (арганізаваны вясной 1942). Камандзір брыгады М. П. Гудкоў; камісары В. С. Лявонаў, І. Р. Фінагееў, Ф. П. Ігнатовіч; начальнікі штаба В. Дз. Сыщенка, Р. С. Арэшыц, Я. Ф. Рукаль. У кастрычніку 1943 партызаны брыгады ўдзельнічалі ў абароне в. Чарэя. У 1944 вялі абарончыя баі на рубяжы вёсак Болюта — Калодніца і Чарэя — Лукомль. 26.6.1944 брыгада (632 партызаны) злучылася з Чырвонай Арміяй.

**Партызанская брыгада імя А. Ф. Данукалава** (да мая 1944 г. «Брыгада Аляксея»).

Дзейнічала на акупіраванай тэрыторыі Смаленскай (РСФСР), Віцебскай (Лёзненскі, Суражскі, Віцебскі, Аршанскі, Багушэўскі, Бешанковіцкі, Чашніцкі, Ушацкі раёны) і Вілейскай (Пліскі раён) абласцей. Створана ў красавіку 1942 на базе атрадаў «Радзіма» (арганізаваны ў жніўні 1941), «Крэпасць» (арганізаваны ў красавіку 1942), «Граза ворага» (арганізаваны ў кастрычніку 1941). Камандзіры брыгады А. Ф. Данукалаў, В. А. Блахін; камісары І. А. Паўлоўскі, А. Ц. Шчарбакоў, І. І. Старавойтаў; начальнікі штаба А. С. Гайдукоў, Я. М. Антоненка, Ф. І. Пласкуноў, І. П. Піменаў. 1.7.1944 брыгада (1817 партызан) злучылася з Чырвонай Арміяй.

**Партызанская брыгада Лёзненская.**

Дзейнічала на акупіраванай тэрыторыі Віцебскай (Лёзненскі, Сенненскі, Чашніцкі, Бешанковіцкі, Багушэўскі, Лепельскі раёны), Вілейскай (Ільянскі раён) і Мінскай (Крупскі раён) абласцей. Створана ў маі 1943 на базе



Ф. І. Карунец, камісар атрада Сенненскай брыгады



У. Н. Семянкоў



В. С. Лявонаў



П. В. Сырцоў



Я. З. Шарахоўскі

атрадаў «Граза», імя В. І. Чапаева і «Буравеснік». Камандзір брыгады П. І. Кірылаў; камісары А. Ц. Шчарбакоў, Ц. П. Шакінка, М. В. Комлеў, К. М. Кірылаў; начальнік штаба І. Дз. Крупін.

У кастрычніку 1943 удзельнічала ў штурме варожага гарнізона ў г. п. Чашнікі. Разграміла варожыя гарнізоны ў в. Смалянцы (кастрычнік 1943). 28.6.1944 брыгада (604 партызаны) злучылася з Чырвонай Арміяй.

**Партызанская брыгада Сенненская.** Дзейнічала на акупіраванай тэрыторыі Віцебскай вобл. (Сенненскі, Чашніцкі, Лепельскі раёны). Створана ў кастрычніку 1942 з часткі асабовага складу партызанскай брыгады М. П. Гудкова. Камандзір В. С. Лявонаў; камісары П. В. Сырцоў, М. Ц. Любімцаў; начальнікі штаба В. Дз. Сыценка, І. К. Пашчанка, Я. З. Шарахоўскі. У снежні 1942 разграмілі варожы гарнізон у в. Чарэя, у верасні — кастрычніку 1943 варожыя гарнізоны ў вёсках Граеўшчына, Слідцы, Закур'е, Прыдвор'е, Лукомль. 26.6.1944 брыгада (1939 партызан) злучылася з Чырвонай Арміяй.

**Партызанскі полк Смаленскі.** Дзейнічаў на акупіраванай тэрыторыі Смаленскай (РСФСР), Віцебскай (Сенненскі, Чашніцкі, Талачынскі, Ушацкі раёны) і Вілейскай (Куранецкі раён) абласцей. Створаны ў ліпені 1942 на базе групы партызан, вылучанай з партызанскага злучэння «Баця» і арганізатарскай групы І. Ф. Садчыкава. Камандзір палка І. Ф. Садчыкаў; камісар А. Ф. Юр'еў; начальнікі штаба Г. П. Дамарацкі, П. Г. Міняеў. У кастрычніку 1943 партызаны разграмілі варожы гарнізон у в. Чарэя, сумесна з іншымі брыгадамі авалодалі г. Чашнікі. 3.7.1944 полк (942 партызаны) злучыўся з Чырвонай Арміяй. Полк увекавечаны ў мемарыяльным комплексе «Прарыў».

**Партызанскі атрад Ц. Я. Ермаковіча.** Дзейнічаў асобна на акупіраванай тэрыторыі Чашніцкага раёна. Створаны ў жніўні 1941 з патрыётаў раёна і ваеннаслужачых. У кастрычніку 1941 аб'яднаўся з дыверсійна-разведвальнай групай Р. М. Лінькова. Камандзір атрада Ц. Я. Ермаковіч.



І. Ф. Садчыкаў



А. Ф. Юр'еў



П. Г. Міняеў

У жніўні 1941 партызаны знішчылі некалькі мастоў і тэлеграфна-тэлефонную лінію ў раёне. У верасні 1941 вялі бой каля в. Красналукі.

*Н. Кіндзяева*

## Партызанскі генерал

Аўтар нататкаў — Сяргей Васільевіч Маркевіч, доктар хімічных навук. У гады Вялікай Айчыннай вайны — намеснік камандзіра Чашніцкай партызанскай брыгады «Дубава», у 1944 — 1946 гг. — старшыня Чашніцкага райвыканкома.

Ураджэнец в. Замошша Ушацкага раёна Фёдар Дуброўскі зведаў нялёгкую сялянскую долю. Яго маці, Агаф'я На-


С. В. Маркевіч


Ф. Ф. Дуброўскі

вумаўна,— беззямельная сялянка — батрачыла ў памешчыкаў і кулакоў, а Федзя з 12 гадоў дапамагаў. Пасля рэвалюцыі, у снежні 1918 г., юнак добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію, нёс службу пры ваенным камісарыяце ў Лепелі, а потым з баямі прайшоў ад Лепеля да Варшавы. Гэта была пара яго духоўнага станаўлення і сур'ёзнай загартоўкі.

Праз некаторы час пасля заканчэння Вяземскай палкавой школы Фёдара дэмабілізавалі. Атрымаўшы ў в. Старое Сяло зямельны ўчастак, ён займаўся сельскай гаспадаркай. А калі пачалася калектывізацыя, Фёдар Фаміч арганізаваў калгас «Чырвонае Сяло». Сяляне выбралі яго старшынёй.

У 1931 г. Дуброўскі ўступіў у партыю. Паколькі за яго плячыма былі толькі 2 класы прыходскай школы, Ушацкі райком партыі накіраваў яго ў Вышэйшую цэнтральную калгасную школу, дзе ён атрымаў спецыяльнасць заатэхніка. Працаваў спачатку ў райзем-аддзеле, потым старшынёй трох сельсаветаў. І, нарэшце,— дырэктарам Ушацкай МТС. Палітруком палка ўдзельнічаў у вызваленні Заходняй Беларусі, а ў час савецка-фінскай вайны 1939—1940 гг. быў паранены і кантужаны. Перад вайной з Германіяй працаваў намеснікам старшыні Ушацкага райвыканкома.

Вось такі жыццёвы шлях прайшоў Фёдар Фаміч Дуброўскі перад тым, як стаць народным важаком у барацьбе з нямецка - фашысцкімі акупантамі, камандзірам вядомай брыгады «Дубава».

...У пачатку жніўня 1941 г. па заданню Віцебскага абкома партыі Ф. Ф. Дуброўскі з групай таварышаў вярнуўся ва Ушацкі раён са Ржэва, куды ён эвакуіраваў установы і прадпрыемствы з Ушач. Вось з гэтага часу мы з ім і знаёмы. Калі ж разгарнулі барацьбу з ворагам, я быў намеснікам Фёдара Фаміча: спачатку намеснікам камандзіра атрада, потым — намеснікам камандзіра брыгады па разведцы.

Група Дуброўскага пачынала не з нуля. Для падпольнай работы райком партыі пакінуў у раёне шэраг партыйных, савецкіх і гаспадарчых работнікаў на чале з сакратаром райкома С. Я. Барадаўкіным: інструктараў раённага камітэта С. Б. Баркара, С. К. Паршонка, старшынь сельсаветаў У. М. Коршуна, І. А. Сарокіна, дырэктара лясгаса З. П. Тамашэвіча, дырэктара малаказавода М. Ф. Мошчава, старшынь калгасаў А. І. Хвашча, А. Р. Волаха, настаўнікаў У. Я. Васілеўскага, А. А. Карабаня, П. П. Катленку... Яны арганізоўвалі патрыятычныя групы, збіралі зброю, звесткі і інш.

Пасля ўстанаўлення сувязей з названымі таварышамі ў Сарочынскім лесе, што кіламетраў за дзесяць ад Ушач, Дуброўскі правёў нараду падпольшчыкаў раёна. На ёй былі вызначаны задачы агульных дзеянняў, іх каардынацыя, абгавораны канспіратыўнасць і ўзаемасувязь.

На працягу ліпеня 1942 г. у партызанскія атрады нашай зоны прыйшлі сотні людзей. Паўстала задача: аб'яднаць іх сілы. Таму паводле рашэння абкома партыі ўстаноўлена сувязь з камандзірам суседняга партызанскага атрада У. Е. Лабанком (ажыццявіць гэтую задачу было даручана мне). У жніўні на базе гэтых двух атрадаў створана партызанская брыгада «Дубава».

Дарэчы, аб назве брыгады. Маці, жонка, трое дзяцей Фёдара Фаміча жылі ў в. Старое Сяло. І каб фашысты не змаглі даведацца, што гэта сям'я партызанскага камандзіра, вырашылі прозвішча Дуброўскі змяніць на Дубава. Некаторы час фашысцкая разведка лічыла, што ёсць дзве брыгады — Дуброўскага і «Дубава». Гэта хоць і невялічкая хітрасць, але пайшла яна нам на карысць: у страха, як кажуць, вочы вялікія.

Камбрыг быў чалавекам творчым, умеў выслухаць усіх, і хоць канчатковае слова было за ім, прымаў яго не спяшаючыся. Прыродны розум, гаспадарскі падыход, жыццёвы вопыт дазвалялі яму прымаць найбольш правільныя рашэнні. У той час ён турбаваўся аб тым, як забяспечыць умовы жыцця і баявую дзейнасць зімою партызанам брыгады, колькасны склад якой восенню 1942 г. дасягаў амаль 1700 чалавек. Хаця лепш былога намесніка старшыні райвыканкома Ф. Ф. Дуброўскага ніхто не ведаў раён, тым не менш камбрыг даручыў разведцы і гаспадарчаму ўзводу вынесці прапанову аб месцы размяшчэння партызанскай базы. Такое месца было знойдзена: у двух кіламетрах ад в. Антунова.

У гэты час у брыгадзе стварылі артдывізіён і кавалерыйскі эскадрон. Расшырыўся аператыўны прастор брыгады, дзеянні якой былі накіраваны на чыгунку Полацк — Маладзечна, а таксама ў бок Лепеля, Чашнікаў, Красналук. Пачалі знішчаць чыгуначныя эшалоны з супрацьтанкавай гарматы.

Адчуваючы сілу нашых удараў, немцы часцей сталі праводзіць карныя экспедыцыі, прытым буйнамаштабныя. Прыкладам можа служыць аперацыя «Котбус» вясной 1943 г.

Улічваючы колькасць, высокую арганізацыю і баявую загартоўку брыгады «Дубава», рашэннем Віцебскага абкома партыі і Беларускага штаба партызанскага руху ў ліпені 1943 г. яна была раздзелена на дзве: Лепельскую імя І. В. Сталіна (камбрыг У. Е. Лабанок) і Чашніцкую «Дубава» (камбрыг Ф. Ф. Дуброўскі) з перадыслацыраваннем яе ў Чашніцкі раён. Крыху пазней Фёдар Фаміч зацвярджаецца сакратаром Чашніцкага падпольнага райкома партыі. У яго баявым жыцці пачынаецца новы этап: арганізацыя партыйна-палітычнай работы, удасканаленне тактычных прыёмаў партызанскай вайны ў бязлесным раёне. Нават новы аэрадром трэба было абсталяваць — у бяспечным месцы, вядома.

Штаб брыгады і райком партыі размясціліся ў в. Маскоўская Гара. Паблізу былі знішчаны варожыя гарнізоны. З'явіліся новыя суседзі-партызаны: брыгады Заслонава, Лявонава, Раманава, Прахарэнкі. Нам трэба было «асядлаць» чыгунку Лепель — Чашнікі — Орша. Камбрыг прыняў рашэнне знішчыць яе зусім. Дапамагалі партызанам больш 2500 мясцовых жыхароў. Гэта было ні з чым не параўнальнае працоўнае змаганне, якое мела вялікае выхаваўчае значэнне: партызаны і насельніцтва сумесна перакрылі шлях, чыгунку не аднаўлялі.

У пачатку восені 1943 г. перад партызанскімі брыгадамі нашай зоны пастаўлена новая задача: адначасова разграміць рад буйных гарнізонаў. 18 брыгад былі аб'яднаны пад кіраўніцтвам генерал-маёра Ф. Ф. Дуброўскага. Наступленне прызначылі на ноч 20 кастрычніка.

Аб маштабах восеньскай партызанскай вайны можна меркаваць па Лепелю. Тут размяшчаліся тры ўзмоцненыя палкі фашыстаў, танкавы батальён, дзве артылерыйскія і адна мінамётная батарэі, колькасць гарнізона перавышала

2000 чалавек. Акрамя таго, на подступах горад ахоўваўся больш дробнымі гарнізонамі, шмат было дотаў, дзотаў, акопаў, драцяных загародж. (Тое ж, толькі ў некалькі меншых маштабах, назіралася ў Чашніках, Камені, Бароўцы, Бачэйкаве.) Для штурму Лепеля і прылеглых гарнізонаў выдзялялася 5 брыгад: «Дубава», Лабанка, Уткіна, Мельнікава, Лявонава, якія мелі 6300 байцоў, 12 гармат, 48 мінамётаў, 26 станковых і 303 ручныя кулямёты, 18 супрацьтанкавых ружжаў і іншую зброю.

Наступіла вясна 1944 г. Лінія фронту ў гэты час праходзіла ў 15—60 кіламетрах на ўсход ад Полацка, Віцебска, Оршы, Магілёва, Бабруйска... Знаходзячыся ў аператыўным тыле праціўніка на ўчастку Полацк — Віцебск — Орша, мы павінны былі выканаць тры задачы, пастаўленыя камандаваннем фронту, Цэнтральным штабам партызанскага руху: дэзарганізаваць аператыўны тыл ворага, зрываць падвоз яго рэзерваў і забяспечваць разведданымі аб перадыслакацыі гітлераўскіх войск.

Разведка нашай брыгады здабыла таксама загад фашыстаў аб фізічным знішчэнні партызан усёй Полацка-Лепельскай зоны. Ён стаў вядомы нам у канцы сакавіка, аб чым было дакладзена непасрэдна П. К. Панамарэнку. Карная аперацыя пад кодавай назвай «Фрулінгфест» («Свята вясны») намячалася на красавік — май. У ёй павінны былі ўдзельнічаць 6 нямецкіх дывізій з танкамі і авіяцыяй. Напярэдадні наступлення карнікаў для каардынацыі дзеянняў партызан у зоне была створана спецгрупа на чале з У. Е. Лабанком. Вельмі жорсткія баі ішлі на працягу трох тыдняў, якія закончыліся прарывам кальца акружэння. Цяпер гэты партызанскі подзвіг вядомы як «Прарыў».

Набліжаўся час вызвалення Беларусі. 23 чэрвеня пачалася наступальная аперацыя «Баграціён». Актывізавалі дзеянні і партызаны. 25 чэрвеня войскі 43-й арміі генерала Белабародава і 39-й арміі генерала Люднікава злучыліся ў нашай партызанскай зоне і рушылі далей на захад. А ў Віцебскім «мяшку» аказалася звыш 5 дывізій і многа разрозненых часцей 3-й нямецкай танкавай арміі агульнай колькасцю 50 тысяч чалавек, з якіх больш 16 тысяч было ўзята ў палон адразу. Паколькі нашы войскі гналі ворага далей, да Літвы і Латвіі, то ачышчаць тыл ад акружаных і раз'яднаных нямецкіх часцей віцебскага «катла» павінны былі мы, партызаны. І хоць многія немцы здаваліся ў палон без бою, але былі і «гарачыя» сутычкі з тымі, хто спрабаваў прарвацца на захад. 4 ліпеня Чашніцкі раён быў поўнасцю ачышчаны ад фашыстаў.

Пачалося мірнае жыццё. Партызанскі генерал Дубаў — Фёдар Фаміч Дуброўскі, які быў першым сакратаром Чашніцкага райкома партыі, узяўся за мірныя справы — адраджэнне жыцця знявечанай ворагам, але няскоранай зямлі.

*Чырвоны прамень, № 69, 70, 72, 1985 г.*

## Партизанский рейд (у скарачэнні)

Далеко растянулась бригада по снежным буграм, идут бойцы, тянутся обозы, на санках сидят пулеметчики, они у нас привилегированные — им и сани и кони самые лучшие, чтобы из сугробов, когда нужно, могли вытащить пулемет и доскакать до места, ждущего помощи огнем этого сильного оружия.



М. І. Абрыньба

Бригада направляется на Чашники, надо потревожить фашистов в этом районе. До сих пор действовали в основном в Лепельском — то засады, то на гарнизон в Ушачах налет — и добились своего, вынудили оккупантов уйти из района. А сейчас операция предстоит крупная, поэтому возглавляют рейд комбриг Федор Фомич Дубровский и комиссар бригады Владимир Елисеевич Лобанок. Бригады Дубровского и Лобанка вели партизанскую войну в двух районах, Чашникском и Лепельском, но в августе прошлого, 1942 г. они объединились и образовали единую бригаду «Дубова», состоящую из пяти отрядов.

Я сидел в санках со Степаном Бородавкиным, начальником штаба бригады, а до войны — секретарь райкома в Ушачах. Степан относится ко мне хорошо, вот и ехал у него в санках. Растянулась бригада километров на пять, входит голова колонны в одну деревню, а хвост еще во второй или третьей находится.

Растянули бригаду с умыслом. Много глаз смотрело на движущиеся отряды — и добрых и злых, вот и передадут фашистам в Лепель, что, мол, шла колонна на три села. А нам того и нужно, пусть знают, что у них под боком такая сила. Да еще прибавят свои про оружие — автоматы. Душа у меня радовалась, и родилось дерзкое желание — написать такую картину, как бы портрет бригады, и делать не просто стаффажные лица, а групповой портрет, лучших бойцов изобразить. Эта мысль все больше овладевала мною, и я смотрел на наш марш, обостренно все воспринимая. Комбриг Дубровский, тяжеловатый и рослый, производит впечатление былинного богатыря. Под стать ему и конь, и нарядная, с медными украшениями уздечка, и красный повод. Конь пенит, кусая удила, ездит Федор Фомич превосходно. Сам он — в длинной серой шинели, на груди бинокль, сбоку желтая кобура маузера и еще через плечо автомат.

В саночках, запряженных рыжей рослой кобылой, красиво гнущей шею, объезжал орудия Лобанок. Каждое орудие цугом везут четыре коня. На темно-каурам мохнатом коне в первой запряжке сидит командир нашей партизанской артиллерии Сергей Маркевич. Сергей в белом полушубке, с автоматом и биноклем, черты лица утонченные, это очень добрый и мужественный человек. Митя Короленко — образец кадрового военного — это целая поэма, герой из героев, в длиннополой шинели с автоматом на груди, в белой шапке со звездочкой. Сергей Маркевич, в своем летчицком шлеме, которым гордится и надевает в самые торжественные минуты, любит покрасоваться; в нем живет артистичность, и ему всегда хочется, чтобы на него смотрели, хочет обратить на себя внимание. Любит он зрителей и слушателей, любит озадачить каким-нибудь повествованием.

Всегда меня восхищали Вася Никифоров, Борис Звонов и Миша Диденко. Это — три друга, основатели бригады Дубровского, вошедшие в первый десяток отряда. Никифоров — белорус, Диденко — украинец, Звонов — русский. Это на редкость крепкая дружба трех с разными характерами людей.

Возвращаюсь к своей бригаде, шедшей на Чашники. Задача наша: вынудить оккупантов уйти из местечка, показать им, что они в поле досягаемости нашей бригады. Да и полицаям по деревням надо страху нагнать, а своих людей — укрепить. Много дел делается, когда бригада движется и останавливается то в одной деревне, то в другой.

Солнце светит, повернув к западу, все ниже спускается, и лучи уже бьют в глаза, слепят, делают тени синее и вытягивают их в длину. Когда мы со Степаном Бородавкиным обгоняем колонну и я смотрю на нее, освещенную красным светом, моему восторгу нет предела. Экая красота! Как вернемся, начну писать.

В последний раз выкатилось солнце из-за тени — полосы облака, осветило все ярким светом и начало уходить в нижний слой облаков, затянувших горизонт. Мы входим в деревню на ночлег.

Завтра опять переход с ночлегом и послезавтра к вечеру мы будем в Чашниках.

День наступил, но без яркого солнца, идет снег, медленно падает. И теперь бригада смотрится силуэтом, а вдоль скрывается тонкой полосой, звуки как бы пропали, и не слышно ни скрипа саней, ни шагов, тихо, только когда мимо тебя проходят, ты все ярко видишь, а затем все скрывается во тьме.

Степан Бородавкин рассказывает, как он шел в свой район и как начинал подпольную деятельность. Сначала надо было самому законспирироваться, ему помогла Полонская Феня Карповна. Она спрятала его в своей хате; за печью вынула кусок бревна из стены, получилось лежбище, которое доской закрывалось, вот в нем и надо было лежать, чтобы не забрали, не выследили. Феня стала связной и ходила по заданию Бородавкина по селам, его письма носила, пока не нашла Дубровского, связала их — это уже была основа, и пошла работа дальше.

Требовалось начертить три карты поселка Чашники для командиров трех отрядов, участвовавших в рейде, потом на них будет указано место и время вступления в бой каждого отряда. Работа срочная, я возвращаюсь в свою хату и быстро копирую. Понес Дубровскому, следом за мной вошли в его хату партизаны, хозяйка зажгла новую лучину.

Сгибаясь в дверях, вошел Диденко. Дубровский показал на лавку возле стола, он сел, рядом поместился вошедший следом Борис Звонов. Комбриг стал давать задания.

— Ты, Михаил, с Борисом займешь дорогу Чашники — Лепель и будете ждать. Если с Лепеля пойдут машины с подкреплением — ударите. Теперь... надо поставить еще один заслон, чтобы не выпустить немцев из Чашник...

Опять колонна растянулась по пушистому снегу.

Был уже вечер, догорал малиновый закат за бугром кладбища, когда мы въехали в ложбинку, начиналась окраина Чашник. Что встретит нас? Откуда могут ударить немцы?

Вдруг пулеметная очередь прорезала воздух и пули стали ложиться, вздымая снег, пронизывая поленницу, возле которой мы стояли. Бой начался, и я заторопился к церкви на кладбище, забрался на третий ярус колокольни и оттуда стал стрелять вдоль улицы в пробегающие фигурки полицаев. Пуля прошла рядом со мной, расщепив точеную балясину, я выстрелил раз, второй, опять оттуда же пуля прошла, но чуть выше, ударив в дерево поручня. Решил переменить место и тут увидел, как наши основные три отряда подходят к Чашникам, значит, мы должны присоединиться к бригаде. Отполз к люку и начал по лестнице быстро спускаться вниз.

Но Дубровский не ввел бригаду в бой. Диденко со своим отрядом закрывал большак к Чашникам, и пополнение немцев не могло подойти. Собрав остальные отряды, Дубровский решил оставить сейчас местечко, обойти его и ударить ночью со стороны.

Часов в одиннадцать — двенадцать ночи отряды подошли к льнозаводу, там засели полицаи, закрыв окна мешками с песком и сделав бойницы. Полицаев без артиллерии не выбить, потому поставили орудие и начали обстрел. Я находился на командном пункте. Разрывы ложились во дворе завода, но вот снаряд попал в здание, послышался треск, звон стекла, вспыхнули языки пламени. Мимо их побежали наши бойцы второго отряда, впереди — Василий Никифоров в своей черной кожаной куртке. Полицаи, не жалея боеприпасов, поливают огнем из пулеметов и автоматов. Вдруг длинная очередь из-за стены завода, автомат Василия падает на снег. Я подбежал, Василия ранило в правую руку. Я вытащил из сумки индивидуальный пакет, перевязал раненого.

Шесть суток продолжались бои с гарнизоном и на подступах к Чашникам. Наши отряды блокировали подходы к поселку, на дорогах и в деревнях вокруг

Чашник шли непрерывные бои. За это время противник стянул к гарнизону крупные силы, у нас кончались боеприпасы, было ясно, что бригада находится под угрозой окружения.

Партизаны не имели возможности вести позиционную войну с укрепленными гарнизонами. Со времен Дениса Давыдова типичная тактика партизанской войны — неожиданный удар из засады по движущимся войскам и транспортам противника. Этот метод дал блестящие результаты. Вокруг гарнизонов постоянно действовали засады партизан. Заготовки хлеба, скота, которые проводили фашисты для своей армии, часто не попадали по адресу, их забирали партизаны, которые заранее знали от своих разведчиков, когда, куда, с чем идет немецкий транспорт.

Немцы начали подтягивать к Чашникам крупные силы с танками и артиллерией. Дубровский сообщил в обком партии, что район наводнен карателями, что бригада ведет тяжелые бои. Вскоре пришел ответ: «Бригада задачу выполнила. Объявляю благодарность всему личному составу. Разрешаю следовать на свою базу. Секретарь обкома Стулов».

Сейчас, спустя сорок лет, я вспоминаю тогдашнее свое состояние. Я не желал отставать от своих товарищей — участвовал в работе разведки, в операциях по разгрому немецких эшелонов и гарнизонов, рисовал карты для командования. В этой напряженной борьбе и создавались картины. После рейда на Чашники мы вернулись ночью, а утром я уже приступил к картине «Выход бригады «Дубова» на операцию».

Постоянно перед мысленным взором стоят мои товарищи. Я спешу запечатлеть их образы, создать картину. Я остаюсь им верен. В этом и есть моя жизнь и необходимость труда.

*Обрыньба Н. Партизанский рейд// Искусство. 1985. № 4. С. 14–19.*

## Чарэйская засада

Спачатку была дакладная разведка, каб сабраць усе дадзеныя аб нямецкім гарнізоне ў мяст. Чарэя. Штодзень, групамі і па аднаму, ішлі разведчыкі палка на заданне. Камандаванню дакладвалі, што колькасць ворагаў — каля шасцісот чалавек, на ўзбраенні — 3 танкеткі, 17 кулямётаў, пабудаваны дзоты. Апорныя пункты — у царкве і касцёле. А бліжэйшыя нямецкія гарнізоны — у Лукомлі і Чашніках.

Калі сабралі гэтыя і іншыя звесткі, камандаванне палка на чале з палкоўнікам Садчыкавым распрацавала план баявой аперацыі па разгрому Чарэйскага гарнізона.

Раніцай другога верасня 1943 г. завязаўся бой. Фашысты адкрылі шквальны агонь. Не драмалі і нашы кулямётныя разлікі. Метка касілі ворагаў Сцяпан Варочкін, Яўген Шурупаў, Мікалай Міхееў, Сяргей Школьдаў, Міхаіл Курбасаў. У бой уступілі два нашыя танкі: Т-34 і БТ-26. Аднак «трыццацьчацвёрка» не дайшла да мястэчка метраў 400 і спынілася: сапсавалася муфта счаплення. БТ-26 вымушаны быў развярнуцца і пайсці на дапамогу таварышам. Пацягнуць за сабой на буксіры пашкоджаны танк не ўдалося, бо не хапала магутнасці рухавіка. Варожы агонь не дазваляў танкістам перасесці ў спраўны танк. Тады камандзір узвода танкістаў ваентэхнік Фасцянка аддаў загад экіпажу БТ-26 (Юрзіну, Галмасаву, Габітаву і Грынько): рухацца наперад і прыкрываць наступленне партызан.

Каля сутак працягваўся бой, пакуль з боку Лукомля да немцаў не прыйшло падмацаванне. Камандзір палка рэальна ацаніў становішча і загадаў адступаць. Абодва танкі вялі агонь, прыкрываючы адыход партызан. Танкістам «трыццацьчацвёркі» паступіў загад пакінуць танк — адыходзіць, але яны працягвалі бой і спадзяваліся адрамантаваць сваю баявую машыну.

Калі бой заціх, немцы вырашылі ўзяць наш танк на буксір пры дапамозе цягача. Але ў гэты момант з Т-34 загаварыў кулямёт. Адны фашысты былі скошаны чэргамі, іншыя ж кінуліся наўцёкі. Толькі пасля таго, як закончыліся ўсе боепрыпасы, танкісты адчынілі люк вежы і спусціліся ўніз. Кола немцаў сціскалася. Не раздумваючы, партызаны кінулі гранаты і пабеглі ў бок кустоў. На жаль, дабегчы ім не ўдалося: аўтаматная чарга назаўсёды абарвала жыцці герояў. Мясцовыя жыхары пахавалі іх на месцы гібелі, а баявыя сябры далі прысягу адпомсціць ворагу і абавязкова авалодаць гарнізонам.

Увечары 22 верасня полк рухаўся да Чарэі. Знішчылі засады і дзоты на подступах, узялі ворага ў кальцо. Аднак з царквы і касцёла яны палівалі партызан моцным агнём.

Леанід Чарнагузаў, Мікалай Сафонаў і Міхаіл Студзянкоў, якія былі ў засадзе, кінуліся ў атаку. Знішчылі агнявую кропку, Міхаіл і Мікалай атрымалі сур'ёзныя раненні. Лёня ратаваў таварышаў, але разам з імі трапіў у рукі ворагаў.

У гэты час партызаны знішчылі дзве грузавыя машыны з немцамі, якія спяшаліся на дапамогу атакаванаму гарнізону. Астатнія два грузавікі павярнулі назад. Аднак касцёл заставаўся непрыступным.

Сувязныя паведамілі камандзіру, што з боку суседняй вёскі рухаецца батальён фашыстаў. І камандзір зноў вырашыў адступаць. З горыччу вярталіся мы ў в. Замачак, але думкі аб разгроме ворага нас не пакідалі.

Фашысцкі гарнізон быў блакіраваны атрадамі пад камандаваннем Яршова.

Быў распрацаваны план выручкі з палону нашых параненых таварышаў. Меркавалі ўстанавіць сувязь з сям'ёй Раманавых — нашымі сувязнымі ў Чарэі. Але ліхі разведчык камсамолец Лёня Чарнагузаў сам сябе вызваліў, падгаварыў вартавых і разам з імі (прыхапіўшы кулямёт са стужкамі) збег у полк. Камандаванне падзякавала юнаку за смеласць і знаходлівасць. А той у сваю чаргу расказаў, што цяжка хворых партызан змясцілі ў бальніцу пад распіску доктара Фёдара Міхайлавіча Раманава.

У гэтую ж ноч параненых і доктара разам з сям'ёй удалося вывезці з Чарэі. Даведаўшыся аб гэтым, немцы арыштавалі частку жыхароў мястэчка за сувязь з партызанамі. Усе яны былі прыгавораны да смяротнага пакарання. Калі ж арыштаваных вялі ў Чашнікі, партызаны з засады напалі на канваіраў і вызвалілі людзей. Да таго ж атрымалі нямала трафеяў і дакументаў.

Але ўсе гэтыя поспехі не радавалі партызан, бо вораг быў у Чарэі, скоўваў подступы да Лукомля і Чашнікаў.

8 кастрычніка знянацку партызаны 9-га атрада акружылі гарнізон. Пачаўся бой. Усе атрады фашыстаў, якія прыбылі на дапамогу, былі цалкам разгромлены, здаліся ў палон. І толькі гітлераўцы, якія заселі ў касцёле, працягвалі весці бой.

Адчайна дзейнічалі нашы кулямётчыкі Уласаў, Шакураў, Коршунаў. Своечасовую дапамогу параненым аказвалі медыцынскія сёстры Падорнікава, Кузняцова, Хацілоўская. Бой паступова пачаў заціхаць. Раніцай Чарэя ўжо была ў руках партызан.

Георгій Панамароў радзіраваў у Беларускі штаб партызанскага руху: гарнізон у мяст. Чарэя ліквідаваны. Разбіты і спалены гарбарны завод, сырзавод, фуражны склад. Знішчаны восем дзотаў, захоплена мноства зброі і боепрыпасаў.

У гэты ж дзень у Чарэі адбыўся мітынг насельніцтва і байцоў Смаленскага партызанскага палка.

Фашыстам так і не ўдалося ўзнавіць разгромлены гарнізон, а гэта дазволіла партызанам у кастрычніку разграміць яшчэ варожыя гарнізоны ў Лукомлі, Чашніках.

Так партызаны палка адзначылі 26-ю гадавіну Вялікага Кастрычніка.

Чытач можа запытаць, як маглі аказацца на ўзбраенні партызан танкі. Мы іх «увели» з нямецкага гарнізона ў Багушэўску.

## Плывучы шпіталь на Жэрынскім возеры

З успамінаў Марыі Станіславаўны Завадскай, былога начальніка медслужбы 1-й партызанскай брыгады імя Героя Савецкага Саюза К. С. Заслонава. У пасляваенныя гады — ардынатар 3-й клінічнай бальніцы, асістэнт кафедры афтальмалогіі МДМІ, асістэнт, дацэнт кафедры Беларускага дзяржаўнага інстытута ўдасканалення ўрачоў. Узнагароджана ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступені, Знак Пашаны, медалямі.

4 чэрвеня 1943 года мяне прызначылі начальнікам медыка-санітарнай службы брыгады імя К. С. Заслонава. Тады ж была арганізавана медыка-санітарная служба брыгады і перасоўны хірургічны шпіталь, кіраўніком якога камбрыг Л. І. Сяліцкі прызначыў мяне. Адразу была наладжана медыка-санітарная служба ў атрадах. Узначалілі яе медыкі з мясцовага насельніцтва і ўцёкшыя з лагераў ваеннапалонныя ўрачы і медсёстры: Дар'я Пятроўна Віннікава, Мікалай Агеевіч Гапоненка, Мікалай Герасімавіч Лялькоў, Кацярына Аляксееўна Манкевіч, Павел Ягоравіч Някрасаў, Надзея Сцяпанаўна Панкратава, Валянціна Іванаўна Пахамовіч, Ефрасіння Мікалаеўна Самсонава, Ганна Іванаўна Сафронава, Ала Паўлаўна Скрыпачова, Надзея Аляксееўна Сакалова, Анатоль Аўрамавіч Сухадолаў, Любоў Апанасаўна Туравец, Марыя Авакумаўна Фельдчанка, Вера Сяргееўна Хаміцкая, Вольга Уласаўна Панкратава, Марыя Іванаўна Бялухіна. У 1-м атрадзе начальнікам медсанслужбы быў урач Георг Архіпавіч Саплеў, у 2-м — ваенфельчар Іван Андрэевіч Рудзік.

У чэрвені 1943 года маёй першай задачай было ліквідаванне захворвання фурункулёзам. Неадкладна было арганізавана мыццё і кіпячэнне бялізны, лячэнне сульфамідамі, аўтагематэрапія, актыўнае ўжыванне ў ежу хворых гародніны. Усё гэта дазволіла ў кароткі тэрмін ліквідаваць масавае захворванне.

Першы ранены, якому давялося аказваць дапамогу, быў брыгадны разведчык Фёдар — Цыган (так яго ўсе звалі). Калі ён вяртаўся з разведкі, конь наскочыў на міну. Ад выбуху каня разарвала, а Фёдара параніла ў руку і нагу. Давялося рабіць аперацыю. Тэмпература ў хворага была больш сарака градусаў, пачыналася газавая гангрэна нагі, якая, як потым высветлілася, была паранена кавалкам капыта каня. Федзю ўдалося выратаваць.

З мая 1943 па чэрвень 1944 года ў брыгадзе зарэгістравана 200 раненых. У іх лік не былі ўключаны лёгкапараненыя партызаны, якія заставаліся ў страі. Раненні былі самыя розныя: чэрапнамазгавыя, грудной клеткі, канечнасцей і г. д. У час аперацыі ўсе партызаны былі вельмі цярплівымі. Даводзілася рабіць аперацыі без абязбольвання пры святле газавай лямпы. Памятаю, як у снежні 1943 года мне давялося рабіць аперацыю штурману самалёта, які прывёз з Вялікай зямлі тол для брыгады. Самалёт быў атакаваны і загарэўся. Экіпажу ўдалося выратавацца. Цяжка параненага штурмана Васіля Паўлавіча Пастэрнака даставілі ў шпіталь. Трэба было выцягнуць мноства асколкаў са спіны і пазваночніка. Я здзіўлялася вытрымцы гэтага мужнага чалавека, які ў час аперацыі нават не стагнаў. І такіх прыкладаў было шмат. Адзіным абязбольваючым сродкам былі словы: «Мілы, дарагі, родны, пацярпі».

Перавязачны матэрыял нам дастаўлялі самалётамі з Вялікай зямлі, а таксама прыносілі сувязныя, якія даставалі іх у варожых шпіталях. Але часта гэтага перавязачнага матэрыялу не хапала. Тады даводзілася выкарыстоўваць занавескі, навалкі, кашулі, якія ашчадна апрацоўваліся і стэрылізаваліся. У нас існаваў маленькі партызанскі спіртзавод — самагонны апарат, з дапа-

могай якога мы атрымлівалі спірт градусаў 90. Сяляне в. Жэрына па майму чарцяжу зрабілі шыны для імабілізацыі раненых касцей. Хірургічных інструментаў было мала — яны ўсе змяшчаліся ў адзіным вялікім стэрылізатары. Былі два біксы, два латкі, самавар, два вядры, ліхтар, лапаты, тканае палатно, халат. Для аказання першай дапамогі раненым і хворым у медыцынскіх работнікаў шпіталя былі самадзельныя сумкі з наборам медыкаментаў. У шпіталі былі насілкі, зробленыя з сялянскіх посцілак. Быў таксама конь з павозкай на выпадак першай эвакуацыі.

Ішлі баі. Абставіны не дазвалялі эвакуіраваць цяжка параненых. Паводле прапановы камбрыга Л. І. Сяліцкага, у час карных фашысцкіх аперацый у 1943 годзе раненых двойчы хавалі ва ўкрыцці на плывучым востраве Жэрынскага возера. Летам і восенню абслугоўвала тут раненых аперацыйная сястра Аляксандра Апанасаўна Пракаповіч. У гэтай справе ёй дапамагаў партызан Грамадскі. Аляксандра Апанасаўна павінна была перавязваць раненых, карміць іх, мыць і стэрылізаваць бінты. Ежу, медыкаменты, перавязачны матэрыял дастаўлялі ў плывучы шпіталь на лодках з в. Грыбіна. На востраве раненыя знаходзіліся каля двух месяцаў. Дапамагалі ў гэтай справе жыхары в. Грыбіна. Мяне заўсёды здзіўляла, што за такі даволі працяглы час існавання шпіталя на востраве не знайшлося здрадніка, які б выдаў немцам месца яго знаходжання.

Пасля чарговага рэйду наша брыгада вярнулася на сваю базу ў в. Грыбіна. Я адразу паплыла на лодцы да раненых. Трэба было бачыць, з якой радасцю сустракалі мяне раненыя. Гэта было для іх збаўленне ад трывог і хвалявання за свой лёс. Хутка раненых перавезлі ў в. Грыбіна.

Мне даводзілася прымаць удзел у многіх баявых аперацыях партызанскай брыгады імя К. С. Заслонава ў якасці ўрача. Я добра страляла з пісталета, на поясе заўсёды насіла гранату-лімонку. Не аднойчы маё жыццё падвяргалася смяротнай небяспецы. Але тады аб гэтым я нават не думала. У канцы сакавіка я цяжка захварэла на сыпны тыф, і мяне адправілі на самалёце ў тыл.

Шмат год прайшло з часоў Вялікай Айчыннай вайны. Але я яскрава памятаю ўсіх выратаваных мной раненых партызан, увесь медперсанал шпіталя, а таксама добрых людзей — мясцовых жыхароў, якія дапамагалі нам у выратаванні людзей, у справядлівай барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

## Боль сэрца нязгасны

Чацвёрты партызанскі атрад брыгады «Дубава», якім я камандаваў, вёў баявыя дзеянні на тэрыторыі Чашнiччыны. Наша падраздзяленне базіравалася ў раёне в. Неўгадава і Кушняроўка. Адсюль ішлі на чарговыя аперацыі супраць ненавіснага ворага.

Так было раніцай 9 сакавіка 1944 г. Напярэдадні ў атрад паступіла паведамленне, што ў напрамку в. Вішанькі павінна прайсці воінскае падраздзяленне ворага. Рашэнне з'явілася адразу: падрыхтаваць непадалёку ад вёскі засаду і нанесці па фашыстах удар.

На аперацыю адправіўся баявы авангард атрада. Кіраваць дзеяннямі прыйшлося мне.

Прытаіліся на ўскрайку хваёвага лесу, які, на жаль, да сённяшняга дня не захаваўся. Пачалі чакаць. А каб ведаць, з якімі сіламі давядзецца змагацца, паслалі некалькі партызан у разведку.

Вярнуліся яны хутка, далажылі, што ў нашым напрамку рухаецца калона немцаў, шлях якой «расчышчае» ўдарная разведвальная група.

Трэба сказаць, што да таго часу немцы, добра навучаныя партызанамі, адразу ў лес соваца баяліся. Вось і тут адправілі наперад невялікі атрад.



Б. П. Звонаў

Мы прыкінулі свае магчымасці і вырашылі: уступіць у бой з фашысцкім авангардам, захапіць «языка» і адысці.

Вось і нямецкія разведчыкі паказаліся на дарозе. Прапусцілі мы іх крыху наперад. І адкрылі агонь. Страляць стараліся, як кажуць, рэдка ды метка, бо боепрыпасаў не хапала. Упаў адзін варожы салдат, другі.

«Ура!» — крыкнуў хтосьці з партызан. Кліч падхапілі. Як заўсёды, вызначыліся ў баі браты Генадзь і Васіль Плігаўкі, Фёдар Несцяроў, Міхаіл Багрэц.

Немцы не вытрымалі націску, пачалі адступаць, пакідаючы забітых. Вынікам той схваткі было дзесяткі са два знішчаных фашыстаў і два «языкі».

Аднак, як гэта часта здаралася ў тыя нялёгкія дні, партызанская наша ўдача не далася без страт. Загінуў адзін партызан, некалькі чалавек параніла.

І ўсё ж самая жудасная, страшная вестка прыйшла ў атрад, які адступіў на месца пастаяннай дыслакацыі, праз некалькі дзён. Мірным жыхарам в. Вішанькі люты вораг адпомсціў за партызанскую вылазку.

Як сціснуліся нашы сэрцы, калі мы даведаліся, што немцы спалілі Вішанькі, забілі дзесяткі жанчын, старых, дзяцей.

Даўно закончылася вайна. Але не зарастаюць сцяжынкі да месц, памятных для нашага народа з тых далёкіх, грозных гадоў. Вось і ў Вішаньках адкрыўся мемарыяльны знак. Гэта знак нашай святой памяці.

*Б. Звонаў*

## Змагаліся сем'ямі

Каля 30 партызанскіх сем'яў пражывала ў раёне. Кожнае свята яны дружна збіраюцца на вуліцах і плошчах, ля школ, ля брацкіх магіл, каб ушанаваць памяць аб загінуўшых.

Цяжка пералічыць тое, што прыйшлося перажыць гэтым сем'ям: пакуты, жахі, нястачы, смерць дарагіх людзей. Трывога за сваіх родных і блізкіх ні на хвіліну не пакідала гэтых людзей.

І ўсё ж маладосць, прага да жыцця бралі сваё. Было каханне, была надзея



В. Г. і М. Н. Белюковы



А. І. і В. М. Папко

на будучае. І гэта дапамагло ім выжыць, выстаяць у цяжкія гады вайны, захаваць лепшыя чалавечыя якасці.

Партызанскія сем'і аказаліся надзвычай трывалымі. Ветэраны не маглі ўспомніць выпадку, калі б такія сем'і распадаліся. Спагадлівасць, дабрыня, добразычлівасць, моцнае сяброўства аб'ядноўвалі гэтыя сем'і паміж сабой, іх агульнае цяжкае мінулае і памяць аб загінуўшых у гады вайны сябрах і таварышах.

Былы баявы камандзір атрада брыгады «Дубава» Барыс Паўлавіч Звонаў пасля вайны працаваў у савецкіх, партыйных і гаспадарчых органах. Узнагароджаны ордэнам Леніна. Яго жонка Лідзія Платонаўна — заслужаная настаўніца БССР.

Вялікі баявы і працоўны ўклад сям'і Белюковых — Віктара Гаўрылавіча і Марыі Нікіфараўны. Многа год працавала медыцынскай сястрой Марыя Нікіфараўна. Разважлівая, жывая і рухавая, яна была адначасова і спачувальнай, і патрабавальнай. Не злічыць, колькі чалавечых жыццяў выратавала яна ў гады вайны і ў пасляваенны час.

Вядомымі і паважанымі ў Чашніках з'яўляюцца сем'і Кірыла Пятровіча і



В. А. Захарчанка і яго жонка (уверсе)



Дз. І. і Л. С. Рыпакі



І. С. і Я. І. Белавусавы

Вольгі Аляксандраўны Чэпікаў, Пятра Іванавіча і Вольгі Мікалаеўны Мурасіных, Міхаіла Мітрафанавіча і Марыі Пятроўны Шыян, Івана Ягоравіча і Надзеі Емяльянаўны Алісіевічаў, Івана Сямёнавіча і Ядвігі Ісакаўны Белавусавых, Аляксандра Мацвеевіча і Марыі Сямёнаўны Шнітко, Дзмітрыя Ігнатавіча і Любові Сямёнаўны Рыпакоў, Аляксандра Кірылавіча і Ніны Андрэеўны Непляховічаў, Мікалая Сямёнавіча Лемеша і заслужанай настаўніцы БССР Кацярыны Сямёнаўны Лісоўскай, Архіпа Іларыёнавіча і Веры Міхайлаўны Папко, Станіслава Іосіфавіча і Любові Сцяпанаўны Стомаў, Міхаіла Мартынавіча і Зінаіды Фёдараўны Дзятлоўскіх, Усевалада Сцяпанавіча і Фядоры Барысаўны Аўтуковых, Івана Іванавіча і Лідзіі Фёдараўны Пазнякоў, Фёдара Міхайлавіча і Ганны Васільеўны Радзіёнавых, Якава Міхайлавіча і Антаніны Рыгораўны Галузаў, Ніканора Георгіевіча і Хрысціны Сідараўны Баркевічаў і інш. Кожная сям'я – гэта цэлая гісторыя жыцця і барацьбы.

Былі і вялікія партызанскія сем'і. Так, партызанская сям'я Арцёма Іванавіча і Лукер'і Селівееўны Пазнякоў з в. Пачаевічы складала 11 чалавек. На ўвесь свет вядома партызанская сям'я Нікіфара Цярэнцьевіча Рыдлеўскага. Яго здымак з дзвюма дочкамі Вольгай і Зінаідай змяшчаўся ў шматлікіх выданнях аб партызанскім руху Беларусі. Цікавая гісторыя партызанскай сям'і Івана Сяргеевіча і Пелагеі Пііліпаўны Чыжыкаў.

*Н. Кіндзяева*

## Сям'я Пазнякоў з в. Пачаевічы

У Арцёма Іванавіча і Лукер'і Селівееўны было 8 дзяцей – 4 дзяўчынкі і 4 хлопчыкі. Толькі старэйшая дачка Вера паспела да вайны выйсці замуж і паехала ў Ленінград. Радаваліся



І. А. Пазняк



А. А. Пазняк

бацькі нараджэнню першага ўнука Валодзі. Але ў хуткім часе дайшла да бацькоў трагічная вестка – у Фінляндыі загінуў муж дачкі. У пачатку вайны Вера з трохгадовым сынам Валодзем прыехала да бацькоў у Пачаевічы.

Сын Ілля, які пайшоў на армейскую службу ў 1940 г., у пачатку вайны трапіў у нямецкі палон. Цудам яму ўдалося ўцячы. Пасля доўгіх блуканняў Ілля прыйшоў у бацькоўскі дом, а ў 1942 г. пайшоў у партызанскую брыгаду «Дубава».

Аднойчы веснавой раніцай 1943 г. да дому Пазнякоў на конях пад'ехалі паліцаі. Яны ўсё перашукалі ў доме, пагражалі гаспадарам, а потым, пагрузіўшы ўсё лепшае на фурманкі і забраўшы карову, цялушку, свіней, авечак, курэй і гусей – усё, што было ў гаспадарцы і з чаго ў гэтыя цяжкія гады жыла сям'я, паехалі ў Чашнікі.

Адзін з паліцаяў цішком паспеў шапнуць Арцёму Іванавічу: «Бацька, калі цябе цяпер не возьмуць, то хутчэй уцякай з дому, бо заўтра будзе ўсім «капут».

Ноччу ўпотай уся сям'я Пазнякоў пакінула дом і накіравалася да в. Ляхавічы. Ад Іллі было вядома, што ў гэтай вёсцы Лепельскага раёна размяшчаўся штаб брыгады «Дубава».

У розныя атрады былі залічаны Люба, Раман, Іван і Таццяна. Разам з кулямётчыкам Іллёй байцамі партызанскай брыгады «Дубава» былі 5 чалавек

сям'і Пазнякоў. Пры шпіталі працавалі бацька і маці, з імі была дачка Вера з маленькім сынам Валодзем, а таксама непаўналетнія Аляксандр і Надзя.

Колькі давялося пераажыць сям'і ў гады вайны – не пералічыць. Хваляваліся не толькі за сябе і сваё жыццё, а за ўсіх 11 чалавек з сям'і, якім амаль кожны дзень пагражала небяспека.

Аднойчы ля в. Акольнікі на варце стаяў Іван Пазняк. Разам з другім партызанам яны з даху хлява назіралі за дарогамі. Іван не заўважыў, як з процілеглага ад яго боку падышлі немцы. Другі вартавы, убачыўшы немцаў, кінуўся наўцёкі. Калі Іван пачуў нямецкую гаворку, уцякаць ужо было позна. Можна было б перачакаць, калі немцы пойдуць з хаты назад. А раптам яны захочуць зайсці ў хлеў і адразу ўбачаць Івана? Не, трэба нешта рабіць. Улучыўшы момант, Іван па-пластунску выбраўся з хлява і папоўз у бок лесу. Ужо на гарушцы, падняўшыся на ногі, ён пабег. Немцы ўбачылі яго і пачалі страляць. І невядома, як бы ўсё скончылася, калі б на выратаванне не падаспеў брат Ілля. Даведаўшыся ад партызана, які прыбег у атрад, аб здарэнні, Ілля накіраваўся на кані да в. Акольнікі. На поўным скаку ён падхапіў на сані Івана і паімчаўся ў лес, куды немцы пабаяліся ісці.

Усім членам сям'і прыйшлося перажыць блакаду на воз. Палік. Тут загінуў галава сям'і Арцём Іванавіч, які



Т. А. Пазняк

на фурманцы ехаў разам з Лукер'яй Селівееўнай, дачкой Надзеяй і ўнукам Валодзем. Калі пачалася бамбёжка, ён схаваў усіх ва ўкрыцці, а сам пайшоў паглядзець каня. У гэты час побач узарвалася бомба.

Усіх членаў сям'і Пазнякоў вылучала дасціпнасць, працалюбства, паважлівасць да людзей, а таксама вялікае сяброўства паміж сабой.

*Н. Кіндзяева*

## Сям'я Чыжыкаў з в. Зазерыца

### З расказа Марыі Нікіфараўны Белюковай

У пачатку вайны настаўнік Цяпінскай школы Іван Іванавіч Чыжык наладзіў сувязь з партызанамі, а ў 1942 годзе пайшоў у партызанскую брыгаду «Дубава».

У маі ў в. Зазерыца, дзе жылі бацькі партызана, нечакана прыбыў атрад карнікаў. Яны сабралі ля дома Чыжыкаў усіх жыхароў вёскі. З аднаго боку вясковай вуліцы паставілі ў рад жанчын з дзецьмі, з другога – мужчын. Немец пры дапамозе перакладчыка пачаў гаварыць. Ён паведаміў спалоханым жыхарам, што будзе ўчынена расправа над партызанскай сям'ёй Чыжыка Івана Сяргеевіча, бо іх сын бандыт, партызан. Немец паведаміў, што такі ж лёс напаткае кожную партызанскую сям'ю. Далей ён сказаў, што калі жыхары вёскі будуць дакладваць нямецкім уладам аб сувязях з партызанамі, то вёску нішчыць не будуць, а спаляць толькі хату Чыжыка. Усе пачалі прасіць не паліць хату Чыжыка; ад яе загарыцца ўся вёска, бо пабудовы размешчаны блізка адна ад адной. Тады карнікі забралі і пагрузілі на фурманку лепшую маёмасць, а ўсё астатняе ў доме разбілі, палама-

лі, нават печ разбурылі. Да фурманкі прывязалі карову, пасадзілі гаспадыню дома Пелагею Піліпаўну. На другую фурманку сеў стараста вёскі Восіп Карага, якому якраз выпала чарга выконваць гэтыя абавязкі. Немцы далі яму пакет і загадалі везці ўсё ў Чашнікі.

...Калі фурманкі наблізіліся да в. Цяпіна, Пелагея Піліпаўна рашуча прыпыніла каня і злезла з фурманкі. На здзіўленае пытанне старасты: «Ты што, Пелагея, куды ты?» — цвёрда адказала: «Ты як хочаш, Восіп, а я ўцяку». Напалоханы стараста пачаў упрошваць Пелагею, каб яна не ўцякала, бо немцы яго за гэта расстраляюць. «Ты, Восіп, вязі пакет,— сказала Пелагея Піліпаўна,— дабро наша, карову. Здай усё там немцам, а калі стануць пытацца пра мяне, то адкажы, што трэба было б даць ружжо, тады б жанчына не ўцякла». Так і дамовіліся.

А ў гэты час у вёсцы непаўналетніх Дуню і Нэлю забралі да сябе суседзі. Старэйшая Маша пабегла да возера і там схавалася. Залезла ў сцюдзёную ваду, а галоўку схавала ў нахіленым над вадой лазняку. Калі б яе знайшлі там, то ў дзяўчынкі, як яна аб гэтым пазней расказала, быў намер утапіцца, але не трапіць жывой у рукі ворага.

Доўга і ўпарта шукаў Машу паліцай, клікаў яе, але ні з чым вярнуўся ў вёску. Маша з цяжкасцю выйшла на бераг, бо ад халоднай вады ўся здранцвела. Добра, што якраз у гэты час вудзіў на возеры рыбу селянін з в. Камінічына. Ён і перавёз дзяўчынку на лодцы ў сваю вёску, адкуль яна потым дабралася да партызан, сустрэлася з роднымі.

Гаспадара дома Івана Сяргеевіча Чыжыка зачынілі ў хаце, паставілі вартавога з кулямётам. Мабыць, хацелі дачакацца ворагі сына Івана Сяргеевіча з партызанскага атрада. Але ноччу п'яны паліцай задрамаў. Іван Сяргеевіч ціхенька выпаўз з дому і пайшоў у партызанскі атрад «Дубава», дзе потым сустрэўся з Пелагеяй Піліпаўнай і дачкой Машай. У неверагодных абставінах усе члены сям'і Чыжыкаў засталіся жывымі.

## У партызаны ўсёй сям'ёй (Гісторыя аднаго фотаздымка)

Калісьці гэты здымак абышоў многія газеты і часопісы, публікаваўся ў замежных выданнях. Экспануецца ён і ў Дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны ў Мінску. Надпіс гаворыць, што гэта партызанская сям'я Рыдлеўскіх — Нічыпар Цярэнцьевіч з дочкамі Вольгай і Зінаідай.

Да вайны сям'я Рыдлеўскіх жыла ў в. Чарэя. Нічыпар Цярэнцьевіч працаваў старшым конюхам калгаса «Колас», дочкі вучыліся ў школе, два сыны служылі ў арміі. Маці памерла рана. Вольга скончыла 9 класаў, Зіна — 7, калі пачалася вайна.

Рыдлеўскія хутка адчулі, што такое «новы парадак». Як толькі пачулі аб першых дзеяннях партызан, бацька з дочкамі падаўся ў лес. Нічыпар Цярэнцьевіч, стары кавалерыст, стаў ад'ютантам намесніка камандзіра Сенненскай партызанскай брыгады. Мясцовасць ён ведаў выдатна і ў час аперацый дакладна выводзіў партызан у патрэбны раён. Вольгу з першых дзён накіравалі ў санітарны ўзвод. Навучылася рабіць перавязкі, аказваць першую медыцынскую дапамогу параненым. Зіну залічылі ў стралковае падраздзяленне.

Неўзабаве Вольга Рыдлеўская атрымала першае баявое хрышчэнне. Вось што ёй запомнілася:

— Наш атрад імя Кутузава брыгады Лявонава прымаў удзел у нападзе на гарнізон у Халопенічах. Поўнасцю разграміць яго не ўдалося, адступалі пад агнём. Мне было страшна. І раптам пачула: «Санітары!». Кінулася на голас і ўбачыла параненага партызана. У бядры глыбока засеў асколак міны. Пінцэтам яго намацала і выцягнула. Тут бы



Сям'я Рыдлеўскіх

адразу перавязку зрабіць, ды прыбег нехта з камандзіраў: «Адыходзьце, праз некалькі мінут тут немцы будуць». І мы неслі параненага пад агнём, пакуль не выбраліся з небяспечнай зоны. Там я яму наклала павязку. Дарэчы, той партызан, першы у маім жыцці паранены,— Аляксей Бурко. Потым ён далечваўся на Вялікай зямлі, цяпер жыве ў в. Гара, у трох кіламетрах ад Чарэі. Інвалід вайны. Мы з ім пастаянна падтрымліваем сувязь. Той бой і кроў быццам парадніліі нас.

Потым Вольга ўдзельнічала ў разгроме фашысцкага абозу, у «рэйкавай вайне», перажыла найцяжэйшую блакаду на Паліку.

Зіна ў партызанах стала стралком, але вінтоўка, якую ёй выдалі, была вялікаватай. Калі несла яе на рамяні, прыклад ледзь не па зямлі валачыўся. Але скідкі на ўзрост не прымала, удзельнічала ва ўсіх аперацыях разам са сваім узводам.

І вось настаў дзень вызвалення раёна. Калі партызаны Сенненскай брыгады злучыліся з перадавымі часцямі Чырвонай Арміі, Нічыпар Цярэнцьевіч з гонарам выканаў апошняе баявое заданне. Добра ведаючы родныя мясціны, ён глухімі дарогамі правёў групу танкаў у тыл ворага. У канцы чэрвеня 1944 г. Нічыпар Цярэнцьевіч з дочкамі пры зброі дабраліся да сваёй вёскі. Разлічвалі ўбачыць родны дом, а засталі толькі папялішча. У гэты час у двор забег малады афіцэр з фотаапаратам на грудзях, прадставіўся франтавым карэспандэнтам і тут жа нацэліў аб'ектыў.

— Але яму штосьці не спадабалася ў тым, як мы стаім,— успамінае Вольга Нічыпараўна.— І ён выстраіў нас у шарэнгу па ўзросту. Я была падперазана кулямётнай стужкай, дык карэспандэнт павесіў мне яе цераз плячо. Выгляд у нас на здымку вясёлы, бадзёры, але, шчыра кажучы, было не да весялосці. Падвор'е разгромлена, абжывацца трэба было на голым месцы.

Як жа склаўся далейшы лёс сям'і? Сыны Нічыпара Цярэнцьевіча Рыдлеўскага Аляксандр і Уладзімір загінулі на вайне. Пасля вайны Нічыпар Цярэнцьевіч працаваў у калгасе, хоць меў ужо каля сямі дзесяткаў год. У тыя цяжкія часы аднаўлення патрэбны былі і яго ўмелыя рукі. Памёр ён у 1957 г.

Вольгу Нічыпараўну накіравалі ў

распараджэнне Брэсцкага аблвыканкома, 35 год працавала яна ў аддзеле сацыяльнага забеспячэння. А Зінаіда Нічыпараўна, скончыўшы пединстытут, настаўнічала ў Ашмянскім раёне. Удастоена звання «Заслужаны настаўнік БССР».

Вось аб чым нагадала фатаграфія ваенных год карэспандэнта Аляксандра Іванавіча Станавога.

*Н. Кіндзяева*

## На пачатку...

### З успамінаў Леаніда Станіслававіча Дамброва, былога настаўніка Кушняроўскай школы



Л. С. Дамброў

Напярэдадні вайны я, тады семнаццацігадовы хлопец, толькі ўладкаваўся працаваць на вагонарамонтны завод імя Мяснікова ў Мінску.

У пачатку вайны наш завод разбамбілі. Загінула вялікая колькасць рабочых, якія якраз у час бамбёжкі ратаваліся ў бомбасховішчы завода. Я пешшу за 2 дні прыйшоў з Мінска ў родную в. Кушняроўку, што цяпер для мяне здаецца неверагодным, бо прыйшлося адмераць каля 180 км.

Аднойчы ў кастрычніку 1941 г. у нашу хату зайшоў знаёмы ляснік. Ён паведаміў, што сустрэўся ў лесе з нейкім чалавекам, які пажадаў убачыцца з камуністамі ці камсамольцамі вёскі. Вырашылі пайсці да старшыні калгаса Анатоля Адамавіча Куляшова, каб параіцца, што рабіць. Той згадзіўся на сустрэчу, якая ў хуткім часе адбылася.

Як высветлілася, гэта быў Рыгор Мацвеевіч Лінькоў, якога закінулі ў тыл ворага для правядзення дыверсійных актаў. Разам з ім прыбыло 18 чалавек — цэлая дыверсійная група. Пры сустрэчы і знаёмстве Анатоль Адамавіч выказаў жаданне далучыцца да групы Лінькова. Але той катэгарычна запярэчыў, сказаў, што ён павінен заставацца ў вёсцы, даць згоду стаць старастам, каб зблізіцца з мясцовымі ўладамі і больш дасканала разведваць планы і намеры ворага. Але Лінькоў не ўлічыў гарачыні натуры і непрымірымасці да ворага Куляшова, што потым прывяло да трагедыі.

У час арганізацыйнага перыяду мне прыходзілася па заданню Лінькова здабываць зброю. У фурманцы рабілі двайное дно, куды і хавалі зброю, якую я прывозіў з Чашнікаў. Ездзіў я да Івана Яфімавіча Саламонава, які перадаваў у атрад па 2—3 ружжы, а аднойчы давялося везці нават 8 штук. Дзе ён іх браў, мне было невядома. Але везці небяспечны груз, асабліва праз Чашнікі, было страшна. Прывозіў я і звесткі аб варожых умацаваннях, узбраенні і колькасці немцаў і паліцаяў у Чашніках. Гэтыя звесткі перадавалі мне С. Л. Сябежка, удзельнік грамадзянскай вайны, і Ганна Фядотава. Яны працавалі ў нямецкай управе.

Хачу адзначыць, што многа патрыётаў загінула ў першыя гады вайны з-за таго, што не выконвалі працейшых патрабаванняў канспірацыі. З-за гэтага загінуў і наш Анатоль Адамавіч Куляшоў. Нянавісць да ворагаў, асабліва да здраднікаў-паліцаяў, у яго прарывалася часам адкрытымі выказваннямі. А аднойчы Анатоль Адамавіч учыніў нават натуральную бойку з паліцаямі, якія па нейкай неабходнасці прыехалі ў вёску. Усе вяскоўцы разумелі, што такія неасцярожныя паводзіны іх былога старшыні калгаса рана ці позна

скончацца для яго трагічна, папярэджвалі Анатоля Адамавіча аб гэтым. Ён і сам разумеў, але не заўсёды мог сябе стрымаць. Не вельмі ўтойвалася і сувязь з атрадам Лінькова. І, урэшце, здарылася тое, што павінна было здарыцца. Восенню 1942 г. Куляшова арыштавалі. Жорстка здзекаваліся над ім ворагі, асабліва паліцаі, якіх ён, яны ведалі, зневажаў за іх здрадніцтва. Яго білі да беспрытомнасці, а потым раз'юшаныя ворагі выкалалі яму вочы. Аб катаваннях ворагаў і аб сваёй стойкасці ён напісаў у турме верш, які потым невядомымі шляхамі дайшоў да нас, яго таварышаў. На жаль, верш гэты мы перадалі ў штаб брыгады Лінькова, і дзе ён цяпер — невядома. Людзі, якія сядзелі ў адной камеры з Куляшовым, расказвалі, што ўрыўкі з яго верша былі напісаны на сценах камеры. У канцы 1942 г. паўжывога Анатоля Адамавіча немцы расстралялі.

Праз нейкі час арыштавалі і мяне. У чашніцкай турме кожны дзень мяне дапытваў сам начальнік паліцыі Цяслёнак. Ён ставіў мяне да сцяны, нацэльваў у мой бок наган і пытаўся, дзе партызаны, колькі іх. Пагражаў, што са мной ён зробіць тое ж, што зрабілі з Куляшовым — расстраляе, як сабаку.

Пасля таго, як мяне цудам выпусцілі з турмы, я зразумеў, што заставацца ў роднай вёсцы небяспечна. У пачатку 1943 г. я пайшоў у партызанскую брыгаду «Дубава», дзе ваяваў да вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

*Падрыхтавала да друку Н. Кіндзяева*

### З успамінаў партызана атрада «Сібірак» Алега Сцяпанавіча Залескага

Дыверсійна-падрыўная група партызан, у складзе якой былі Аляксандр Бабянцоў, Аляксандр Зайцаў, Алег Залескі, Аляксандр Шалыгін і іншыя, вярталася на сваю базу. Заданне — узарваць мост на 116-м кіламетры чыгункі Орша — Лепель, што каля в. Іканкі, было паспяхова выканана.

Непадалёк ад в. Бельнякі іх дагнала машына з фашыстамі. Завязаўся няроўны бой. Хутка ў партызан скончыліся боепрыпасы, і яны вымушаны былі праз балота, а потым па р. Усвейцы прабірацца ў бок в. Камянец да лесу. У баі быў цяжка паранены кулямётчык Саша Зайцаў. Пазней яго падабралі жыхары в. Бельнякі. На наступны дзень ён памёр ад ран у доме Валянціны Канстанцінаўны Ашурак і быў пахаваны на мясцовых могілках (пазней яго перазахавалі на брацкіх могілках у в. Замачак).

Атрымалі раненні Аляксандр Бабянцоў і я. Таварышы выратавалі мяне — на руках аднеслі ў лес, потым на партызанскую базу.

Аляксандр жа Бабянцоў, паранены ў абедзве нагі, імкнуўся выратавацца самастойна. Ён па р. Усвейцы даплыў да в. Замачак і па трыснягу дапоўз да воз. Зяленец. Беспрытомнага, яго знайшлі жанчыны, якія прыйшлі мыць бялізну. Яны перавязалі яму раны і схавалі ў лазні, кармілі і даглядалі. Але знайшоўся здраднік, які выдаў немцам партызана. Яго схапілі, павезлі ў гарнізон у Чарэю. Пасля жорсткіх допытаў Аляксандра Бабянцова расстралялі ва ўрочышчы «Дубнікі».

## Са школай назаўсёды

**Многія гады жыхары в. Чарэя з удзячнасцю ўспамінаюць Валю Махрову, якая да вайны вучылася ў мясцовай школе.**

**— Яна вызначалася нейкай выключнай чалавечай прыцягальнасцю, — расказвае старэйшая настаўніца Чарэйскай СШ А. В. Бобрыкава. — Гэта была цэльная і мэтанакіраваная дзяўчынка. Яна добра вучылася, з адказнасцю адносілася да грамадскай работы, захаплялася музыкай.**

**Час сцірае індывідуальныя рысы асобы. І з гадамі ў памяці на першы план выступае тое, што характэрна ў цэлым народзе, — непадзельнае, агульнае, незабыўнае.**

Трэці дзень у Чарэі гаспадарылі фашысты. Трывожна было на сэрцы ў Валі Махровай. Непасільны цяжар нава-



Валя Махрова

ліўся на яе. Хіба сядзела б яна тут, калі б не дзеці. Іх не кінеш. За ўвесь дзіцячы дом цяпер яна ў адказе. Так ужо атрымалася, што дырэктара дзіцячага дома ў першыя ж дні вайны мабілізавалі ў армію. Пайшлі на фронт і выхавальнікі. Пры набліжэнні захопнікаў эвакуіраваць малых не ўдалося.

Сонца павярнула з поўдня, калі Валя выйшла з вёскі. Захацелася хоць крыху пабыць адной, развеяць цяжкія думкі. Яны не выходзілі з галавы.

...Дзіцячы дом. Зусім маленькай трапіла сюды Валя. Выхавальнікі замянілі ёй бацькоў, а братамі і сёстрамі сталі такія ж, як і яна, хлопчыкі і дзяўчынкі. Хутка ляцелі гады. Вось яна ўжо школьніца, піянерка. З цягам часу чырвоны гальштук замяніў камсамольскі значок. Пасля заканчэння сямігодкі прапанавалі ехаць вучыцца. А як успомніла, што трэба разлучыцца з дзіцячым домам, са сваімі выхавальнікамі, з усім, што дарага і блізка, нейкая незразумелая туга ахапіла яе. Так і засталася. Прызначылі яе, пятнаццацігадовую, выхавацелькай у самай малодшай групе...

...Думкі перапыніў глухі стогн. Спынілася. Невялічкая лагчына, парослая хмызняком, разразала жытнёвы палетак.

Палахліва азірнулася. Нікога. Прама перад ёй невялічкі кусцік. За ім убачыла чалавека. Зямлістага колеру твар, шырока раскінутыя рукі. Калі б не стагнаў, можна было палічыць за мёртвага.

«Паранены чырвонаармеец? — пранеслася думка. — Але што рабіць з ім? У вёсцы ж немцы. Хіба схаваць яго ў дзіцячым доме? Вось толькі адной не ўправіцца».

Падклаўшы раненаму пад галаву падсумак, Валя подбегам заспяшалася ў вёску. Прыхапіла збанок з вадой, сякітакі харч, паклікала шасцікласніка Сярожу Сямёнава і рушыла зноў у поле. Вось і паранены. Дзяўчына нахілілася над ім, прыўзняла галаву. Той папрасіў піць. Валя напаіла чырвонаармейца, перавязала яму рану.

Прыцемкам дабраліся да дзіцячага дома. Ніхто чужы не заўважыў. Мікалая ўладкавалі на гарышчы дома. Патрэбны былі медыкаменты, вопратка. Старэйшым дзецям Валя адкрыла гэту тайну, малодшым рашылі нічога не гаварыць.

А тут новыя клопаты. Прадукты канчаюцца. Ды і аб дзецях трэба падумаць.

Па бліжэйшых вёсках размясцілі самых маленькіх. Старэйшыя пакуль трымаліся разам. На ўсякі выпадак запасаліся прадуктамі. Капалі бульбу, збіралі агародніну.

Восенню пайшлі чуткі, што паблізу дзейнічаюць партызаны. Дайшла навіна і да дзіцячага дома. Як узрадаваліся ёй! Валя цяпер ведала, што рабіць. Разам са старэйшымі хлапчукамі пачала збіраць зброю, патроны. Хутка да кулямёта, які яшчэ раней знайшлі і захавалі, дабавілі некалькі вінтовак, скрынкі з патронамі, гранаты. Марыла аб хуткай сустрэчы з народнымі мсціўцамі.

Дапамог выпадак. Аднойчы былая настаўніца Настасся Фандо са сваёй сяброўкай Агаф'яй Фанчанка сустрэлі ў Заборскім лесе камандзіра партызанскага атрада Васіля Шчукіна. Настасся Мікітаўна і пазнаёміла Валю з ім. Неўзабаве выхаванцы дома пад кіраўніцтвам Махровай пераправілі ў лес зброю. Мікалай ужо ачуняў і таксама падаўся ў атрад. То ў адным, то ў дру-

гім месцы партызаны наладжвалі засады. Фашысты ўстрывожыліся. Правяралі ледзь не кожнага, хто прыходзіў у Чарэю. Аднойчы Валя з Сяргеем Сямёнавым вярталіся з атрада. Цяпер яны ў лес хадзілі разам. Валі падабаўся гэты кемлівы хлапчук. Ля вёскі іх сустрэў нямецкі патруль.

Фашысты і слухаць не сталі тлумачэнні Валі, павялі ў камендатуру. Камендант, хударлявы, з халоднымі вачыма, пачаў допыт. Хто, адкуль, чаго хадзілі ў лес? І хоць версія з цёткай быццам і дапамагла, але паспытаць фашысцкіх бізуноў давялося.

Валя зразумела, што ў дзіцячым доме ёй больш нельга заставацца, і назаўтра перабралася ў атрад.

Партызаны рашылі змяніць стаянку, але не паспелі. Цэлы батальён эсэсаўцаў акружыў лес. Давялося прарывацца з боем. Некалькі чалавек было паранена, двое — цяжка. Неабходны медыкаменты. А дзе дастаць?

Валя пераканала камандзіра атрада, што ў Чарэі ў яе ёсць знаёмы аптэкар, што яна непрыкметна ноччу да яго прабярэцца, а раніцай вернецца з медыкаментамі.

Дамовіўшыся аб месцы сустрэчы, дзяўчына рушыла ў Чарэю. Позна вечарам пастукала ў хату да аптэкара. Той выслухаў яе просьбу і сказаў, што да раніцы ўсё падрыхтуе.

Ноч яна рашыла прабыць у дзіцячым доме. Там жа ўсе свае. Аднак здарылася, што на досвітку фашысты нечакана акружылі дзіцячы дом, дзяцей выстраілі ў калідоры. Сярод іх была і Валя.

У руках афіцэр трымаў яе фотаздымак. Дзяўчына зразумела, што цяпер наўрад ці ўдасца выбрацца. І сапраўды яе затрымалі. Арыштавалі і Сяргея Сямёнава. На допыце камендант хацеў даведацца аб месцы дыслакацыі партызан, іх колькасці, узбраенні.

А калі фашысты не дачакаліся адказу, пачалі катаваць. Валя, сцяўшы зубы, маўчала. Часам траціла прытомнасць. Яе аблівалі вадой.

Вечарам непрытомную кінулі ў склеп школьнага дома. Назаўтра ўсё пачалося зноў. Пагрозы, катаванні чаргаваліся адно за адным.

Доўга дапытвалі дзяўчынку фашысты, але не пачулі ні слова. Вечарам партызанку расстралялі.

Так загінула адважная камсамолка. А праз некаторы час сярод былых дзетдомаўцаў і вясковай моладзі з'явілася песня аб юнай гераіні Валі Махровай.

І сёння ведаюць песню аб Валі Махровай, якую склалі дзеці дзіцячага дома пасля яе смерці:

По песчаной Замковой дороге
Нашу Валю вели на расстрел,
Но не спрятали звери в берлоге
Ее имя — отряд уцелел.
    Пусть закрылися карие очи,
    Пусть умолк ее голос весны,
    Но фашистам ни днем и ни ночью
    Не давали покоя они.
Не ищите в море погоды!
Смерть фашистам за Валю! И в бой
Вася Щукин и Коля Свободный
Унесли пулеметы з собой.
    А живая Махрова в полночи
    Поднималась, как буря во мгле,—
    И искрилися карие очи,
    И пылал гарнизон на селе.

*Гойтан Уладзімір // Звязда, 19 сакавіка 1972 г.*

## Побратимы (партизанская быль)

В то лето, когда я познакомился с этими мальчуганами, с запада на восток ползли и ползли поезда с фашистскими солдатами и офицерами. К фронту подвозились орудия, танки, самолеты, патроны, снаряды, бензин,— все то, без чего война вдруг бы задохнулась и замерла.

...Тима подошел степенно, вразвалочку. Росточком чуть повыше своей десятизарядной французской винтовки. Волосы черные, как смола, густые, колечками вьются, спускаясь на лоб. Глаза карие, большие, пытливые.

Коля — тонкий, как хворостинка, белокурый, синеглазый, вертлявый.

Оба одногодки. Тимке в апреле, а Коле в мае четырнадцать исполнилось. Оба

пионеры. Тима из детдома. Когда нагрянули фашисты, все дети детдома, который размещался в д. Черея, разбежались по деревням. Ходил, выпрашивал где корочку хлеба, где тарелочку щей. Ночевал в банях, овинах, на сеновалах, но случай свел его с партизаном — дедом Никифором Рыдлевским.

У Коли судьба сложилась иначе. В достатке проходило его детство. Жил он в большом с. Черея. Отец и мать хорошо зарабатывали. Души не чаяли в своем первенце. И даже когда ворвались фашисты, почти ничего не изменилось в доме. Только отец часто уходил куда-то по ночам. Да мать ждала его у окна, тихо всхлипывая. Потом прошел слушок, что он к фашистам переметнулся прислуживать. Она укоряла, стыдила мужа. Мальчишки стали чураться компании с Колей.

Обида душила его, зло на отца все больше копилось в душе. И когда отец в сумерках осеннего вечера тяжело переступил порог и поставил на стол мешочек с немецким пайком, Коля рванулся к двери и убежал из села. Всю ночь он шел и шел напрямик. Спотыкался и падал. Шатаясь от усталости, на рассвете добрел до Приветской пущи и, как убитый, уснул на опушке.

Сторожевой патруль партизан наткнулся на него. Один партизан из Череи узнал в нем сына Алексея Гриня.

Коля рассказал партизанам о своем горе. С мольбой в глазах просился остаться в отряде.

Командир выкурил не одну папиросу, слушая бесхитростный рассказ.

Тиму и Колю усыновил отряд. Полюбились мальчуганы партизанам. Они ходили в разведку, собирали оружие, продукты.

...Стояла промозглая осень. Дождь все моросил. Отряд партизан попал в кольцо карателей. Три дня и три ночи отбивались герои от наседавших со всех сторон врагов. Кончались патроны. И на рассвете Викентий Кацер, командир отряда, послал двух партизан с наказом любой ценой добраться к своим, рассказать, что партизаны держатся. Пусть соседи ударят со стороны ст. Вятны.

Наш разведывательно-диверсионный отряд спешил на выручку окруженным. Светало. Сквозь холодную изморозь выступала деревня, кусты. Фашисты лениво постреливали в сторону окруженных, не подозревая, что за спиной у них 120 автоматчиков.

Бросок был, как вспышка, как выстрел. В ход пошли гранаты, ножи. Наша группа случайно нарвалась на штаб карателей. И тут я увидел растерзанное тело. Судороги пробегали по нему и показалось, что мальчик силится встать. Это был Коля.

...Его схватили вечером, когда до леса оставалось несколько шагов. В жестокой пытке прожил Коля последние минуты жизни, но так и не сказал врагам ни слова.

Он умирал у меня на руках.

Хоронили мы Колю со всеми воинскими почестями на берегу р. Усвейки у д. Толпино Чашникского района Витебской области.

Узнал ли в отряде Коля, что отец его не был предателем? Он выполнял задание партизан и погиб, как герой. Об этом мне поведал наш комбриг через 20 лет после смерти Коли. Если не знал, то зря щемила его детское сердце тоска-обида, зря пылала в нем ненависть к отцу. А может, все-таки знал?

А Тима — Тихон? У побратимов одна судьба. Он погиб в июне 1944 года за два дня до соединения с наступавшими войсками 3-го Белорусского фронта.

У р. Эсса, недалеко от с. Латыголичи Холопеничского района, группа партизан нарвалась на фашистскую засаду. В неравном бою погибло тринадцать партизан. В живых оставались двое. Враги уже бежали к ним, тогда Тима бросился навстречу. Гром прокатился над речкой, загрохотало эхо по лесу. Когда Миша Зайцев, отброшенный под обрыв взрывной волной противотанковой гранаты, пришел в себя, была уже глубокая ночь. Двое суток, раненый и контуженый, он полз лесом, пока у д. Забоенье не встре-

тил партизан. Он и поведал о героической смерти Тимы, подорвавшегося вместе с врагами.

Кто и где похоронил останки юного героя? Этого уже теперь не узнать.

Прошлым летом я бродил по берегу Эссы. Казалось, вот-вот из-за кустов выйдет тот мальчишка с черным, как смоль, колечками вьющимся чубчиком, с карими глазами, с французской десятизарядной винтовкой времен первой мировой войны.

*В. Бекашов*

## Ліст з Алтайскага краю

У Тоўпінскую васьмігадовую школу прыйшоў ліст з Алтайскага краю. У ім выразка з газеты «Восход Алтая», дзе мясцовы журналіст, ураджэнец Чашніцкага раёна У. Р. Бекашоў расказаў аб мужнасці партызанскага разведчыка Мікалая Грыня.

Следапыты школы пачалі пошук. Высветлілася, што Мікалай Прынь, аб якім пісаў У. Р. Бекашоў, — гэта Мікалай Грынь, родам з Чарэі. Хлапчуком ён часта гасцяваў у свайго дзядзькі Цімафея Васільевіча Ліцкевіча ў в. Тоўпіна. Калі пачалася вайна, Колю было 11 гадоў. Разам з сябрамі ён збіраў зброю і прадукты харчавання для партызан, а таксама разведвальныя даныя. Потым і сам стаў партызанам атрада «За Радзіму» брыгады Лявонава. Быў разведчыкам. У. А. Нарушэвіч, які ваяваў у гэтым атрадзе і які жыве зараз у Шуміліне, даслаў па нашай просьбе ліст, дзе нагадваў пра гераічную гібель 14-гадовага Колі Грыня.

Гэта адбылося 19 сакавіка 1944 г. На атрад «За Радзіму», які размяшчаўся ля в. Асяродкі (пазней спаленай фашыстамі), з боку в. Вяцера ішлі карнікі. Насустрач у разведку было паслана трое партызан, адзін з іх — Коля Грынь. У хуткім часе завязаўся няроўны бой. Як відаць, Колю, цяжка параненаму, фашысты выкруцілі рукі, здзекаваліся з яго. Потым нежывога яго падабралі мясцовыя жыхары П. М. Махроў і М. М. Шыбека з в. Тоўпіна, употай ад немцаў пахавалі на вясковых могілках.

І вось дзякуючы успамінам журналіста, лісту алтайскай жыхаркі, пошукам краязнаўцаў школы адноўлены падзеі далёкіх дзён. І настаў час ушанавання памяці юнага партызана-разведчыка. 30 кастрычніка 1986 г. адбылося перазахаванне яго астанкаў у брацкую магілу, што знаходзіцца на беразе р. Усвейка ля в. Тоўпіна. Яшчэ адно імя нашага земляка, які аддаў жыццё за Радзіму, вернута з невядомасці.

## Ішоў камсамольцу семнаццаты...

Віцебск гарэў. Нашы часці пакідалі горад. Па вуліцы, лязгаючы гусеніцамі, прапоўз танк з чорным крыжам на вежы.

Толькі праз месяц інваліду працы Міхаілу Пятровічу Савіцкаму разам з сынам Віцяй удалося пакінуць акупіраваны немцамі горад. У невялічкай в. Паршчэўшчына, ля Чашнікаў, у сваяка Максіма знайшлі яны прытулак. Дваццаць сялянскіх хат прыціснуліся да пушчы, а вакол — балоты, непралазная дрыгва. Рэдка наведваліся туды карнікі, а паліцаі баяліся сунуць нос да пагрозліва сінеўшай пушчы. Часта наведвалі вёску партызаны. Бацька Віці падкоўваў ім коней, рамантаваў зброю, сельскагаспадарчы інвентар. Хто, як мог, плаціў яму прадуктамі.

Для Віці тут было поўнае раздолле. Вясковыя юнакі даверліва прынялі яго ў сваю кампанію. Мары ў іх былі аднолькавыя — пайсці ў партызаны і помсціць праклятым фашыстам. Ды вось бяда, у партызаны іх не бралі: маўляў, яшчэ не дараслі. Зброі таксама не было.

Цэлыя дні праводзілі хлопцы ў пошуках зброі. Знайшлі наган, вінтоўку СВТ з поўнай абоймай і чатыры вінтоўкі без затвораў. Сабралі некалькі тысяч патронаў. Віця знайшоў пашкоджа-

ны аўтамат, а Федзя з Антонам — тры затворы. Рамантаваць аўтамат аддалі Міхаілу Пятровічу.

...Неяк пад вечар паставыя партызаны заўважылі, што з пушчы выйшлі чатыры хлопцы. Яны былі ўзброены, а двое неслі па дзве вінтоўкі за плячыма.

Хлопцаў узялі ў разведку.

Чэрвеньскай ноччу юныя мсціўцы пранiклі ў Багушэўск. І тут ім трапіўся афіцэр палявой сувязі. Фашысту нават і ў галаву не прыйшло, што гэта не паліцэйскі патруль. Ён загадаў даставіць яго да каменданта, якому вёз важны пакет. Віця разам з хлопцамі абяззброілі афіцэра, забралі ў яго пакет і застрэлілі. Пачалі прабірацца ў бок лесу.

На ўскраіне хтосьці пусціў над галовамі хлопцаў аўтаматную чаргу. Пачалася страляніна.

Разведчыкі хутка адарваліся ад ворагаў і павярнулі ў бок в. Пясчанкі. Было відавочна, што фашысты не спыняць праследаванне, знайшоўшы труп афіцэра сувязі. Ісці ў напрамку Сянно нельга — ніяк не мінеш чыгункі, якая пільна ахоўвалася. У процілеглым жа напрамку трэба было пераходзіць аўтамабільную дарогу Віцебск — Орша, па якой бесперапынна рухаліся варожыя машыны. На Пясчанку ісці больш бяспечна, можна праскочыць бальшак, што ідзе з Багушэўска да Ніжне-Аляксандраўкі.

...Світала. Дзесьці наперадзе ляніва завуркатаў матор. Бліжэй, бліжэй... Пярэдні юнак спыніўся. Па яго знаку ўсе шэсць нібыта растварыліся ў рэдкім тумане. Толькі палоска роснага следу здрадліва сведчыла аб іх прысутнасці. Прайшла патрульная машына.

Трэба было, не марудзячы, перайсці бальшак, бо па іх слядах ішла пагоня.

Віця пайшоў да дарогі. Скамандаваў разведчыкам сачыць за сігналамі, у бой не ўступаць. Любымі сродкамі даставіць хутчэй пакет у штаб брыгады. У ім важныя звесткі.

Асцярожна прабіраліся разведчыкі да бальшака...

Калі Віця вырашыў ужо перайсці бальшак, з кустоў раздалася аўтаматная чарга. Ён кінуўся ў канаву. Кулі стрыглі за ім хмызняк.

Дружны партызанскі агонь у адказ прыціснуў фашыстаў да зямлі. З дарогі ашалела застракатаў падаспеўшы на дапамогу фашыстам бронетранспарцёр.

Яшчэ адна перабежка. Яшчэ... Раптам тупы, страшэннай сілы удар па нагах зваліў Віцю. Да яго набліжаліся фашысты. І калі яны былі ўжо побач, Віця ўзарваў гранату.

Здрыганулася наваколле. Салютам мужнасці пракацілася рэха выбуху над палямі, пералескамі і заціхла дзесьці далёка-далёка.

Так па-геройску загінуў камсамолец Віця Савіцкі, якому ішоў семнаццаты год.

*Бекашоў У. // Віцебскі рабочы, 9 мая 1964 г.*

## Чашникский дед Талаш

Степана Михайловича еще с партизанских времен нарекли Талашом. Этим сказано многое. Во время гитлеровской оккупации Степан Михайлович Шатыренок был связным и разведчиком Лепельской партизанской бригады Героя Советского Союза Владимира Елисеевича Лобанка.

...Оккупанты подготовили против партизан карательную операцию. Но враг не располагал сведениями о дислокации и силах народных мстителей в лепельской зоне. Поэтому каратели расставили на дорогах посты и хватали всех подозрительных.

Партизанам важно было выиграть время, чтобы объединить свои силы. Требовалось задержать выступление карателей. Но как?

И вот тогда В. Е. Лобанок вызвал С. М. Шатыренка и приказал пойти к немцам, чтобы убедить их, что партизан в лесу большое количество. С. М. Шатыренок надел на себя всякое рванье, подпоясался пеньковой верев-



С. М. Шатыронак

кой, в торбу положил сухари и пошел по лесной дороге навстречу немцам.

Когда немцы его задержали, С. М. Шатыренок стал им рассказывать, что его партизаны обидели — увели его корову. Немцы поверили и стали расспрашивать Степана Михайловича о количестве партизан в лесу и их вооружении. А это как раз и нужно было смелому разведчику. Он красочно рассказал врагам, что «партизан этих, как комаров, — темная туча. У каждого коротенькие ружья с колесом посредине. А еще у них машины большие, которые огнем стреляют...» Немцы отпустили его. Степан Михайлович кружным путем прибыл к В. Е. Лобанку и обо всем доложил. Потом оказалось, что каратели побоялись выступить против партизан и отложили на время блокаду. А партизаны с той поры прозвали Степана Михайловича Шатыренка партизанским дедом Талашом...

Это только один эпизод из партизанского прошлого Степана Михайловича. Рассказывает он по-народному просто, сочно и образно.

...Однажды из Лепеля в его деревню нагрянула полиция. Пронюхали фашистские холуи, что есть такой партизанский связной Шатыренок. Решили выследить его, перед гитлеровцами выслужиться. И надо же было случиться, что первого о нем спросили... самого же Степана Михайловича. Он ответил, что Шатыренков в деревне много, почти через каждый дом живут...

Полицаи пошли дальше допытываться. А настоящий Шатыренок, по собственному его выражению, «дал тягу в лес».

Образно и с юмором вспоминает Степан Михайлович эпизод за эпизодом из своего боевого прошлого. На пиджаке старого партизана сияет орден Красной Звезды, медаль «За отвагу» и другие награды за боевые подвиги в годы Великой Отечественной войны.

*В. Федоров*

## Яго складаны лёс

Вырас Фядос Амбросавіч Казлоўскі ў вялікай працавітай сям'і. Усе восем чалавек разам з бацькам ад цямна да цямна займаліся гаспадарчымі справамі, даводзілася гараваць і на палях графа Буценева. Сям'я мела серадняцкі дастатак, але часам, асабліва ў неўрадлівыя гады, даводзілася есці хлеб з мякінай. Усё ж восем ратоў трэба накарміць.

Нягледзячы на нястачы, бацька вырашыў аддаць сына Фядоса ў 3-класную царкоўна-прыходскую школу, якую ён паспяхова скончыў...

Вестка аб звяржэнні цара застала унтэр-афіцэра 266-га Парэчанскага палка Фядоса Казлоўскага на германскім фронце. Па-рознаму гаварылі пра гэта ў палку. Яснасць прыйшла пазней, пасля сустрэчы з бальшавіцкім агітатарам. Апрануты ў салдацкі шынель, ён гаварыў проста і зразумела, тлумачыў, што «вайна патрэбна буржуям, а народу яна нясе толькі гора і нястачы». Ён заклікаў салдат пакінуць акопы, ехаць дадому, каб справядліва падзяліць там панскую зямлю.

Няпроста было унтэр-афіцэру, які прайшоў жорсткую школу муштры ў царскай арміі, стаць дэзерцірам. Але праўда ў словах салдацкага агітатара аб непатрэбнасці вайны прывялі Казлоўскага да адзінай высновы — трэба вяртацца дадому, там ён цяпер патрэбен.

І ў адну з летніх начэй 1917 г. аддзяленне арганізавана пакінула баявыя пазіцыі на чале з камандзірам Казлоўскім.

У Пачаевічах ён сустрэўся з Аляксандрам Дземідовічам, Міхаілам Зінкевічам, Мікалаем Клусевічам, якія, як і ён, вярнуліся дамоў з вайны.

Але «забітыя» сяляне не былі яшчэ гатовыя да рэвалюцыйных пераўтварэнняў. Кастрычніцкая рэвалюцыя дала ім слабую веру ў тое, што кожны селянін мае права свабодна, без уціску працаваць на сваім загоне.

Пачалася грамадзянская вайна. Сабраліся былыя франтавікі і вырашылі брацца за зброю. Самастойна з графам Буценевым, які з дапамогай германскіх акупацыйных войск вярнуў сваю маёмасць і пакараў актыўных сялян, не справіцца. Дачуліся, што пад Віцебскам ёсць штаб Пятрова, дзе вядзецца запіс добраахвотнікаў у чырвонагвардзейскі атрад, і ўсе разам накіраваліся туды.

«Не ходил бы ты, Ванек, во солдаты...» — гэтыя словы Дзям'яна Беднага ўзяты нібыта з жыцця Фядоса Казлоўскага. Бацька і слухаць не хацеў пра сынаву задумку. «Хопіць, навалаваўся. Дапамагай, вось, зямельку апрацоўваць. Жаніся, завадзі сваю гаспадарку», — угаворваў ён Фядоса.

Сапраўды, навалаваўся ўдосталь, бацьку трэба памагчы. Ды і самому хлебаробская справа, як ніводная іншая, была па душы. Але ён, Фядос Амбросавіч, разам з тым выдатна разумеў, што ў такі складаны час толькі самі сяляне, сам народ можа абараніць сваю свабоду і незалежнасць.

Восенню 1918 г. уступіў Фядос Казлоўскі ў 1-ы Яраслаўскі чырвонагвардзейскі атрад. Затым стаў камандзірам аддзялення 11-й Заходне-Каўказскай арміі.

Але раптам выбіла яго з сядла не куля белагвардзейская і не шабля бандыцкая. Паклала яго на шпітальны ложак страшная хвароба — тыф.

Пасля выздараўлення ён быў прызначаны агентам асобай харчовай камісіі 2-га кавалерыйскага палка 48-й брыгады 16-й стралковай дывізіі імя Кікнадзе.

Не хутка давялося сялянскаму сыну заняцца хлебаробскімі справамі на адваёванай зямлі. Пасля дэмабілізацыі накіравалі ў атрад па барацьбе з бандытызмам.

З натхненнем узяўся Фядос пасля вяртання дадому за плуг, каб правесці першую баразну на сваім кавалку зямлі.

Але тут пачалася калектывізацыя. Да Фядоса Амбросавіча, як да аднаго з актывістаў, звярнуліся сяляне. Яны спадзяваліся, што Фядос, паважаны ў вёсцы чалавек, параіць ім уступаць у калгас і першым запішацца сам. Толькі ж ён, атрымаўшы нарэшце надзел, аб якім столькі марыў, не выказаў асаблівага жадання звязаць свой лёс з калгасам. Свая зямля, пры стараннай працы на ёй, абяцала дабрабыт і незалежнасць.

Толькі гэта ніяк не стасавалася з планамі тых, хто адказваў за правядзенне калектывізацыі. Фядоса Амбросавіча ламалі і так, і гэтак. Але ж ён заставаўся цвёрдым у сваіх перакананнях. Тады ў вёсцы знайшліся такія, хто напісаў на яго данос. Расправа была хуткай. Фядоса Казлоўскага асудзілі, а потым выслалі. Цяжкія думкі, крыўда доўгімі начамі адольвалі яго, не давалі спакою. Неаднойчы пісаў прашэнні аб пераглядзе яго справы. Адказу на іх не было. Толькі праз аднаго з тых, хто вызваліўся, адбыўшы свой тэрмін, удалося перадаць заяву. Яго справу перагледзелі і вызвалілі з турмы.

Вынес ён гэту несправядлівасць, не азлобіўся, але ў калгас не ўступіў. Працаваў на сваім падвор'і, а таксама па дагавору выконваў розныя цяслярскія работы.

А калі пачалася вайна, яна стала для Фядоса Амбросавіча менавіта айчыннай. Ён не падлягаў першачарговай мабілізацыі па ўзросту і стану здароўя. Ды ці мог заставацца абыякавым Фядос

Амбросавіч да ўсенароднай трагедыі?! Разам з 16-гадовым сынам Мікалаем падаўся ў партызаны. Закончыў вайну ў дзеючай арміі. За мужнасць і адвагу ў гады вайны атрымаў шмат узнагарод. Сярод іх ордэн Чырвонай Зоркі, медалі «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941–1945 гг.», «За ўзяцце Кенігсберга».

Перамога! Але са слязамі на вачах святкаваў яе Фядос Казлоўскі. Выраўкі-ўласаўцы закатавалі да смерці яго жонку Аляксандру Сцяфанаўну. Так і пражыў пасляваенныя гады бабылём, захоўваючы вернасць сваёй суджанай, зберагаючы ў сэрцы памяць аб ёй.

*Н. Кіндзяева*

## Нарчуки из Липовичей

Имеются в виду Большие Липовичи, что стоят на старинном тракте Черея – Сенно. В этой деревне когда-то насчитывалось около 80 дворов. Сторожили их высокие пышные липы, выстроившиеся по обе стороны улицы. Не случайно и местный колхоз назывался «Чырвоная ліпа». Дружно, хватко и весело трудились в нем люди. В поле обычно выходили с песнями. С песнями же возвращались домой. А кого не бодрили липы своим пахучим цветом! Зацветут, тогда дыши – не надышишься...

И нужно так случиться – как раз в пору цветения лип долетела страшная весть – война! Вскоре голубое небо прочертили вражеские самолеты, со стороны Толочина послышалась артиллерийская канонада, по дороге из Борисова на Чашники прогрохотали танки. Орды гитлеровских завоевателей неудержимо рвались на восток.

Не замедлили чужинцы заглянуть и в Большие Липовичи. Как-то утром деревню разбудил непривычный гул мотоциклов. Вслед за ними появились велосипедисты в зеленых мундирах с закатанными до локтей рукавами: «О, рус швайн!», «Матка – млеко, матка – яйка!», «Шнель-шнель!»...

Погалдели, погоняли на подворьях кур и укатили своей дорогой. Через несколько дней появилась новая группа оккупантов. Тут уж одним только галдежом не обошлось. Многих мужчин, которые попытались им в чем-то возразить, отделали дубинками. И строго-настрого предупредили: тех, кто не будет подчиняться, ждут виселица или расстрел.

Ефрем Нарчук под вечер в тот день вернулся из дальней поездки. Сразу же встретился с односельчанами, расспросил обо всем Тут же при всех категорически заявил: «Не позволим, чтобы так издевались над нами».

В родном колхозе Ефрем Онуфриевич был бессменным бригадиром полеводов. Как только узнал, что враг ступил на родную землю, сразу же подался в военкомат, представился: «Участник гражданской войны. Не забыл еще, как бить интервентов. Прошу, пошлите меня на фронт...»

Из Чашник его почему-то направили в Сенно, оттуда – в Витебск, из Витебска – в Лиозно. Там собрали всех таких, как Нарчук, и приказали расходиться по домам. Один из довольно высоких областных начальников посоветовал: «Настраивайтесь на борьбу в тылу врага. Весь народ должен подняться против супостатов».

Нарчук поговорил об этом со своими соседями – Иосифом Якушем, носившим пышные усы, за что его называли Чапаевым, Егором Якушем, Сергеем Пашковым, Аркадием Щербицким. Все они поддержали идею о выходе в лес. Но с семьей что станется? Враги не пощадят и всю деревню. Решили зиму скоротать дома, а там, когда сойдет снег, потеплеет, виднее будет.

Под весну дошел слух, что в лесах между Сенно и Толочином появилась какая-то группа из бывших армейцев, по разным причинам оказавшихся в тылу врага. Пытались связаться с ней, но ничего не получилось. Между тем эта группа провела уже несколько операций против оккупантов.

Немного позже до Липовичей дошло еще одно сообщение. Якобы из-за линии фронта в здешние места заброшен вооруженный отряд. Во главе его стоял какой-то Нарчук. Он был то ли командиром, то ли комиссаром.

«Смотри ты, однофамилец! Может, это брат?» — спохватился Ефрем Онуфриевич. Родной брат его, Митрофан, до войны работал в Костюковичском районе Могилевской области. Где он сейчас — бог его знает.

Как было удержаться? Подался в розыск, но попал в отряд Леонова, который образовался из небольшой группы бывших окруженцев. Из отряда потом сложилась партизанская бригада, названная Сенненской. В составе ее и пришлось воевать. Да еще с сынишкой Сергеем. Парню не было еще и 16-ти. Но он быстро освоился с делом, овладел профессией подрывника. Любил ходить на «железку», в разведку.

В доме Ефрема Нарчука осталась жена с тремя малыми детьми. Сразу за Сергеем шел Валентин, на четыре года моложе. Но мальчишка тоже жил надеждой стать в ряды народных мстителей. Даже сумел кое-какое оружие припасти. Однако командир отряда, в котором воевал Сергей, отговорил. Как-то он оказался в деревне, а к нему со своей просьбой мальчуган: «Возьмите меня с собой». Но тот пошел на хитрость: «Не торопись, браток. Ты нам здесь больше пригодишься. А вот когда малость подрастешь, может, и меня заменишь». В знак благодарности за такие слова мальчуган раскрыл свой тайник в придорожном перелеске. Там, в одном из окопов, были припрятаны два ручных пулемета. Вытащил их и тут же один вручил командиру, другой попросил передать отцу.

Как-то неожиданно уже в наши дни довелось мне узнать о встрече двух братьев из семьи Ефрема Нарчука. Старший Сергей приехал в Витебск, где живет его младший брат Валентин. Сергей несет армейскую службу на Украине в звании подполковника. А Валентин Ефремович так и остался гражданским человеком.

Встретились и, разумеется, вспомнили своих родных. В первую очередь отца. Кем он только не был в партизанах: и пулеметчиком, и разведчиком-проводником, а когда понадобилось, даже портным. Ведь одежду партизанам никто не выдавал. После войны Ефрему Онуфриевичу довелось возглавить родной колхоз. Только он назывался «Новая жизнь». Пышные липы, что украшали деревню, уничтожила война.

Ни отца, ни матери уже нет в живых. Нет в живых и родного дяди Митрофана Онуфриевича. Мне же лично довелось слышать о нем еще в годы войны. Он был одним из первых и самых активных организаторов партизанского движения на Могилевщине. Уже в начале августа 1941 г. возглавил особый Костюковичский партизанский отряд. Об этом мужественном человеке и его боевых соратниках рассказывается в книге писателя Ивана Чигринова «Свои и чужие», а также в кинофильме «Плач перепелки».

Хорошо помнят в здешних местах и Семена Николаевича Нарчука. Того, который в первую военную весну с отрядом прибыл из-за линии фронта. Потом он командовал партизанской бригадой «Гроза», дислоцировавшейся в Толочинском и Чашникском районах. Погиб в мае 1944 г. Похоронен в г. Толочин. Здесь же одна из улиц носит его имя. Семен Николаевич родился в Больших Косках Толочинского района, как значится по документам, но его родословные корни тянутся к Большим Липовичам.

Семья Нарчуков пережила в войну большое горе. Два брата из семьи Игната Нарчука, Василий и Степан, погибли на фронте в первые дни фашистского нашествия. Егор Нарчук молодым парнем погиб от рук карателей в 1942 г. В этом же году не стало и маленькой дочурки Ефрема Онуфриевича. Страшная трагедия настигла семью Митрофана Онуфриевича. Фашисты расстреляли

его жену и вместе с ней троих малых детишек. Всего война вырвала из большой семьи Нарчуков 20 человек.

И вот вспоминают два брата былое. Не мог не припомнить Сергей Ефремович, как в последнем бою на магистрали Лепель — Орша погиб его любимый командир Николай Данилович Кощеев. Он бросился к нему на выручку и сам получил ранение в голову. Спасибо врачам — выходили. А сколько приходилось прятаться от карателей малолетнему Валентину и еще более младшему Леониду, который живет сейчас в Коханово под Оршей. Все это на все годы жизни засело в памяти.

*И. Мандрик.*

## Чашніцкі падпольны райком ЛКСМБ



К. П. Захаваева. Малюнак М. Абрыньбы

У ліпені 1941 г. Віцебскі абком камсамола і Чашніцкі райком партыі пакінулі на тэрыторыі раёна 182 камсамольцаў для арганізацыі падпольнай работы. Да ўтварэння падпольнага райкома камсамольскай работай з красавіка 1942 г. кіраваў Віцебскі падпольны абком камсамола.

Падпольны райком камсамола прыступіў да работы 1 жніўня 1942. Яго асноўная база знаходзілася ў Чашніцкай партызанскай брыгадзе «Дубава».

У склад падпольнага райкома камсамола ўваходзілі сакратары: Захаваева Кацярына Пятроўна (1.8.1942—1.4. 1944), Жарнасек Марк Дзянісавіч (1.4. 1944—28.6.1944), сакратар па прапагандзе, Асіпёнак Міхаіл Міхайлавіч (31.7.1943 — 20.11.1943), сакратар па прапагандзе; члены райкома камсамола: Асіпёнак Міхаіл Міхайлавіч (1.8. 1942—31.7.1943, 20.11.1943—28.6. 1944), Вайцяховіч Надзея Іллінічна (1.8.1942—28.6.1944), Рагуноў Аляксандр Фёдаравіч (31.7.1943—12.10. 1943), Чэклін Павел Пятровіч (9.11. 1943—28.6.1944), Шараева Алена Данілаўна (31.7.1943—12.9.1943). У склад райкома ўваходзілі інструктары па падпольнай рабоце: Папко Іван Рыгоравіч (19.7.1943—28.6.1944), Няпляховіч Аляксандр Кірылавіч (19.7. 1943—28.6.1944), Мацвееў Васіль Аляксеевіч (1.2.1944—28.6.1944).

## Дакументы сведчаць

### СА СПРАВАЗДАЧЫ КАМАНДАВАННЯ ЧАШНІЦКАЙ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛ. ВІЦЕБСКАМУ ПАДПОЛЬНАМУ АБКОМУ КП(б)Б АБ ПАЛІТМАСАВАЙ РАБОЦЕ І БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯХ БРЫГАДЫ ЗА ЧЭРВЕНЬ 1943 г.

**31 ліпеня 1943 г.**

...Общая численность бригады по состоянию на 1 августа 1943 г. составляет 1008 чел. (8 отрядов, артдивизион, эскадрон).

На вооружении бригады имеется: пушек 76-мм — 1, 45-мм — 1, минометов 122-мм — 1, минометов 50-мм — 4, пулеметов — 29, ПТР — 9, автоматов — 69, винтовок — 545.

Немцы в первых числах июля сконцентрировали отдельные ж.-д. батальоны на ж.-д. магистрали Орша — Лепель, разместили гарнизоны вдоль линии железной дороги, мобилизовали население на прилегающие к железной дороге магистрали и начали восстанавливать ж.-д. магистраль Орша — Лепель.

Отряды бригады с помощью населения нашего района начали решительную борьбу против восстановления ж.-д. магистрали.

Гарнизоны немецких железнодорожников ежегодно подвергались налетам наших отрядов. В результате были разгромлены немецкие гарнизоны Тяпино, Варки, Езба и др.

С помощью населения была разрушена ж.-д. магистраль от ст. Бурбин до 116-го разъезда протяжением в 40 км 200 м.

...Особенно отличился отряд, которым командует Звонов Борис. Он лично со своим отрядом разгромил гарнизоны железнодорожников Езба, Тяпино, взорвал водокачку на ж.-д. магистрали, взорвал железнодорожный мост длиной 60 м на р. Лукомка.

В июле 1943 г. бригадой разгромлено 5 гарнизонов противника в Чашникском районе — дер. Тяпино, Езба, Залесье, Торфозавод, Варки. Во всех боях с немецкими захватчиками убито 106 и ранено 62 гитлеровца.

На ж.-д. магистрали Орша — Лепель взорвано 1152 рельса. Взорвано и сожжено 38 ж.-д. мостов на ж.-д. магистрали Орша — Лепель (длиной от 5 до 60 м). Взорвана водокачка и водонапорная башня на реках Лукомка и Вятно. Полностью разрушено ж.-д. полотно на ж.-д. магистрали Орша — Лепель. Взорвано и сожжено 28 шоссейных мостов на магистралях Чашники — Лепель, Чашники — Бочейково, Бочейково — Бешенковичи, Чашники — Бешенковичи, Чашники — Лукомль. Захвачено 12 винтовок, 2 автомата, 1 РП.

Согласно приказу № 0042, отрядами бригады на ж.-д. магистрали Загатье — Подсвилье взорвано 60 рельсов и мост (1 м$\times$6 м). В бригаде обучено подрывному делу 275 чел., которые почти все прошли практику на ж.-д. магистрали Орша — Лепель, Подсвилье — Загатье.

В настоящий период создан специальный комсомольский диверсионный отряд, но не (хватает) оружия и боеприпасов. Это препятствует быстрому росту и практической работе отряда.

В районе дислокации бригады создана резервная армия, которая насчитывает до 4 тыс. чел., которые горят желанием быстрее получить оружие и громить ненавистных фашистов.

В бригаде создано 12 снайперских групп, которые прошли теорию, но за неимением оптических приборов и винтовок эти группы не дают эффекта в работе.

Бригадой проводилось массовое распространение воззваний, листовок к «народникам» и полицейским. Через агентурную разведку связывались с немецкими гарнизонами, вследствие чего за июль в бригаду перешло «народников» и полицейских 32 чел. Белорусский народ горит желанием вступить в партизанские отряды, получить оружие и громить ненавистных фашистов. Для борьбы с фашизмом надо больше винтовок, пулеметов, автоматов, боеприпасов и ВВ.

За отчетный период среди партизан и населения проведена большая политмассовая работа.

Широко популяризуются боевые эпизоды о Героях Советского Союза. За отчетный период проведена большая политмассовая работа в 80 населенных пунктах Чашникского района, где приняло участие 11 500 чел. гражданского населения. Характерные вопросы: наступление Красной Армии зимой 1941/42 г. и провал немецкого летнего наступления; наступление Красной Армии на Курско-Орловском и Брянском направлениях и военные действия наших союзников; речь генерал-лейтенанта тов. Пономаренко.

Наряду с этим проведена большая работа по сохранению хлеба от фашистских оккупантов. Райкомом партии издается и широко распространяется среди населения и немецких

гарнизонов районная газета «Сцяг соцыялізму», которая выпускается 4 раза в месяц общим тиражом 1 тыс. экз. За отчетный период выпущено и распространено в немецких гарнизонах и в Чашниках больше 3 тыс. экз. листовок и воззваний к солдатам «народной армии», бургомистрам и полицейским района, к «добровольцам», находившимся на службе у немцев, к юношам и девушкам Чашникского района. Вся получаемая литература из-за линии фронта и издаваемая нами распространяется среди гражданского населения при помощи инструкторов РК КП(б)Б и РК ЛКСМБ.

Вся работа с личным составом в подразделениях проводится через первичные партийные организации и политсостав подразделения. Во всех подразделениях выпускаются регулярно боевые листки и стенные газеты. Проведены беседы: «Сила советского патриотизма», «Молодежь на защите Ленинграда», «Два года Отечественной войны Советского Союза», «Боевой приказ — закон, на выполнение которого нужно отдать все силы», «Выручка товарища в бою», «О выполнении партизанской присяги». Моральное состояние всего личного состава бригады хорошее...

По данным агентурной разведки, вследствие провала (восстановления) ж.-д. магистрали Орша — Лепель изъятый у крестьян урожай будут транспортировать по водной магистрали по Улле на баржах. Планы заготовок фашистов (первоначальный план заготовок 4 ц с га) в настоящий период — изъять у крестьян весь хлеб до грамма.

Командир партизанской бригады «Дубова»
Дубровский

Комиссар бригады Старинский
Нач. штаба бригады Шарко

*Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. Т. 2. Мн., 1978. С. 57—59.*

## З ГІСТОРЫІ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ «ГРОЗА» ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛ. АБ ДЫВЕРСІЯХ НА ЧЫГУНАЧНЫХ КАМУНІКАЦЫЯХ ПРАЦІЎНІКА Ў НОЧ З 2 НА 3 ЖНІЎНЯ 1943 г.

**Не раней 3 жніўня 1943 г.**

...Обстановка ко дню операции сложилась нормальная, концентрации сил противника не наблюдалось, и особых экспедиций против партизан противник не предпринимал. Бригада в это время насчитывала до 800 чел. личного состава, среди которого до 650 чел. вооруженных. Дислоцировалась бригада в дер. Барсуки, Будище, Хавчи, Рыжанки, Борки Чашникского района.

Командир бригады Нарчук Семен Николаевич, пом. комиссара бригады Лиманский Николай Николаевич, нач. штаба бригады Котлярчук Дмитрий Михайлович.

*Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. Т. 2. Мн., 1978. С. 80—81.*

## ДАКЛАДНАЯ Ў ВІЦЕБСКІ АБКОМ КАМСАМОЛА АД ЧАШНІЦКАГА РК ЛКСМБ О СОСТОЯНИИ ПОДПОЛЬНОЙ РАБОТЫ ЗА ИЮЛЬ И АВГУСТ 1943 г.

На 1-е сентября 1943 г. по Чашникскому району имеется 66 подпольных организаций с охватом 196 человек. Кроме этого, в 10 деревнях имеются одиночки комсомольцы.

В местечке Чашники имеется 3 подпольные организации. Секретари Варгалеонок Алексей, Козлова Екатерина и Шуманович Соня.

Подпольная комсомольская организация имеется на льнозаводе, секретарь которой Козлов Степан. Имеются подпольные организации в гарнизоне Лукомль, Иванск.

Секретарь Чашникского РК ЛКСМБ
Заховаева

*Дзяржархіў Віцебскай вобл., ф. 3856, зв. 12, спр. 17, л. 27.*

### З ДАКЛАДНОЙ ЗАПІСКІ САКРАТАРА ВІЦЕБСКАГА ПАДПОЛЬНАГА АБКОМА КП(б)Б І. А. СТУЛАВА САКРАТАРУ ЦК КП(б)Б П. К. ПАНАМАРЭНКА АБ СТАНЕ ПАРТЫЗАНСКАГА РУХУ, ПАРТЫЙНАЙ І ПАЛІТЫКА-МАСАВАЙ РАБОТЫ СЯРОД ПАРТЫЗАН І НАСЕЛЬНІЦТВА ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛ. З 1 МАЯ 1943 г. ДА 1 СТУДЗЕНЯ 1944 г.

**Не раней 1 студзеня 1944 г.**

По приказу тов. Пономаренко партизанские соединения с 20 по 25 октября 1943 г. штурмовали Лепель, Чашники, дер. Камень и ряд других (населенных пунктов). В данной борьбе партизаны приобрели опыт уличных боев в городах и нанесли противнику большой материальный ущерб.

*Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. Т. 2. Мн., 1978. С. 609.*

### СА СПРАВАЗДАЧЫ КАМАНДАВАННЯ ЛЁЗНЕНСКАЙ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛ. ВІЦЕБСКАМУ ПАДПОЛЬНАМУ АБКОМУ КП(б)Б АБ БАЯВОЙ І ПАРТЫЙНА-ПАЛІТЫЧНАЙ РАБОЦЕ БРЫГАДЫ ЗА САКАВІК 1944 г.

**2 красавіка 1944 г.**

Работа среди населения

В течение марта в 36 н(аселенных) п(унктах) проведены беседы на следующие темы: проработан приказ тов. Сталина, посвященный 26-й годовщине Красной Армии, сделан доклад о международном положении, сделан доклад о Международном женском дне, о советско-финляндских отношениях.

Беседы проводились в н(аселенных) п(унктах) Бол(ьшие) Хольневичи, Барсуки, Борки, Сторожище Холопеничского района, Лукомль, Рудница, Ротница, Паршевщина, Замочек, Железки, Жучки, Большие Трухановичи, Мелешковичи, Пруськи, Мал(ое) Озерецкое, Бол(ьшое) Озерецкое, Бол(ьшие) Ульяновичи, Мал(ые) Ульяновичи, Замошье, Фольварок, Русиново, Городец, Углы, Застаринье Чашникского и Сенненского районов.

На проводимых беседах присутствовало от 40 до 120 чел. ...

Проводилась работа по разложению «народников» и полиции путем засылки советской литературы, листовок и писем. Получали ответы, которые прилагаю (обкому).

В течение марта противник предпринимал бомбежку населенных пунктов Холопеничского и Чашникского районов, в результате чего сжег дер. Вал, Мелешковичи, Кисели, Обузерье, Симоновичи и др.

В марте из числа бойцов-партизан был создан ансамбль в количестве 9 чел., который за период с 8 по 30 марта дал 25 выступлений для партизан и населения.

*Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. Т. 3. Мн., 1982. С. 211.*

## І працай кавалі Перамогу

Аляксандр Канстанцінавіч Астроўскі — настаўнік гісторыі Чарэйскай СШ. Разам з бацькамі напярэдадні вайны апынуўся ў Кемераўскай вобл. У грозны час далёкая Сібір прымала эвакуіраваныя заводы, пасылала адважных сыноў ваяваць з фашызмам, самаадданай працай кавала Перамогу. Замест іх у многіх выпадках да станкоў станавіліся падлеткі. Сярод іх быў пятнаццацігадовы Саша Астроўскі.

...Па-сібірску прыціскаў мароз, а хлопцы валілі кедры, сосны. Звінелі бясконца пілы, стукалі сякеры. Кіпела работа. Былі там і дзяўчаты. «Усё для фронту!» — заклікаў транспарант.

Як баявы кліч, падхоплівалі гэтыя словы маладыя лесанарыхтоўшчыкі. Адпачнуць крыху каля кастра — і зноў за пілы, сякеры. Бярвенні адпраўляліся сплавам і транспартам для будаў-

ніцтва эвакуіраваных заводаў і фабрык, прадукцыя якіх вельмі патрэбна воінам. Кедр ішоў на крапёж шахт, дзе здабываўся вугаль.

Потым мы, падлеткі, працавалі на Кемераўскім коксахімічным заводзе. З дарослых быў, напэўна, толькі майстар. Многія з нас у час працы на станку станавіліся на падстаўкі. Не ведалі сапраўднага адпачынку, забыліся пра дзіцячыя гульні. Мы давалі краіне важную прадукцыю — кокс, без якога не могуць абысціся металургічныя і сталеліцейныя заводы. Таксама выпускалі 96 назваў хімічных прадуктаў, у тым ліку бензол і сахарын.

Побач са мной знаходзіўся і мой малодшы брат Яўген, які цяпер загадвае фермай у саўгасе «Чарэя».

«За сябе і таго, хто пайшоў на фронт» — гэты дэвіз стаў паўсядзённым правілам. А потым пачалі перакрываць і дзве нормы: разгарнулі спаборніцтва за выкананне задання ад 200 да 500 %. Як цяпер, памятаю рэкорд Олі Мясніковай, якая на такарным станку за адну змену выканала дзесяць норм.

Калі даляцела вестка аб вялікай Перамозе, радасці не было канца.

*А. Астроўскі*



М. Е. Наўгародцаў



Х. З. Байбулатаў



Герой Савецкага Саюза С. Д. Крэмер



А. Л. Волкаў

# ВЫЗВАЛЕННЕ РАЁНА

Чашніцкі раён вызвалялі войскі 1-га Прыбалтыйскага і 3-га Беларускага франтоў у ходзе Віцебска-Аршанскай аперацыі 23—28 чэрвеня 1944 г. пры ўзаемадзеянні з партызанамі Чашніцкай брыгады «Дубава». Баявыя дзеянні вялі войскі 43-й арміі, злучэнні 65-га і 72-га стралковых карпусоў 5-й арміі і 3-га гвардзейскага механізаванага корпуса 3-га Беларускага фронту. Чашнікі вызвалены 27 чэрвеня 1944 г. часцямі 204-й і 357-й стралковых дывізій 43-й арміі пры ўзаемадзеянні з 9-й гвардзейскай механізаванай брыгадай 3-га гвардзейскага механізаванага корпуса, Чашніцкай партызанскай брыгадай «Дубава» і 2-й партызанскай брыгадай імя К. С. Заслонава; рабочы пас. Акцябрскі ў той жа дзень — войскамі 43-й арміі.

23 чэрвеня 1944 г. 3-ці гвардзейскі механізаваны корпус уведзены ў прарыў паміж Віцебскам і Оршай. Баявыя аперацыі ажыццяўляліся пад камандаваннем генерал-лейтэнанта В. Т. Абухава і палкоўніка М. І. Радзіёнава.

26 чэрвеня 9-я механізаваная брыгада з боем авалодала в. Тоўпіна, дзе адбыўся жорсткі бой. Тут немцы імкнуліся прыкрыць адыход сваіх войск. У далейшым наступленне вялося трыма калонамі: 7-я гвардзейская механізаваная брыгада на Лукомль, Валасачы, Бягомль, 9-я гвардзейская механізаваная брыгада на Чарэю, Красналукі, Валасачы, 8-я гвардзейская брыгада на Бобр, Халопенічы, Плешчаніцы. У ноч на 27 чэрвеня 7-я механізаваная брыгада

атрымала задачу авалодаць Лепелем. Раніцай 27 чэрвеня адбыліся баі каля Лукомля, а потым каля в. Плаўнік. Тут загінулі камандзір танкавай роты гвардыі старшы лейтэнант І. М. Філоненка, гвардыі сяржант С. І. Клімаў, гвардыі старшы сяржант Ю. І. Грошаў.

З успамінаў гвардыі палкоўніка ў адстаўцы Мікалая Васільевіча Цвяткова: «Бригада наступала со стороны Сенно и 26 июня 1944 г. овладела д. Толпино. Отсюда она повела наступление на Лукомль, овладела населенными пунктами Торопы, Дрозды. Однако 27 июня бригаде сменили направление наступления для овладения г. Лепель.

Передовой отряд бригады — мотострелковый батальон, которым командовал гвардии майор Ф. А. Алабышев, подкрепленный ротой танков старшего лейтенанта Филоненко, почти в начале наступления в новом направлении в районе на северо-запад от Лукомля встретил сильное сопротивление. Здесь на высоте 219 укрепился батальон 201-й пехотной дивизии немцев. В районе д. Залесье разведка бригады выявила заминированный участок дороги, на которой взорвалась бронемашина. Укрепленный узел обошли лесом, а гитлеровцы, которые попали в окружение, потом сдались.

Освободив населенные пункты юга Чашникского района, бригада подошла к Лепелю, разгромила 99-й пехотный полк гитлеровцев и овладела городом.

За эту операцию многие солдаты и офицеры бригады награждены орденами, а командиру бригады Михаилу Иосифовичу Радионову присвоено звание Героя Советского Союза и воинское звание генерал-майор танковых войск».

Імкліва наступала Чырвоная Армія ў чэрвеньскія дні 1944 г. Залп «кацюшы» паскорыў адступленне акупантаў, а ў мяст. Чашнікі яно нагадвала панічнае бегства. Але гітлераўцы чапляліся за кожны баявы рубеж.

Жорсткі бой адбыўся 27 чэрвеня 1944 г. ля в. Плаўнік. Нямецка-фашысцкія захопнікі рыхтаваліся да яго, загадзя ўмацавалі свае пазіцыі, і калі да вёскі наблізілася танкавая рота Чырвонай Арміі, яны знянацку адкрылі агонь з проціватанкавых гармат. У баі загінуў камандзір танкавай роты Іван Мацвеевіч Філоненка. Ён накіраваў сваю машыну прама на варожую батарэю і, уварваўшыся на пазіцыі ворага, знішчыў дзве гарматы і іх разлік. Але трэцяя гармата, якая стаяла воддаль, падбіла танк камандзіра.

Няроўны бой адбыўся ля в. Смалянцы. Часці 33-й Віцебскай ордэна А. Неўскага зенітна-артылерыйскай дывізіі РГК сустрэліся з дзвюма нямецкімі дывізіямі, якія выходзілі з акружэння. Немцаў было прыкладна каля 2 тыс., значна больш, чым чырвонаармейцаў. Але яны змаглі не толькі адбіць атакі фашыстаў, але і нанесці ім значныя страты, захапіць палонных. У баі загінула некалькі дзесяткаў чырвонаармейцаў, якія пахаваны ў брацкай магіле ў в. Смалянцы. У Чашніцкай СШ № 3 створаны музей, дзе сабраны цікавыя экспанаты і ўспаміны аб баявых дзеяннях 33-й Віцебскай ордэна А. Неўскага зенітна-артылерыйскай дывізіі РГК.

Ля в. Чарэя геранчна загінуў танкавы экіпаж Івана Восіпавіча Мазгавога. Цудам ацалеў толькі камандзір танка, які назней паведаміў аб апошнім няроўным баі яго баявога экіпажа. 27 чэрвеня танк І. В. Мазгавога спыніўся ля в. Чарэя для рамонту хадавой часткі танка. Іх часць пайшла наперад біць ворага. Знянацку на іх напала выходзячая з акружэння група фашыстаў. Немцы накіравалі на адзіны танкавы экіпаж 4 танкі, 5 самаходных гармат і больш 600 салдат. Чатыры разы адбіваў экіпаж атакі. Танк загарэўся ад папаўшага ў яго снарада, але стралок-радыст Дзмітрый Карацееў збіў полымя. Яны прадаўжалі змагацца. Апошнія 6 снарадаў камандзір танка Іван Восіпавіч Мазгавы вынусціў ужо з палаючага танка. Яму цудам удалося выратавацца. Мужна загінулі ў няроўным

баі лепшы ў палку механік-радыст Дзмітрый Карацееў, башнер Нікандраў і механік Вараб'ёў. Яны пахаваны ў брацкай магіле ля в. Чарэя.

Нямала салдат палягло ў баях за Чашніччыну. Ля в. Папоўка аддаў сваё жыццё узбек Хасан Юлдашаў. Яго баявы шлях ішоў па многіх дарогах і палях ад далёкай андзіжанскай зямлі. Вызваляючы беларускую в. Папоўку, ён ішоў у бой і за свой аул.

Побач змагаліся свярдлаўчанін Аляксандр Камісараў, масквіч Іван Васкоў, іншыя чырвонаармейцы.

Ля в. Дзямідавічы загінуў ленінградзец Іван Ізотаў, ля в. Копцевічы — Аляксандр Лаўрык, ураджэнец сонечнага Ташкента, башкір Міхаіл Тхур пахаваны ля в. Марынцы Альшанскага сельсавета, дагестанец Цімафей Ходус — ля в. Міхайлава. Цяжкі бой адбыўся ля в. Ухлё. І зноў па прозвішчах тых, хто пахаваны ў брацкіх магілах, мы пераконваемся ў непарушным брацтве народаў. Украінец Мікалай Цярэшчанка і жыхар г. Горкага Аляксей Мінін, свярдлаўчанін Мікалай Шульгін і таджык Гаіб Ісматаў, туляк Пётр Харкоў і жыхар г. Уладзівастока Іван Форбін, як і многія іншыя, мужна змагаліся на беларускай зямлі.

Назаўсёды захаваюць памяць аб загінуўшых за вызваленне Чашніччыны помнікі і абеліскі. Тут увекавечаны іх імёны. Гэта — яфрэйтар Дніхай Эсцемесаў з Джамбульскай вобл., радавы Кірыл Суздальцаў з Чачэнскай Рэспублікі, сяржант Аляксей Казанцаў з Алтайскага краю, чуваш Васіль Бадроў, удмурт Гільман Касімаў, мардвін Андрэй Пацілейка, жыхар сібірскага г. Ірбіт Дзмітрый Крупнякоў і шмат іншых.

*Н. Кіндзяева*

## Бой за Черею

Пачка пожелтевших от времени писем, в каждой строчке которых чувствуется тоска по родному дому, милым сердцу родителям, друзьям детства, лежит на столе. Из старых рамок смотрит молодой военный в шинели и фуражке, потом это же симпатичное лицо — в шлеме танкиста.

— Гармонист был удалой, — говорит Дарья Родионовна Коротеева, перебирая фронтовые письма сына.

Вот последнее письмо нашего земляка Дмитрия Михайловича Коротеева: «Пока пули и снаряды летят мимо моей головы. Скоро конец войне, ждите меня с победой». Это письмо написано 20 июня 1944 г. Тремя днями позже Дмитрий Коротеев, стрелок-радист танка, участвовал в бою на линии Витебск — Орша. Командир танка Иван Осипович Мозговой писал, что их экипаж уничтожил немало вражеских солдат и офицеров, подбил два танка.

Затем часть ушла вперед, а экипаж Мозгового остался ремонтировать ходовую часть танка. С ними остались несколько шоферов с машинами. Недобитая группа фашистов решила смять горстку советских солдат и двинула против них четыре танка, 5 самоходных орудий, более шестисот солдат. Пришлось принять неравный бой. Произошло это 27 июня 1944 г. Вот что вспоминал командир танка. «У нас было около трехсот снарядов. Мы четыре раза отбивали атаки немцев, но снаряд противника попал в наш танк. Он загорелся. Митя (Дмитрий Коротеев) сбил пламя огнетушителем, а я продолжал стрелять по немцам. Оставалось еще двадцать снарядов. Второй снаряд противника попал в танк. Боеприпасов становилось все меньше, последние шесть снарядов я выпустил из горящего танка и дал приказ выскакивать из машины. Выскочил, охваченный пламенем, помощник механика Воробьев, но тут же сгорел. Митя, башнер Никандров и я выскочили с гранатами в руках, но немцы выстрелами из автоматов ранили ноги Дмитрию и Николаю Никандрову. Мне только пробило одежду. Мы отходили к лесу, немцы продолжали нас обстреливать. Я бросил гранату и заставил замолчать немецкий пулемет. Нас окружили. Мы стали бро-

сать гранаты, фашисты залегли. Никандров и Митя сказали мне: «Мы останемся, а ты ползи, выбирайся как-нибудь».

Иван Мозговой бежал пять километров, потом на попутной машине добрался наутро до части и, взяв два танка, вернулся на поле сражения, надеясь застать в живых своих товарищей. Но было уже поздно. Командир обнаружил истерзанные тела Дмитрия Коротеева и Николая Никандрова, на каждом из них фашисты оставили по сотне пулевых прострелов.

Митя был одним из лучших радистов полка, его любили все командиры, он выполнил свой долг перед Родиной. Прах нашего земляка захоронен в с. Черея, примерно в 150 километрах от Витебска. Солдаты похоронили Коротеева и Никандрова и поставили столбик с надписью.

Иван Мозговой дал клятву беспощадно мстить за погибших друзей. «Уже пять месяцев, как мы в боях,— писал он.— Получили хорошую технику, скоро будем бить врага на его территории. Конец близок, победа будет за нами».

Жители деревни, около которой погибли Дмитрий Коротеев, Николай Никандров, помнят тот жестокий бой. Свято чтут память погибших дети, ученики Черейской средней школы. Они любовно ухаживают за братской могилой, часто приносят к подножию памятника цветы.

*Манаенков М. // Заря, 8 мая 1966 г. (г. Краснинск Липецкой обл.).*

## Бой каля в. Смалянцы

У ходзе аперацыі «Баграціён» нашы войскі ў хуткім тэмпе пайшлі на захад, а ў іх тыле аказаліся дзве фашысцкія дывізіі. Яны імкнуліся дагнаць фронт, каб злучыцца з асноўнымі сіламі. У гэты час у глыбокім тыле каля Чашнікаў з'явілася 33-я Віцебская ордэна А. Неўскага зенітна-артылерыйская дывізія РГК, якая аддала ўсе запасы гаручага танкавым войскам, каб тыя бесперапынна гналі ворага.

Дывізія вымушана была спыніцца, спадзеючыся здабыць гаручае. Так яна сустрэлася з тымі нямецкімі дывізіямі, якія ашалела спяшаліся дагнаць фронт. Сілы былі няроўнымі. Немцаў было прыкладна дзве тысячы, а чырвонаармейцаў толькі адна тысяча.

Завязаўся бой. Мужна змагалася 4-я батарэя старшага лейтэнанта Валахановіча, але заняла пазіцыю ў кустах. І не заўважылі артылерысты, як вораг непрыкметна дабраўся да іх з тылу. Увесь разлік і камандзір загінулі.

Другія ж батарэі, у тым ліку і А. Г. Гучмазава, размясціліся ў больш выгадных пазіцыях. Яны змаглі не толькі адбіць атакі немцаў, але і нанесці значныя страты, захапіць палонных. Разлік Гучмазава ўзяў 17 фашыстаў. За гэты бой Аляксандр Георгіевіч атрымаў першую ўзнагароду — ордэн Чырвонай Зоркі. Потым да іх далучыліся яшчэ адзін такі ордэн, два ордэны Айчыннай вайны, два медалі «За баявыя заслугі», іншыя ўзнагароды.

Не ўсе засталіся жывымі пасля таго бою. У Смалянцах ёсць брацкая магіла, дзе пахаваны воіны 33-й зенітна-артылерыйскай дывізіі. Сярод іх старшы лейтэнант Восіп Валахановіч з Кастрамской вобл. Засталася навекі на чашніцкай зямлі медыцынская сястра Ніна Ганчарова. Яе фашысты расстралялі пасля жорсткіх здзекаў.

*Н. Кіндзяева*

## Бой каля в. Плаўнік

### З успамінаў жыхара в. Плаўнік Прохарава Пятра Іванавіча

Мы не ведалі, што наша в. Плаўнік хутка стане месцам жорсткай сутычкі гітлераўцаў і нашых савецкіх салдат, і тут будзе, вобразна кажучы, упісана адна са старонак летапісу вызвалення Чашніцкага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Аднойчы ў чэрвені 1944 г. у вёску прыйшлі немцы. Яны і раней прыходзілі, але доўга не заставаліся. А тут, глядзім, пачалі выгружаць з абозу харч, боепрыпасы. Цэлы дзень рыхтаваліся да нечага, як я цяпер разумею, займалі абарону.

На наступны дзень, раніцай, па хатах пачаў хадзіць нямецкі канвой і выганяць усіх, хто быў. «Шнель, шнель»,— крычалі нямецкія салдаты. Фашысты вельмі баяліся, што мы, мясцовыя жыхары, будзем дапамагаць савецкім салдатам. Але мы, тады яшчэ не вельмі добра разумеючы гэта, пайшлі з вёскі і спусціліся ў зямлянкі.

Здалёк чулася кананада. Мой дзед рашыў выйсці з зямлянкі і паглядзець, што робіцца ў вёсцы. Не магу перадаць той радасці, якая ахапіла нас, калі раптам пачулі дзедаў крык: «Нашы, нашы немцаў б'юць!»

А бой у вёсцы ішоў жорсткі. У ім загінула шмат гітлераўцаў. Але і нашы некалькі салдат засталіся на полі бою.

У памяці вяскоўцаў і да гэтай пары жыве подзвіг аднаго з іх — камандзіра танкавай роты Філоненкі. Калі немцы адкрылі агонь з процітанкавых гармат, ён накіраваў сваю машыну прама на варожую батарэю. Яе агонь не спыніў адважны экіпаж, і танк, уварваўшыся на пазіцыі ворага, знішчыў дзве гарматы разам з іх разлікам. Але трэцяя гармата, якая стаяла за хатай, падбіла танк камандзіра. Іван Мацвеевіч Філоненка загінуў як герой. На пахаванне яго і яшчэ некалькіх савецкіх байцоў сабралася ўся в. Плаўнік. Пасля вайны адбылося перазахаванне. Астанкі героя ў перанеслі да помніка, які знаходзіцца непадалёк ад вёскі Гілі — цэнтральнай сядзібы саўгаса «Свабода».

## Праз «мядзведжы» вал

Адна з самых вялікіх стратэгічных аперацый Вялікай Айчыннай вайны носіць імя «Баграціён». Адбылася яна ў чэрвені—жніўні 1944 г., у выніку якой разгромлена буйная групоўка гітлераўцаў і вызвалена Беларусь.



М. Ф. Нікіцін

Для мяне, аднаго з удзельнікаў гэтых баёў, асабліва запомніўся канец чэрвеня 1944 г. Наш полк атрымаў загад правесці разведку боем. Даводзілася ахвяраваць сабой, каб раскрыць сістэму агню і інжынерных збудаванняў «мядзведжага» вала — доўгатэрміновай абароны вакол Віцебска. У атаку пайшла рота аўтаматчыкаў, у якой я тады быў камсоргам.

Доты, дзоты, стальныя каўпакі ў траншэях, шматкіламетровыя акопы і пераходы складалі тры лініі абароны гітлераўцаў. Падыходы да іх аблытаны калючым дротам, замініраваны, знаходзіліся пад перакрыжаваным агнём гармат, мінамётаў і кулямётаў. Восем разоў мы хадзілі ў атаку, але ўсё ж узялі трэцюю траншэю. У ходзе баёў кантузіла камандзіра палка, у нашай роце не засталося ні аднаго афіцэра. І вось тады я, сяржант, прыняў на сябе камандаванне. Мы адбілі дзве контратакі ворага, пазіцый не здалі. Памяць аб гэтым — першы медаль «За адвагу».

Нялёгка нам дасталася гэта разведка. Але задачу выканалі, сістэму абароны ворага раскрылі, што дапамагло пасля магутнай артпадрыхтоўкі 23 чэрвеня перайсці нашым часцям у наступленне. У раёне Задарожжа Бешанковіцкага раёна замкнулася кола акружэння і буйная групоўка фашыстаў трапіла ў «кацёл». Толькі ў раёне саўгаса «Хотцы» наша 251-я Чырванасцяжная дывізія, якая потым стала называцца Віцеб-

скай, узяла ў палон многа гітлераўскіх салдат, афіцэраў і нават генерала.

З таго часу прайшлі дзесяцігоддзі. Пасля Віцебска былі і іншыя напружаныя баі і паходы ў Прыбалтыцы. Але для мяне менавіта Віцебск стаў знамянальнай вяхой — адсюль я стаў камандавацъ ротай і потым атрымаў афіцэрскае званне. Вызваленне Наддзвінскага краю — экзамен на баявую сталасць.

*М. Нікіцін*

## Дакументы сведчаць

### З ГІСТОРЫІ 2-й ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ ІМЯ К. С. ЗАСЛОНАВА ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛ. АБ СУМЕСНЫХ БАЯХ ПАРТЫЗАН З ЧАСЦЯМІ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ Ў ЧЭРВЕНІ 1944 г.

**13 жніўня 1944 г.**

Этот период в истории боевой деятельности бригады можно определить с момента расположения бригады штабом в дер. Вирки, отрядами: (дер.) Заборье, Кащино, Ляховичи, Пасынки, Кожары, Гурец, Мелешковичи. Бригада заняла этот район непосредственно после выхода из окружения — 18 июня 1944 г. С появлением бригады в районе своей прежней дислокации противник, ошеломленный возвращением партизан, поспешно переходит к боевым действиям. Бригада держит бой с противником с 19 июня 1944 г. в районе дер. Гоголевка, Добромыслье, Загатье, Ляховичи.

Могучий удар Красной Армии, прорвавший 23 июня 1944 г. оборону немцев в районе Витебска, смял планы немецких карателей по проведению второй экспедиции против партизан. 25 июня 1944 г. частями Красной Армии было взято мест. Лукомль (Чашникский район). Наша разведка установила связь с находившимся там батальоном Красной Армии, благодаря которой бригада совместно с частями Красной Армии громила с тыла отступающего противника в районе дер. Пасынки, Кожары, Гили. А утром 27 июня 1944 г., когда бригада полностью соединилась с Красной Армией, отряд им. Пономаренко совместно с батальоном, находившимся ранее в мест. Лукомль, штурмом овладел гарнизоном противника в дер. Слобода (Холопеничский район).

...Успех боевых действий бригады во всех периодах ее существования был обеспечен четким, тактически искусным руководством со стороны командования бригады, непрерывной разведкой и взаимодействием боевых отрядов, крепкой воинской дисциплиной и высоким морально-политическим уровнем личного состава бригады.

Командир бригады Комлев
Комиссар бригады Беляев
Нач. штаба бригады Загер

*Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. Т. 3. Мн., 1982. С. 627.*

### З ВЫНІКОВАЙ СПРАВАЗДАЧЫ ПРАДСТАЎНІКА БШПР НА 1-м ПРЫБАЛТЫЙСКІМ ФРОНЦЕ І. І. РЫЖЫКАВА І НАЧ. АПЕРАТЫЎНАГА АДДЗЕЛА ПРАДСТАЎНІЦТВА П. С. ШАЛЫМАГІНА АБ УЗАЕМАДЗЕЯННІ ПАРТЫЗАН ВІЦЕБСКАЙ, ВІЛЕЙСКАЙ І ПАЎНОЧНЫХ РАЁНАЎ МІНСКАЙ ВОБЛ. З ЧАСЦЯМІ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ ЛЕТАМ 1944 г.

### Непосредственное боевое взаимодействие партизан с наступающими частями Красной Армии

26 июля 1944 г. партизанская бригада им. Заслонова (комбриг Комлев) и 4 отряда из бригады Дубровского на фронте Чашники — оз. Лукомльское, связавшись с наступающим нашим танковым батальоном и скоординировав взаимодействие с командованием последнего, перехватили пути отхода противника на запад, прочно оседлали дороги Чашники—Краснолуки, Чашники—Волосовичи, чем создали немцам ловушку, закрыв их в «мешок».

*Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. Т. 3. Мн., 1982. С. 663.*

## З ДАКЛАДА ПРАДСТАЎНІКА БШПР НА 1-м ПРЫБАЛТЫЙСКІМ ФРОНЦЕ ЧЛЕНА ВАЕННАГА САВЕТА ФРОНТУ І. І. РЫЖЫКАВА АБ БАЯВЫХ ДЗЕЯННЯХ ПАРТЫЗАН ВІЦЕБСКАЙ, ВІЛЕЙСКАЙ І МІНСКАЙ АБЛАСЦЕЙ З ВОЙСКАМІ 1-га ПРЫБАЛТЫЙСКАГА І 3-га БЕЛАРУСКАГА ФРАНТОЎ З 20 ЧЭРВЕНЯ 1944 г. І Ў ПЕРЫЯД АГУЛЬНАГА НАСТУПЛЕННЯ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ ПА ВЫЗВАЛЕННЮ БЕЛАРУСІ

### Очистка тылов и коммуникаций Красной Армии от останков разбитых немецких частей

...Партизанская бригада «Дубова» (комбриг Ф. Ф. Дубровский), очищая тылы и охраняя коммуникации Красной Армии в Чашникском районе, истребила 400 и захватила в плен 1400 немецких солдат и офицеров.

*ЦАМА РФ, ф. 235, воп. 2074, спр. 31, л. 119.* Падрыхтаваў да друку У. І. Лемяшонак.

## Радкі раённай газеты «Сцяг сацыялізма»

8 лютага 1945 г.

### БРАЦКАЯ ДАПАМОГА

Па ўсіх калгасах нашага раёна з вялікім уздымам брацкай дапамогі праходзіць зараз збор зерня калгаснікам Суражскага раёна, дзе нямецка-фашысцкія захопнікі разбурылі і разграбілі ўсю народную гаспадарку.

Калгаснікі Лазукоўшчыны актыўна разгарнулі гэту кампанію. Калгас «Цэнтр Труханавічы», дзе старшынёй калгаса інвалід Айчыннай вайны Байко Пётр, сабраў у дапамогу суражанам 130 кг зерня. Сам тав. Байко ўнёс 32 кілаграмы зерня.

65-гадовы каваль Бакан Фёдар, нягледзячы на тое, што сам пацярпеў ад фашысцкіх бандытаў, гаспадарка якога згарэла, унёс 49 кілаграмаў збожжа. Каваленка Надзея ўнесла таксама 40 кілаграмаў збожжа. Па прыкладу іх калгаснікі падыходзяць да стала і падпісваюцца на аказанне дапамогі.

*Лебедзеў*

15 лютага 1945 г.

### ПАДАРУНКІ ШКОЛЬНІКАЎ ВЫЗВАЛІЦЕЛЯМ

Вучні Дварэцкай НСШ сабралі воінам Чырвонай Арміі, вызваліўшым Чашніцкі раён, кісетаў з тытунём 29, насовак 18, грашыма 400 рублёў. Кіравала зборам піянерважатая Краснік Валя. 12.1.1945 г. дзеці адаслалі падарункі сваім вызваліцелям.

18 лютага 1945 г.

### ДАПАМОГА КАЛГАСНІКАЎ

Калгаснікі калгаса «Чырвоная Дуброва» Слідчанскага сельсавета правялі збор сродкаў дапамогі сем'ям франтавікоў. Сабрана больш 500 рублёў грашыма, 10 м палатна, зярно і г. д. Перадавікамі па збору з'яўляюцца калгаснікі Крывіцкі Павел, Смык Ганна, Крывіцкі Ісак і іншыя.

КСМ арганізацыяй тут праведзен збор на пабудову танкавай калоны «Камсамолец Беларусі». Сабрана 500 рублёў. Тав. Вазняк Сяргей унёс 205 рублёў. Крывіцкая Зося — 110 рублёў.

*Шаціла*

7 мая 1945 г.

**ГЕРОЙ САВЕЦКАГА САЮЗА НА РАДЗІМЕ**

У першамайскія дні працоўныя раёна сустрэлі прыбыўшага на радзіму Героя Савецкага Саюза гвардыі капітана Пшоннага Сяргея Фаміча. Таварыш Пшонны расказаў сваім землякам аб гераічнай барацьбе Чырвонай Арміі на франтах Айчыннай вайны супраць нямецкіх захопнікаў. Ён таксама расказаў аб мужных подзвігах байцоў яго разведвальнага падраздзялення. Яго байцы-разведчыкі старшы сяржант Лявонаў, кавалер ордэна Славы трох ступеней, Круцікаў, Лізікаў, Сцешын, Саплякоў (тройчы ардэнаносцы) прайшлі разам з ім слаўны шлях.

Прызываючы працоўных раёна хутчэй аднавіць разбураную акупантамі народную гаспадарку, тав. Пшонны заверыў сваіх землякоў, што ў час, калі Чырвоная Армія завяршае канчатковы разгром фашысцкіх бандытаў, ён і яго байцы яшчэ мацней будуць знішчаць праклятую гітлераўскую банду.

18 жніўня 1945 г.

**АГІТБРЫГАДА НА СЯЛЕ**

Арганізаваная пры Чашніцкім ДСК агітбрыгада днямі наведала калгасы Цяпінскага і Дварэцкага сельсаветаў. Калгаснікі прагледзелі п'есу «Адплата», паслухалі некалькі нумароў мастацкага чытання, частушкі і песні, а таксама даклад аб выніках Берлінскай канферэнцыі трох дзяржаў. Праз некалькі дзён брыгада выедзе ў другія сельсаветы.

# БАЙЦЫ ЎСПАМІНАЮЦЬ МІНУЛЫЯ ДНІ...

**Яскевіч Якаў Арсенцьевіч** — кавалер ордэна Чырвонай Зоркі, ордэна Айчыннай вайны II ступені, капітан. Нарадзіўся ў в. Копцевічы Чашніцкага раёна. Працаваў у райкоме партыі.

— Вайна для мяне пачалася з абароны Масквы. Тады я быў намеснікам камандзіра асобай зенітнай батарэі 33-й стралковай дывізіі. Гэта было пекла — палі пад Звянігорадам, Рузай, Мажайскам. Пад Смаленскам батарэя збіла ў адным баі адразу два самалёты Ю-87, за што я атрымаў медаль «За адвагу». 3 мая 1942 г. я быў ужо камандзірам батарэі 76-міліметровых гармат 909-га артылерыйскага палка. Пры захопе плацдарма на р. Ака я атрымаў ордэн Чырвонай Зоркі. Курская бітва, фарсіраванне Дняпра, баі за Беларусь, Украіну. У час Курскай бітвы наша батарэя знішчыла шэсць варожых танкаў. Там я быў паранены, за гэту бітву атрымаў ордэн Айчыннай вайны II ступені. Ля Бярдзічава цяжка параніла. Восем месяцаў у шпіталях змагаўся за жыццё, там з радасцю сустрэў Перамогу.

**Пасмурцаў Яфім Іванавіч** – узнагароджаны ордэнам Славы III ступені, Айчыннай вайны I ступені, медалямі «За баявыя заслугі», «За адвагу», «За абарону Ленінграда». Радавы. Нарадзіўся ў в. Сарочына Чашніцкага раёна. Працаваў у сістэме спажывецкай кааперацыі.

– Кожная мая ўзнагарода – гарачыя баі, раненні, кроў. Чатыры разы за час вайны быў цяжка паранены. Нашу чацвёртую марскую брыгаду кінулі на прарыў праз Няву. Лёд ужо трымаў чалавека, але снарады лёгка прабівалі яго. Шмат людзей патанула тады ў ледзяной вадзе. З асколкамі ў нагах даставілі мяне санітары ў шпіталь. Ваяваў на Неўскай Дуброўцы, на Чорнай рэчцы. Пад Нарвай мяне ранілі другі раз. Пасля лячэння трапіў у артылерыю – і зноў раненне, але лёгкае. Пад Кенігсбергам я атрымаў чацвёртую рану, тут для мяне, знявечанага, вайна і скончылася. Але і сёння я не магу забыць тых страшэнных дзён і начэй.



Я. І. Пасмурцаў



В. В. Крывіцкі

**Крывіцкі Васіль Вісарыёнавіч** – узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, ордэнам Айчыннай вайны II ступені, многімі медалямі, камандзір артылерыйскага аддзялення. Старшына. Нарадзіўся ў в. Падмошша Чашніцкага раёна. Працаваў у саўгасе Слідчаны.

– З першага дня Вялікай Айчыннай вайны я ўступіў у бой з ворагам. Ваяваў пад Масквой. Да чырвані награваліся гарматы ў часы баёў. Многа палягло маіх баявых сяброў на беларускай зямлі, у Прыбалтыцы, пад Варшавай і Познанню, пры фарсіраванні Одэра і штурме рэйхстага. Лёс накanаваў мне вярнуцца жывым дадому. Але ў памяці на ўсё жыццё захаваліся загінуўшыя ў баях мае маладыя таварышы.

**Трыбо Міхаіл Патапавіч** – узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «За адвагу», старшына. Нарадзіўся ў в. Забор'е Чашніцкага раёна. Працаваў пасля вайны ў калгасе «Мір» трактарыстам, брыгадзірам паляводчай брыгады.

М. Н. Ганчароў, палкоўнік у адстаўцы, піша пра свайго аднапалчаніна танкіста Трыбо Міхаіла Патапавіча: «Ваяваў мой аднапалчанін мужна і ўмела пад Сталінградам, на Бранскім, Цэнтральным франтах, вызваляў Паўночную Таўрыю, змагаўся пад Курскам, штурмаваў Перакоп. Удзельнічаў у баях за Днепр з Нікапальскага плацдарма. У баях за Сімферопаль ён знішчыў 10-міліметровую гармату і два кулямёты, праявіў мужнасць і адвагу, за што ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

За мужнасць у час аперацыі «Баграціён» ён быў узнагароджаны медалём «За адвагу».

**Скавародкін Павел Міхайлавіч** – радавы, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, ветэран працы папяровай фабрыкі «Чырвоная зорка».

– У перадваенныя гады фабрыка «Чырвоная зорка» была трэцім па сваіх вытворчых магутнасцях прадпрыемствам папяровай прамысловасці рэспублікі. Яе калектыў пры падвядзенні вынікаў сацыялістычнага спаборніцтва па многіх пазіцыях прызнаваўся першым у галіне. Вялікая Айчынная вайна перапыніла стваральную, мірную працу.

За вінтоўкі ўзяліся ўдзельнік грамадзянскай вайны П. Півавараў, токар І. Качаноўскі, начальнік цэха В. Грамакоўскі, іншыя працаўнікі фабрыкі «Чырвоная зорка», усяго больш 60 чалавек.

Гітлераўцы знішчалі савецкіх людзей, чынілі зверствы. У прыватнасці, яны расстралялі дырэктара Чашніцкай папяровай фабрыкі Аўраменку, слесара Барадзенку, рабочага Азоркіна, іншых працаўнікоў гэтага прадпрыемства.

Многія з тых, хто ўзняўся на святую і правую барацьбу з фашысцкімі захопнікамі, загінулі смерцю храбрых на палях бітваў.

Я прайшоў дарогамі вайны ад пачатку яе да Перамогі. Ордэны, медалі маю. Яны сведчаць, што жыцця за Радзіму не шкадаваў. Проста пашанцавала выжыць. Разам са мной пайшлі ваяваць Фелікс Жыжнеўскі, Падалец, іншыя. Пайшлі і аддалі жыццё. У памяць аб загінуўшых ля Дома культуры папераробаў узвышаецца абеліск. На ім радкі: «Вечная слава рабочым і служачым фабрыкі, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны 1941—1945 гг. Ад калектыва фабрыкі «Чырвоная зорка».

**Зянько Андрэй Карпавіч** — радавы, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, ветэран працы папяровай фабрыкі «Чырвоная зорка».

— Да вайны я працаваў на фабрыцы на лесараме. Як і пасля вайны да самай пенсіі. Вайну закончыў, прайшоўшы яе, як гаворыцца, ад званка да званка, і мой брат Мікалай. А вось брат Мяфодзій, які фінскую вайну, затым Вялікую Айчынную адваяваў без аднаго ранення, загінуў пры штурме Берліна за тры дні да Перамогі. І за сябе, і за загінуўшых давялося нам пасля вайны змагацца на працоўным фронце, узнаўляць прадпрыемства. Разам са мной аддана працавалі на фабрыцы ветэраны вайны, ардэнаносцы Іван Іванавіч Пазняк, Уладзімір Пятровіч Палякоў, Павел Міхайлавіч



П. С. Папко



А. М. Хронаў

Скавародкін, Давыд Дзмітрыевіч Багданаў, Міхаіл Мітрафанавіч Шыян, Піліп Цярэнцьевіч Півавараў, Іван Ціханавіч Камоска, Мікалай Гардзеевіч Гунковіч і іншыя. Трэба, каб аб іх жыццях і подзвігах ведалі іх унукі і праўнукі.

**Папко Павел Сямёнавіч** — кавалер ордэна Чырвонай Зоркі, узнагароджаны медалём «За адвагу». Нарадзіўся ў в. Папкі Празямлянскага сельсавета.

— Пайшоў на фронт, так і не паспеўшы перадаць свае паўнамоцтвы старшыні Цяпінскага сельскага Савета, не здаўшы нават сельсавецкую пячатку. У цяжкія гады вайны сумленна выконваў салдацкі абавязак і заўсёды цвёрда верыў у перамогу. У 1942 г. стаў камуністам. Разам з партбілетам захоўваў і пячатку свайго сельсавета.

Так і да Берліна дайшоў.

Пасля Перамогі, калі вярнуўся ў родныя Чашнікі, здаў пячаць савецкім уладам.

Мяне зноў прызначылі старшынёй Цяпінскага сельскага Савета. Пасля ўзначальваў калгас «Перамога», якім кіраваў каля двух дзесяткаў гадоў.

**Хронаў Анатоль Мікалаевіч** — старшы сяржант, кавалер двух ордэнаў Славы, ордэна Чырвонай Зоркі. Нарадзіўся ў в. Казьяны Шумілінскага раёна. Працаваў майстрам, інжынерам-тэхнолагам Чашніцкага малаказавода, старшынёй Савета інвалідаў раёна.

— У пачатку вайны наша падраздзяленне перакінулі з Архангельска на Кольскі паўвостраў. Абараняў Запаляр'е, вызваляў Польшчу. Даводзілася штурмаваць розныя ўмацаванні, браць «языкоў», адбіваць атакі немцаў. І заўсёды быць наперадзе, бо ў 1943 г. быў ужо камуністам. Дарагім для мяне з'яўляецца знак «Выдатны кулямётчык», які ўручылі на фронце. 28 сакавіка 1945 г. на граніцы Польшчы і Чэхаславакіі мяне цяжка паранілі. Дамоў вярнуўся толькі праз паўгода пасля Перамогі.



І. І. Пазняк



М. М. Парцянка

**Пазняк Іван Іванавіч** — кавалер двух ордэнаў Айчыннай вайны (І і ІІ ступені), ордэнаў Чырвонай Зоркі і Чырвонага Сцяга, падпалкоўнік. Нарадзіўся ў в. Слідцы Чашніцкага раёна. Працаваў на папяровай фабрыцы «Чырвоная зорка». Вайну закончыў у званні маёра, камандзірам стралковага батальёна 1-га Прыбалтыйскага фронту.

— На фронт трапіў у верасні 1941 г. Удвая скарацілі тэрмін навучання ў Кіеўскім пяхотным вучылішчы, і мяне, учарашняга выпускніка, з двума «кубарамі» ў пятліцах, прызначылі камандзірам роты. Насмерць стаялі мы пад Ярцавам, Ельняй, Смаленскам і іншымі гарадамі на подступах да Масквы. Але асабліва цяжка давялося пры штурме Сапун-Гары. Крок за крокам узбіраліся мы, ломячы абарону ворага, на гэтыя непрыступныя, як меркавалі фашысты, умацаванні. Многа нашых салдат палягло там. З раніцы да вечара працягваўся штурм. У гуле бою не было чуваць уласнага голасу. І вось урэшце на Сапун-Гары запалымнеў чырвоны сцяг. У нашым стралковым батальёне засталося разам са мной толькі 3 афіцэры і некалькі дзесяткаў салдат. Амаль усе байцы і камандзіры за гэты бой атрымалі ўзнагароды. Мяне ўзнагародзілі тады ордэнам Чырвонага Сцяга.

**Парцянка Мікалай Мікалаевіч** — кавалер 2 ордэнаў Айчыннай вайны (І і ІІ ступені), ордэна Чырвонай Зоркі. Капітан. Нарадзіўся ў в. Навасады Чашніцкага раёна. Працаваў у калгасе «Перамога».

— У час бітвы пад Смаленскам я камандаваў аддзяленнем станковых кулямётаў 38-й стралковай дывізіі. Мы прапускалі праз акопы нямецкія танкі, а потым расстрэльвалі варожых аўтаматчыкаў. Пад Ленінградам стаў франтавым разведчыкам, браў «языкоў». За адзін пошук, калі мы прывялі афіцэра, атрымаў першую, самую дарагую ўзнагароду — медаль «За адвагу». Пасля ранення вясной 1942 г. на працягу 6 месяцаў вучыўся на курсах лейтэнантаў. Спачатку камандаваў узводам аўтаматчыкаў, а потым танкавым узводам у 6-й гвардзейскай танкавай арміі 2-га Украінскага фронту. Прайшоў ад Галіцыі да Прагі, мы бралі Бухарэст, вызвалялі Вену і Прагу. Асабліва жорсткія былі баі ў Венгрыі, у Будапешце і ля возера Балатон. Пад Будапештам мой танк падбілі, і я з экіпажам застаўся яго рамантаваць. Раптам стала вядома аб з'яўленні бадай батальёна немцаў, якія прарваўся праз атакуючыя парадкі нашых войск. Мы агнём танкавай гарматы і кулямёта, пры падтрымцы жменькі пехацінцаў спынілі, а затым ушчэнт разбілі варожую часць. Фашысты здаліся ў палон. Тут жа, на полі бою, мне ўручылі ордэн Айчыннай вайны ІІ ступені. А за вызваленне Вены я атрымаў ордэн Чырвонай Зоркі. Пасля Перамогі, якую мы святкавалі ў Празе, нашы танкі пагрузілі ў эшало-

ны, і мы рушылі на Усход. Давялося штурмавацЬ хрыбет Вялікі Хінган, вызваляць Харбін і Мукдэн, Порт-Артур і Дальні. За выратаванне сцяга танкавай брыгады я быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны І ступені.

**Якаўлеў Аляксандр Піліпавіч** — маёр. Нарадзіўся ў в. Зазерыцы Чашніцкага раёна. Працаваў дырэктарам Зазерыцкай школы.

— На ўсё жыццё запомнілася мне жнівеньская раніца 1943 г. Наш 217-ы мінамётны полк мясціўся ў раёне пас. Якаўлева пад Курскам. Хутка занялі баявыя пазіцыі, запасліся боепрыпасамі. Мы з парторгам і камсоргам яшчэ раз абышлі пазіцыі дывізіёна, правялі кароткія сходы, гутаркі, паставілі канкрэтныя задачы перад разлікам кожнага мінамёта. Ледзь-ледзь заружавела неба, і ў паветры павісла ракета. У магутны гул разрываў снарадаў уліліся і залпы нашага дывізіёна. Умела вялі агонь нашы салдаты.

— Танкі! Таварыш капітан, танкі,— паказаў лейтэнант Лясных.

Яны былі ўжо бачны без бінокля. Магутныя сталёвыя машыны рухаліся прама на пазіцыі дывізіёна. Залп, яшчэ залп. Галаўны танк ахутаўся дымам, а потым загарэўся. Аднак астатнія паўзлі ўперад. Камсорг батарэі Міхаіл Таптышкін пераразрадзіў супрацьтанкавае ружжо, выбраў пазіцыю. І вось ужо задыміўся другі танк, яшчэ адзін трапны выстрал — і трэці адваяваўся. Астатнія танкі павярнулі назад, але хутка немцы пачалі новую контратаку. Дрыжала зямля ад разрываў, дым і пыл плылі над ёй. Мужна змагаліся нашы воіны. Цяжка падлічыць, колькі контратак гітлераўцаў адбілі мы. І ўсё ж — выстаялі, зламалі супраціўленне адборных нямецкіх дывізій. А потым разам з танкістамі перайшлі ў наступленне і авалодалі Прохараўкай, зрабілі прарыў на Белгарад. Мяне ў гэтым баі лёгка паранілА. Хутка я зноў вярнуўся ў свой родны дывізіён. Тады і даведаўся, што за баі пад Курскам усе байцы і афіцэры дывізіёна ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі. Я таксама атрымаў ордэн Айчыннай вайны II ступені. Рознымі франтавымі дарогамі ішоў я потым да дня Перамогі. Вызваляў Кіеў, ваяваў у Поль-



Я. А. Хруцкі (злева)


А. А. Крэгер


М. В. Паўроз


П. С. Александровіч


В. Д. Жыльцоў


П. А. Чумакоў


К. І. Плют


С. А. Будкевіч


П. А. Швара

шчы, Румыніі, біў фашыстаў на іх роднай зямлі. А 9 мая – Дзень Перамогі – сустрэў у сталіцы Чэхаславакіі – Празе. Пасля вайны працаваў дырэктарам Зазерыцкай васьмігадовай школы.

**Дубінец Канстанцін Ціханавіч** – капітан. Нарадзіўся ў в. Прымачына Чашніцкага раёна. Працаваў настаўнікам Чашніцкай СШ № 3.

– Медаль «За абарону Масквы» – адна з першых і дарагіх мне баявых узнагарод. Я быў малады, актыўны ініцыятар ратных спраў. Таварышы па зброі выбралі мяне сакратаром камсамольскага бюро палка. Мая вайсковая спецыяльнасць – артылерыст. Дакладным быў наш прыцэл па ворагу. За вайну маю ордэн Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны II ступені, шматлікія медалі.

**Хруцкі Якаў Архіпавіч** – кавалер 2 баявых ордэнаў, мае 8 медалёў. Нарадзіўся ў в. Старыя Лаўкі Лукомскага сельсавета. Пасля вайны і да выхаду на пенсію працаваў настаўнікам, дырэктарам Стражавіцкай васьмігадовай школы.

– Я з першых і да апошніх дзён вайны ваяваў стралком-радзістам у 29-м гвардзейскім Краснасельскім палку далёкага дзеяння. Наш экіпаж зрабіў 98 вылетаў.

Але асабліва мне запомніўся апошні баявы вылет, з якога цудам вярнуліся жывымі.

26 красавіка 1945 года экіпажу нашага самалёта далі загад – выкінуць над Прагай 3 парашутыстаў.

Палёт аказаўся складаным. Як толькі мы развярнуліся і пайшлі на ўсход, на



А. Л. Гурко



В. Я. Воранаў



А. Р. Петухоўскі



К. Д. Закрэўскі



І. Д. Капусцін



А. М. Астапчык



Я. К. Галай



Ф. Ф. Міцкевіч



З. М. Курак



А. Д. Нікулін

нас накінуўся «месершміт». Паветраны стралок Саша Гура ў адказ адкрыў агонь. Ён паспяхова адбіў 3 атакі ворага. Пасля восьмай атакі ў нас скончыліся патроны ў кулямёце буйнога калібра, замоўкла вежавая пушка. Праследаванні «месершміта» станавіліся ўсё больш нахабнымі. Тады камандзір карабля Міхаіл Пятровіч Сысоеў і другі пілот Іван Пятровіч Каламіец вырашылі пайсці на хітрасць. Выпусціўшы шасі і ўбраўшы газ, самалёт пачаў рэзка зніжацца. Мы з Гурыным пачалі выкідваць набітыя рыззём старыя камбінезоны. Сцярвятнік вырашыў, што наш Лі-2 збіты, і экіпаж пакідае машыну. Ён прыпыніў агонь, але працягваў рабіць кругі вышэй нас. Ля самай зямлі лётчыкі далі газ, маторы зараўлі, і мы паляцелі на брыючым палёце. Фашыст увайшоў у піке. Трасіруючыя кулі перасеклі нам маршрут. Лётчыкі рэзка развярнулі самалёт на 180 градусаў. Варожы самалёт пра-

скочыў і знік. Мы з палёгкай уздыхнулі, і ўжо без перашкод вярнуліся на аэрадром.

## Пераправа

«Пераправа, пераправа... Бераг правы, як сцяна», — потым ужо з'явіліся гэтыя паэтычныя радкі, калі паэт-франтавік асэнсаваў і трагедыі, і гераізм пераадолення водных рубяжоў, умацавання з варожага боку да непрыступнасці. Старшына Ханон Лапус, камсорг аднаго з батальёнаў стралковай дывізіі 21-й арміі, меў не паэтычны, а строга матэматычны вобраз мыслення. А слова гэтае «пераправа» паўтаралася, шукаючы рытму і рыфмы, у свядомасці і падсвядомасці.

Пераадолець шырокі Днепр пад агнём ворага, гэта ведаў кожны баец, давядзецца далёка не ўсім наступаючым. А тут на няўзведзены яшчэ пантонны мост скінулі фашысцкія бамбардзіроўшчыкі свой смяротны груз. Лапус мацаваў пантон з таварышамі ля самага берага. Бомба лягла побач з пантонам. Абдало іх пырскамі. І... толькі кругі па вадзе. Не разарвалася бомба.

— Бомба можа быць замаруджанага дзеяння. Трэба даставаць, — сказаў камбат.

Агітаваць іншых камсоргу не да твару. І старшына Лапус загадаў байцам трымаць канец вяроўкі, якой падперазаўся.

Кажуць, што ў час смяротнай небяспекі перад чалавекам імгненна паўстаюць карціны пражытага. У яго ж адна думка мільганула: «Як без мяне браты малодшыя, сястрычка і маці абыдуцца?»

Бомбу яму з першага разу ўдалося выявіць. Ухапіў яе, прытуліў, як дзіця, да грудзей. На беразе аднапалчане ледзьве адабралі з ягоных рук смяротны груз, ад холаду зайшліся, амярцвелі рукі.

Потым, пасля пераправы, быў у яго час для роздуму пра сябе, пра родных. Не ведаў тады юнак, што адзіны ён застаўся на зямлі з вялікай сям'і Лапусаў.


Х. І. Лапус

Бацьку пры ім забралі, у трыццаць сёмым. Па даносу. Рабінам ён быў. Людзі паважалі Ісака Лапуса за кемлівасць і разважлівасць. Які ж ён «вораг народа» — пацiскалі плячыма жыхары Старога Лукомля. А заступіцца ніхто не мог, бо нават і выказацца людзі баяліся.

Ханон тады ва універсітэце вучыўся. Ён падлягаў выключэнню як сын «ворага народа». Знайшліся спагадлівыя выкладчыкі, паспеўшыя ацаніць ягоныя здольнасці. Вучыўся ён выдатна. Дапамаглі перавесціся на завочнае аддзяленне, а потым спрыялі яму хутчэй універсітэцкую праграму асвоіць, дыплом атрымаць. На работу ў сваім раёне баяліся яго ўзяць, у Халопенічах настаўнічаў да лета сорак першага.

Па стану здароўя не ўзялі ў войска. Ды ў пачатку ліпеня разам з халопеніцкімі хлопцамі-добраахвотнікамі пайшоў у ваенкамат. Накіравалі на курсы толькі малодшых камандзіраў, у званні старшыны і вайну скончыў.

Медалі «За абарону Масквы», «За абарону Сталінграда», «За ўзяцце Кенігсберга», ордэны Славы III ступені і Вялікай Айчыннай вайны II ступені зіхацелі на яго грудзях, калі ў кастрычніку сорак пятага вярнуўся дэмабілізаваны салдат у родную в. Лукомль. Толькі не кінуліся насустрач маці, сястрычка, васьмёра малодшых братоў. Расстралялі іх вылюдкі фа-

шысцкія з іншымі яўрэйскімі сем'ямі, з вясковымі актывістамі.

Як не проста, як балюча, куды цяжэй, чым праз шырокі Днепр пад варожым агнём, было пераправіцца франтавіку праз раку бяздоннага смутку, жалю і нянавісці.

Уратавала работа. Тым больш, што патрабавала яна выпраменьваць цяпло душы. Бо ў кожнага з яго пасляваенных вучняў у Красналуцкай, затым Латыгаліцкай сярэдніх школах, дзе працаваў, быў суровы лёс, вайной апалены, акупацыяй знявечаны.

*Чырвоны прамень, 5 студзеня 1989 г.*

## Выклікаем агонь на сябе

Міхаіл Сідаравіч Крупін — удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, нарадзіўся ў в. Калінаўка Чашніцкага раёна. У Чырвонай Арміі з 1939 г. Скончыў артылерыйскае вучылішча. За баявыя заслугі ўзнагароджан ордэнамі Чырвонага Сцяга і Чырвонай Зоркі, медалём «За абарону Сталінграда» і інш.

Баі ў Высокіх Татрах былі жорсткім і цяжкім выпрабаваннем для нашых байцоў у другой сусветнай вайне.

23 лютага 1945 г. вораг пасля 45-мінутнай артылерыйскай падрыхтоўкі сілай да батальёна лыжнікаў-аўтаматчыкаў атакаваў нашы пазіцыі і, прарваўшы абарону, уварваўся ў с. Вітанава...

Займаючы выгадныя пазіцыі на адгор'і Высокіх Татр, немцы знянацку атакавалі населены пункт. На лыжах, на санітарных лодках з гары прама на КП нашага батальёна скацілася п'яная азлобленая лавіна гітлераўцаў. Здавалася, яшчэ імгненне — і яна змяце жменьку смельчакоў.

КП знаходзіўся ў двух цагляных доміках. З аднаго боку да іх прымыкала гаспадарчая пабудова. У выніку атрымлівалася нешта падобнае на падкову. Гэта забяспечвала кругавую абарону.

Усяго нашых было акружана тры групы. Дзве з іх — адна па чале з капітанам М. С. Крупіным і другая — з капітанам Унукавым знаходзіліся побач і мелі сувязь, трэцяя — з лейтэнантам Панчанкам дзейнічала самастойна.

У адным з паведамленняў аб баявых дзеяннях гаварылася: «Заняўшы частку сяла, немцы сталі блакіраваць кулямётныя і мінамётныя разлікі, дамы, дзе знаходзіліся нашы байцы і афіцэры. Нягледзячы на вялікія сілы праціўніка, байцы пачалі ператвараць усе збудаванні ў вузлы супраціўлення, разгарнулі жорскія баі. Немцы з агнямётаў сталі падпальваць дамы і хлявы».

У адным з дамоў знаходзілася рацыя, тэлефонная сувязь. У доме былі таксама артылерыйскі камандзір капітан Крупін, камсамолка-тэлефаністка Меншыкава і некалькі байцоў. У суседнім доме абараняліся намеснік камандзіра батальёна па страявой частцы капітан Унукаў і з ім група байцоў.

Абедзве групы ўзаемна выручалі адна адну. Крупін трымаў пад абстрэлам немцаў, прыкрываючы домік Унукава, а Унукаў прыкрываў сваім агнём домік Крупіна.

Немцы з усіх бакоў акружылі дом, запалілі яго. Сярод асаджаных было некалькі чалавек забітых і параненых.

Здавалася, чалавечыя сілы на зыходзе. Каб трымацца ў гэтым пекле, людзі рабілі немагчымае. Скончыўся запас вады, і ўсе пакутавалі ад смагі. Столь, сцены распаліліся і патрэскаліся. З трэскам і шыпеннем рухнуў дах, на правым крыле гарэў ганак і дзверы. Выхад быў адзін: пакуль яшчэ не адказала рацыя, выклікаць на сябе агонь сваёй артылерыі. Крупін пры маўклівай згодзе байцоў падышоў да рацыі, каб перадаць свае каардынаты.

Першыя снарады ляглі з недалётам. Але з кожным залпам капітан усё бліжэй і бліжэй падводзіў кусты разрываў. Ужо два пападанні былі прама ў дом. У пакоі капітан Крупін быў адзін. Ён карэкціраваў агонь свайго дывізіёна, а ўсім астатнім загадаў схавацца ў падвале.

Было амаль цёмна, калі, заціснуўшы непрыяцеля ў жалезны кулак, батальён

капітана Сінькова зноў ачысціў вёску.

— Вы героі, сапраўдныя героі! — усхвалявана сказаў камандзір батальёна, абдымаючы сваіх баявых сяброў.

Так закончыўся 12-гадзінны няроўны бой, так закончылася «Вітанаўская эпапея».

*В. Сырватке*

## Апошні бой сяржанта Шаха

— Для мяне вайна пачалася раней, — гаворыць Ермалай Сцяпанавіч Шах. — Давялося мне ўдзельнічаць у фінскай кампаніі, вызваляць Заходнюю Беларусь. Летам сорак першага перажыў горыч адступлення. Як маглі, абаранялі беларускія гарады і вёскі, пад Смаленскам ваяваў, Драгабужам, Ярцавам...

Вяла вайна сваімі дарогамі хлопца з в. Баравыя. Дарогамі нялёгкімі, крывавымі. З акружэння іх вайсковай часці ўдалося прабіцца. Толькі... не на той бок фронту. З франтавых дарог камандзір аддзялення стралковага палка Ермалай Шах вымушаны быў стаць на партызанскія сцяжынкі.

— Гарадзец, Рашчыніна, Малішы, Прыветак... — прыгадвае былы партызан, камандзір аднаго з узводаў 1-й Віцебскай партызанскай брыгады Ермалай Шах населеныя пункты, дзе грамілі нямецка-паліцэйскія гарнізоны, вялі баі з захопнікамі.

Пасля злучэння з перадавымі часцямі Чырвонай Арміі Ермалай Сцяпанавіч прыняў пад камандаванне аддзяленне стралковай роты.

Ваяваць давялося на 1-м Прыбалтыйскім фронце. У адным палку, толькі ў кулямётнай роце, ваяваў яго аднавясковец Навум Шах. Загінуў ён у Прыбалтыцы. А Мацвей Шах паклаў галаву яшчэ перад злучэннем з часцямі рэгулярных войск у партызанах. «З вайны вярнуўся Ігнат Шах і Мірон Корбан. Памерлі ўжо. Жыве ў Чашніках мой аднапалчанін Яфім Александровіч... І мне даюць знаць пра сябе пражытыя гады і раненні. Аднак заўсёды жывая ў душы радасць, што адстаялі мы Радзіму, заваявалі мір для нашчадкаў. Гэтае пачуццё і грэе сэрца...» — Ермалай Сцяпанавіч асцярожна выцірае левае вока. Яно невідушчае. На левай скроні — не шрам, а глыбокая ўмяціна. І не хочаш звяртаць увагу на гэтыя сляды вайны на чалавечым твары, ды кідаюцца яны ў вочы.

Апошні бой для сяржанта Е. С. Шаха быў пад Рыгаю. За сем дзён загадана ўзяць горад, у якім недабіты вораг акапаўся для барацьбы не на жыццё, а на смерць. Задача цяжкая, а выканаць яе трэба.

Калі артпадрыхтоўка скончылася, кожнае з падраздзяленняў пяхоты пайшло на штурм сваіх вышынь. Сяржант Шах прыспешваў падначаленых: «Хутчэй! Хутчэй! Не залягаць пад кулямі». Чапляецца аддзяленне за варожы рубеж абароны з пераплеценымі радамі калючага дроту. У ход ідуць гранаты. Ды агрызаюцца варожыя акопы аўтаматным агнём. Але ж расцякаецца аддзяленне, захоплівае плошчу. Новы паварот. Развілка. Ворагі, ашаломленыя спярша, пачалі адстрэльвацца. Перад імі толькі адна мужная фігура савецкага воіна. Падбегшыя праз нейкія хвіліны байцы аддзялення ўбачылі акрываўленага сяржанта, распластанага на зямлі. Побач — некалькі трупаў у шэрых шынялях.

— Пасля шпіталя першую групу інваліднасці мне далі. Фізічна працаваць дактары забаранілі. Вартаўніком у калгасе быў, — расказвае пра сваё пасляваеннае жыццё ў родных Баравых Ермалай Сцяпанавіч. — Дваіх сыноў вырасціў.

З любові да роднай вёскі брала выток вялікая любоў Ермалая Сцяпанавіча да ўсёй Айчыны, за свабоду якой жыцця не шкадаваў.

*Чырвоны прамень, 1 ліпеня 1986 г.*

## Памяць сэрца гаворыць

Як лепшага працаўніка праўленне калгаса ў Малых Ліпавічах накіравала ў 1937 г. Аляксандра Пашкова на вучобу ў рэспубліканскую школу малодшых кіруючых работнікаў. Вярнуўся хлопец рахункаводам. Вайну Аляксандр сустрэў у арміі, куды незадоўга да гэтага яго прызвалі. Атрымаў спецыяльнасць механіка-вадзіцеля танка.

Першая няроўная бітва з ворагам пад Ельняй, жорсткія кровапралітныя баі пад Масквой, Валакаламскам... Потым былі баі за Мінск, іншыя гарады роднай Беларусі.

Ён добра памятае адзін з баёў пад Лідай. Падаўляючы супраціўленне гітлераўцаў, танкісты падышлі амаль да самага горада. Праціўнік моцна абараняўся, неаднаразова прымяняючы контратакі. Але наступленне савецкіх танкістаў было такім рашучым, што вораг не вытрымаў. Ліда была вызвалена. У тым баі экіпаж, у саставе якога быў Аляксандр Пашкоў, знішчыў два варожыя танкі. Неаднаразова гарэў Аляксандр Ягоравіч у танку, але, напэўна, лёсам наканавана было яму застацца жывым.

Радзіма высока адзначыла мужнасць свайго салдата. У святочныя дні на яго грудзях ззяюць ордэн Чырвонай Зоркі, медалі «За абарону Масквы», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.»

*М. Азёрны*

## Тры ордэны — за Беларусь

У краязнаўчым музеі Кашчынскай СШ сярод шматлікіх экспанатаў аддзела, які расказвае аб гадах Вялікай Айчыннай вайны, ёсць кніга. Гэта не зусім звычайны экспанат. Кнігу падарыў музею наш зямляк, былы настаўнік, ветэран Вялікай Айчыннай вайны Міхаіл Рыгоравіч Шумель.

Міхаіл Рыгоравіч — з тых франтавікоў, што прайшлі вайну ад першага яе дня да апошняга. Ён якраз праходзіў воінскую службу, калі на нашу краіну напалі фашысты. У многіх баявых аперацыях давялося ўдзельнічаць маладому танкісту. Як успамінае ветэран, самымі дарагімі і памятнымі для яго сталі бітва за Маскву і Беларуская аперацыя.

Да чэрвеня 1944 г. Міхаіл Шумель удзельнічаў у баях за Маскву і Тулу, пабываў у шпіталі пасля ранення, скончыў танкавае вучылішча ва Ульянаўску, камандаваў узводам у Новагарошынскім цяжкатанкавым палку прарыву.

23 чэрвеня 1944 г. танкавае падраздзяленне накіравалі пад Оршу для прарыву абароны праціўніка. Хутка танкавай роце ўдалося блакіраваць адзін з участкаў нямецкай абароны. За правядзенне гэтай баявой аперацыі Міхаіла Рыгоравіча Шумеля ўзнагародзілі ордэнам Айчыннай вайны II ступені.

А Чырвоная Армія рухалася на захад, вызваляючы шматпакутную беларускую зямлю ад гітлераўскіх захопнікаў. У саставе часцей, што вызвалялі Барысаў і Мінск, быў і танк Міхаіла Шумеля. Пасля ліквідацыі мінскай групіроўкі ворага да ранейшых узнагарод франтавіка дадаецца ордэн Чырвонай Зоркі.

Ёсць у Міхаіла Рыгоравіча і ўзнагарода за ўдзел у Беларускай аперацыі — другі ордэн Айчыннай вайны. Атрымаў яго бясстрашны танкіст за ажыццяўленне ў саставе танкавай роты прарыву фронту ва Усходняй Прусіі.

Пасля вайны Міхаіл Рыгоравіч Шумель — таксама на пярэднім краі. Спачатку ён працаваў старшынёй Ляхавіцкага сельсавета, а потым 25 гадоў — настаўнікам.

*С. Мікульская*

## Дарогі праз вайну

У кожнага з прадстаўнікоў майго пакалення была свая дарога праз вайну, кожны меў свой фронт, свой рубеж абароны. Бо нікога не пакінула ўбаку Вялікая Айчынная. Я маю медалі «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941 – 1945 гг.», «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941 – 1945 гг.». Да вайны я быў старшынёй калгаса ў вёсках Проземля і Мокавічы, потым старшынёй Цяпінскага сельсавета, інспектарам фінансавага аддзела райвыканкома.

Мяне па стану здароўя ў армію не ўзялі. Яшчэ ў дзяцінстве пашкодзіў правае вока. Эвакуацыя дакументаў, дзяржаўнай маёмасці – вось якую баявую задачу выконваў.

У Краснаярскім краі, месцы эвакуацыі, мне даверылі пасаду старшыні сельскага Савета. Не адну заяву пісаў, каб накіравалі ў армію. Урэшце трапіў у дывізію, што фарміравалася ў Краснаярску. Прайшоў курсы вучобы на мінамётчыкаў. Накіравалі нас на Ленінградскі фронт. Быў трэцім нумарам разліку мінамёта. У апошнім баі загінулі першы і другі нумары. Змагаўся да канца, пакуль не засыпала ў акопе. Потым шпіталь. Эвакуацыя па «дарозе жыцця» на Вялікую зямлю. Зноў пасада старшыні сельскага Савета.

У блакадным Ленінградзе прынялі кандыдатам у члены партыі. Ужо на старшыньскай пасадзе стаў членам Камуністычнай партыі. Вайна працягвалася. Бязлітасная, крывавая. Шмат рабілі жыхары, гаспадаркі і прадпрыемствы сельсавета для набліжэння Перамогі. Дэвіз быў тады адзін: «Усё для фронту!»

Каб быць больш карысным для Радзімы, у грозны час падаў заяву з просьбай перавесці на работу непасрэдна ў вытворчасць. У райкоме партыі ўлічылі маё жаданне, даручылі вялікую прамарцель, якая выраблялa абутак і зімовую вопратку для франтавікоў. На пасадзе дырэктара арцелі і заслужыў свой тылавы медаль.

На Віцебшчыну прыехаў, калі абласное кіраўніцтва знаходзілася яшчэ ў Лёзна. Працаваў у Віцебскім абласным фінансавым аддзеле. Але калі вызвалілі Віцебск нашы войскі і я дачуўся, што сям'я мая жыве ў Чашніцкім раёне, папрасіўся, каб адпусцілі працаваць у родны куток.

Пасля вайны розныя пасады меў: інспектар райфа, начальнік райсабеса, дырэктар хлебазавода, старшыня райспажыўсаюза.

*А. Друц*

## Адданасць

Чэрвень 1939 г. Першы выпуск Чарэйскай СШ пакідаў родныя сцены. Куды завядуць іх жыццёвыя дарогі?

Невысокі, хударлявы, з кароткім светлым чубам Анатоль Шыбека ведаў, што яго аднакласнікі Віктар Раманаў, Яўген Сушкін, Мікола Старавойтаў, Валодзя Паўлаў, Леанід Шыдлоўскі, Яхім Кудраўцаў восенню стануць курсантамі ваенных вучылішчаў або чырвонаармейцамі. Яму ж давядзецца чакаць яшчэ год.

Першага верасня 1939 г. учарашні дзесяцікласнік Анатоль, цяпер ужо Дзмітрыевіч, пераступіў парог першага класа новай сярэдняй школы ў Лукомлі ў якасці стажора.



А. Д. Шыбека

У хуткім часе Анатоля Дзмітрыевіча перавялі ў в. Ротна, дзе адкрылася новая сямігодка, а на 1940/41 навучальны год ён быў прызначаны загадчыкам аднакамплектнай пачатковай школы ў вёсцы Асяродкі.

Праз некаторы час з групай хлопцаў-землякоў прыбыў у далёкі Ашхабад.

Служыў добра, старанна, авалодваў ваеннай справай. Скончыў палкавую школу, у паходах і вучэннях набыў фізічную загартоўку. І раптам вайна.

Камандзір аддзялення малодшы сяржант Шыбека адразу ж пасля мітынга падаў рапарт аб адпраўцы на фронт. А яго, накіравалі ў Іран, і зноў рапарт. Начальнік палітаддзела дывізіі палкавы камісар Бурмістраў пасля кароткай гутаркі сказаў:

— Накіруем вас на вучобу.

Фрунзенскае пяхотнае вучылішча скончыў выдатна. Лейтэнанта Шыбеку прызначылі намеснікам камандзіра кулямётнай роты ў запасной брыгадзе, дзе ён вучыў чырвонаармейцаў вайсковай справе — валоданню станковым кулямётам. А ў пачатку 43-га лейтэнант Шыбека стаў слухачом вышэйшых афіцэрскіх курсаў. Ішла падрыхтоўка камандзіраў кулямётных батальёнаў. Пасля заканчэння накіравалі ў Запарожжа, дзе 8-я гвардзейская армія вяла цяжкія баі.

Фарсіраваць Днястроўскі ліман з ходу не ўдалося, і армія начнымі пераходамі адправілася ў раён Цірaспаля з задачай скрытна выйсці ў раён фарсіравання Днястра. 10—11 мая каля малдаўскіх сёл Тамлены і Бутэны ішлі напружаныя крывапралітныя баі. Рота страціла большасць свайго саставу. За кулямёт ужо не першы раз лажыцца сам камандзір. На досвітку, калі ён, падняўшыся з невялічкага акопчыка, хацеў даць чаргу, раздаўся выбух. Кулямёт перавярнула на бок. Лейтэнант імгненна прысеў, але хутка падняўся, паставіў кулямёт на колы і даў некалькі кароткіх чэргаў.

Стала ціха. А калі трохі развіднела, сяржант, што выконваў абавязкі другога нумара, угледзеўшыся, спытаў:

— Лейтэнант, а што ў цябе з вокам?

Тады і ўспомніў момант выбуху: нешта балюча ўдарыла ў вока. Прыкрыў левую рукой... цёмная ноч. Маленькі асколачак прабіў вочнае яблыка, вока выцекла.

Не пакінуў баявых парадкаў лейтэнант Шыбека, бо ў батальёне не засталося ніводнага афіцэра. Яшчэ двое сутак трымаў абарону з рэшткамі батальёна, пакуль не кантузіла, парушылася мова, мучыў страшэнны боль.

Лячыўся ў Адэсе, у Днепрапятроўску, а калі выпісалі і прапанавалі працаваць у ваенкамаце — упрасіўся зноў на фронт. Удзельнічаў у вызваленні Румыніі, Балгарыі, Венгрыі, Югаславіі і Аўстрыі. Дзень Перамогі сустрэў у аўстрыйскім с. Рорбах. Праз месяц назначылі начальнікам аператыўнага аддзела штаба палка на Каўказе, затым — на Украіне. Дэмабілізаваўся ў маі 1947 г.

Праз год у роднай вёсцы адкрылася сямігодка. Свайго памяшкання не было. Класы размясціліся па хатах. Дырэктарам школы прызначылі Анатоля Дзмітрыевіча Шыбеку. Паўстала пытанне будаўніцтва школы. Будавалі і настаўнікі, і бацькі, і вучні. Дырэктар сам валіў лес, вазіў бярвенні, цэглу, дошкі, гонт. Пабудавалі сваю невялікую, на пяць класных пакояў, школу. Яна і зараз працуе — Тоўпінская васьмігадовая.

За поспехі ў навучанні і выхаванні дзяцей А. Д. Шыбека першым у раёне ўзнагароджаны значком «Выдатнік народнай асветы БССР». У 1954 г. скончыў Віцебскі настаўніцкі інстытут, а потым біяфак БДУ імя У. І. Леніна. Да выхаду на пенсію працаваў у школах раёна, праводзіў вялікую ваенна-патрыятычную работу сярод моладзі.

*Чырвоны прамень, 2 верасня 1989 г.*

## Ён пражыў некалькі жыццяў

Равеснік рэспублікі Ілля Фёдаравіч Ніканаў ішоў яе дарогамі, падзяляў з ёй свой лёс. Не адну пару лапцей знасіў, пакуль скончыў школу-сямігодку ў роднай в. Старыя Лаўкі.

Паскораны выпуск пяхотнага вайсковага вучылішча не прадракаў маладым камандзірам лёгкага жыцця. Ды новаспечаны лейтэнант Ілля Ніканаў не мог без задавальнення глядзець на ўласную армейскую форму.

Вайну сустрэў пад Баранавічамі. Камандаваў узводам кулямётчыкаў. Кантужанага, прысыпанага зямлёю, яго ці за забітага палічылі, ці ў спешцы адступлення не заўважылі ўвогуле. Ачуняў, калі побач размаўлялі ворагі. Калі яны адышлі, Ілля Фёдаравіч адпоўз у лясок, які быў побач. Перайсці лінію фронту яму не ўдалося.

Блуканні прывялі на родную Чашнiччыну. Спярша быў у брыгадзе Лявонава, узводам камандаваў. Потым яго накіравалі ў 2-ю Беларускую брыгаду.

Дарага каштаваў прарыў ля возера Палік. І сёння жудасна ўспамінаць, колькі людзей там загінула, як пакутавалі ад холаду, голаду, ад няспыннага адчування гібелі. Шмат палягло хлопцаў і з яго атрада. Адзінкі прарваліся...

Палік і для яго амаль не стаў магілай. Пры пераходзе на другі бераг Бярэзіны некаторыя партызаны, асабліва тыя, хто не ўмеў плаваць, не бачачы выйсця, бралі ў рукі станковы кулямёт ці які другі цяжкі груз і са словамі «Бывай, Радзіма» свядома танулі. Каб толькі пазбегнуць нямецкай кулі ці здзекаў фашыстаў.

Бярэзіну ён пераадолеў, перабраўся. Але і там не было паратунку. Калі яшчэ мокры, знясілены сядзеў Ілля Фёдаравіч разам з таварышам ля берага ракі, пачуў, што ідуць немцы прачэсваць лес. Рашылі ратавацца кожны паасобку.

Адбегшы ў балоцісты лес, Ніканаў пад карэнні вывернутага дрэва паклаў



І. Ф. Ніканаў з унукамі

аўтамат, а сам з пісталетам у руках схаваўся побач. Блізка чулася нямецкая гаворка, тупат салдацкіх ботаў. На шчасце, сабак не было. І раптам немцы пачалі страляць. Адзін з іх страляў ля таго месца, дзе схаваўся Ілля Фёдаравіч. Але ў хуткім часе ўсё сціхла.

Вечарэла. Трэба вылазіць са свайго спрату. Але ад нервовай напружанасці і нерухомасці, ад холаду мокрыя ногі і рукі так здранцвелі, што доўгі час ён не мог варухнуцца. Падумалася: «Тут, мабыць, і магіла мая». Ды самому стала сорамна ад такіх думак. Як жа, столькі перажыў, выратаваўся, і цяпер паміраць? «Не, лейтэнант Ніканаў,— загадаў сам сабе,— не будзь панікёрам!» Сабраўшы апошнія сілы, ён з цяжкасцю выбраўся з-пад таго вываратня.

Пасля вызвалення Беларусі радавым кулямётчыкам дайшоў да Одэра акружэнец Ілля Ніканаў. Там яго цяжка параніла.

— Дзень Перамогі сустрэў у шпіталі. Як загаіліся раны, дэмабілізавалі. У Старых Лаўках пасля вайны нікога з родных не засталося. Бацька памёр. Маці да сястры пераехала. Падаўся і я да іх. Ды пацягнула потым на Чашніччыну...— расказваў Ілля Фёдаравіч.

Жыццё давялося пачынаць спачатку. Уладкаваўся ў школе фізруком. Завоч-

на закончыў педвучылішча. Так і працаваў усё сваё пасляваеннае жыццё Ілля Фёдаравіч Ніканаў настаўнікам у Пачаевіцкай школе.

*Н. Кіндзяева*

## Подзвіг на граніцы

У жніўні 1944 г. нашы войскі, вызваліўшы ад акупантаў Літву, падышлі да граніцы гітлераўскай Германіі.

631-ы стралковы полк, у складзе якога ваяваў радавы Міхаіл Яўгенавіч Серафімовіч, падрыхтаваўся да прарыву абароны праціўніка каля пагранічнай в. Жвіргждайчай.

У хуткім часе тут разгарнуліся жорсткія баі. Немцы неаднаразова кідаліся ў контратаку, уводзілі ў бой рэзервы. А калі фашысцкія танкі прарваліся на пазіцыі палка, стралкі ўзялі ў рукі супрацьтанкавыя гранаты.

За адным танкам пільна сачыў Міхаіл Серафімовіч. Як толькі сталёвая пачвара наблізілася да акопа, баец кінуў пад гусеніцы гранату. Экіпаж, які вымушаны быў пакінуць машыну, Міхаіл знішчыў агнём аўтамата.

17 жніўня 1945 г. полк падышоў да пагранічнай р. Шэшупе. Першым з двума таварышамі на варожы бераг пераправіўся Міхаіл Серафімовіч. Аднак байцы трапілі пад кулямётны агонь, які вялі фашысты з дзота. Смельчакі не разгубіліся. Яны абышлі дзот і закідалі яго гранатамі.

Шлях на Захад быў адкрыты. За подзвігі ў баях каля в. Жвіргждайчай радавы Міхаіл Серафімовіч узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

З вайны Міхаіл Яўгенавіч Серафімовіч не вярнуўся. Ён загінуў у баях з фашыстамі. Родныя яго жывуць цяпер у в. Ясная Горка Латыголіцкага сельсавета. А імя Міхаіла жыве ў памяці нашых братоў-літоўцаў, на чыёй зямлі ажыццявіў свой ратны подзвіг беларускі юнак.

*П. Фралоў*

## Чалавек незвычайнага лёсу

Позняй восенню 1942 г. у пензенскай в. Сцяпанаўка Таццяна Пятроўна Багамолава атрымала ліст: «Ваш сын старшы сяржант Багамолаў Аляксей Іванавіч... у баі за сацыялістычную Радзіму, верны воінскай прысязе, праявіўшы геройства і мужнасць, быў забіты...»

Многа год давялося пражыць Таццяне Пятроўне з цяжкімі думкамі аб загінуўшым сыне. І толькі пазней даведалася, што, на шчасце, яе сын застаўся жывым.

...Пасёлак Васілеўшчына на пагорку, як на далоні. У зеляніне дрэў будынкі: драўляныя і цагляныя. У цэнтры ўзвышаецца царква. Танкісты батальёна Кульбачава ведаюць, што яна біткам набіта нашымі ваеннапалоннымі. Гэта ўскладняе штурм. А ёсць баявы загад: выбіць ворага, захапіць населены пункт Васілеўшчына.

Танкі пайшлі ў атаку. Фашысты абстрэльвалі іх са сваіх надзейных умацаванняў. Загарэўся адзін танк, другі... Трапіла міна і ў гусеніцу машыны Багамолава.

Экіпаж пад агнём выскачыў з люка. Багамолаў і зараджаючы танка Іпарскі падхапілі расцягнутую гусеніцу, ускінулі на каткі.

Скляпалі. Паехалі да рамонтнага пункта. Вечарам зноў былі тут, ля Васілеўшчыны.



А. І. Багамолаў

Пасля першай няўдалай атакі танкісты рыхтавалі другую. Дасканала абследавалі мясцовасць. Узялі на ўлік кожны варожы дзот, умацаванне. Кожны танкавы экіпаж атрымаў канкрэтнае заданне знішчыць пэўны дзот. Атрымаў «свой» дзот і экіпаж Багамолава.

Новая атака. Наперадзе рэчка Пола. Нешырокая, але топкая. Не зніжаючы хуткасці, Багамолаў на хаду выбраў месца, дзе зручней фарсіраваць раку. Рухавая «трыццацьчацвёрка» падмяла гусеніцамі прыбярэжны куст — на тым баку. Вось і «свой» дзот. Ён быў пусты. З умацавання пачалі выходзіць немцы з паднятымі рукамі. Палонных здалі падаспеўшай пяхоце. Рушылі далей. Пасёлак ззаду, наперадзе стажок сена. Але ў глядзельную шчыліну заўважылі — гэта ж замаскіраваны варожы танк. Выстралілі ў яго — «стажок» загарэўся.

Тут лугавінка, наперадзе і злева лес. Раструшчылі тры гарматы і тры варожыя самаходкі. Пра лясок з левага боку забыліся. Адтуль трапіў варожы снарад прама ў бок машыны. Танк успыхнуў.

Багамолаў першым схапіў кулямёт, выскачыў, залёг у варонку ад снарада. Побач вухнуў снарад, засыпаў яго зямлёй.

Ноччу байцы адкапалі яго. Выцягнулі з камбінезона камсамольскі білет і воінскую кніжку і адправілі ў штаб.

Пахавальная каманда прыйшла сюды на трэція суткі. У брацкую магілу знасілі забітых. Падхапілі і Багамолава. Здзівіліся: нейкі не такі, як усе. Не закалянеў.

Адправілі ў шпіталь. Так са штаба пайшла пахавальная да маці, а ваенныя ўрачы зноў паставілі Багамолава на ногі. На танку ваяваць ужо не мог. Сеў за руль аўтамашыны. Падвозіў боепрыпасы на перадавую. Праехаў праз Беларусь, укаціў у самы цэнтр Берліна.

Па волі лёсу ён застаўся жыць і працаваць на Віцебшчыне, у в. Іканкі Чашніцкага раёна, ажаніўся на Ніне Іванаўне. Але ж трэба дамоў наведацца ў сваю Сцяпанаўку на Пензеншчыне. Там яму бацькі і аддалі пахавальную.

Аляксей Іванавіч паказаў яе ў Чашніцкім ваенкамаце. Звязаліся з Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругай. Адтуль вышэй. Подзвіг Аляксея Багамолава адзначаны ордэнам Леніна 30 кастрычніка 1942 г. Уручаны ён быў уладальніку роўна праз дваццаць пяць гадоў. Уручыў узнагароду маршал бронетанкавых войск П. А. Ротмістраў.

*Паўлаў В. //Віцебскі рабочы, 1 мая 1981 г.*

## Праз вогненны небасхіл

Вестка аб вайне застала Паўла Абраменкава тут, у Ладзейным Полі пад Ленінградам. І адразу, здаецца, стаў ён старэйшым. Яшчэ ўчора ўсё было проста і зразумела: прыехаў з вёскі, што на Браншчыне, сялянскі сын Павел Абраменкаў на будаўніцтва Кіраўскай чыгункі між Ленінградам і Мурманскам, працаваў рабочым па ўкладцы рэек, потым стаў шафёрам. А сёння, разам з усімі, васемнаццацігадовы вадзіцель стаў працаваць на будаўніцтве чыгункі праз Ладажскае возера.

Потым быў вучэбны танкавы полк, дні і месяцы асваення грознай баявой машыны. Тут спатрэбілася Паўлу яго прафесія шафёра. У вучэбным палку ён авалодаў і радыётэхнікай. На фронт адпраўляўся памочнікам механіка танка і адначасова радыётэлеграфістам.



П. М. Абраменкаў

Ці то начальства пажартавала, ці проста выпала так, але экіпаж падабраўся з людзей, што насілі амаль аднолькавыя прозвішчы — памочнік механіка Павел Абраменкаў, зараджаючы Пятро Абраменка, вежавы стралок Абрамаў Георгій і механік — Кугаенка Іван. Летам 1943 г. гэты танкавы экіпаж удзельнічаў у цяжкіх баях на 2-м Украінскім фронце, вызваляў Знаменку і Александрыю. Старшага сяржанта Паўла Абраменкава за мужнасць і воінскае ўменне ўзнагародзілі медалём «За баявыя заслугі».

Пазней старшаму сяржанту Паўлу Абраменкаву разам з танкавым экіпажам давялося разграміць аэрадром. Стаялі там «юнкерсы» ды «месершміты», і каб падавіць іх прыземістымі «трыццацьчацвёркамі», вырашылі абломваць фашысцкім самалётам «хвасты». 95 самалётаў поўнасцю вывелі са строю.

За гэтую аперацыю камандзір танкавага экіпажа лейтэнант Якаўлеў быў прадстаўлен да звання Героя Савецкага Саюза, капітан Сакаленка ўзнагароджаны ордэнам Леніна, а старшы сяржант Абраменкаў — ордэнам Славы II ступені. Ордэнам Славы III ступені ён быў узнагароджаны за храбрасць пры вызваленні Кіравагграда.

А потым «дамалочваў» танкіст Абраменкаў фашыстаў, акружаных у Корсунь-Шаўчэнкаўскім катле. Неаднаразова быў паранены і кантужаны, але зноў і зноў вяртаўся ў строй. У сакавіку 1944 г. быў прыняты ў партыю.

Ваяваў танкіст Абраменкаў пад Мінскам, пад Брэстам і Варшавай. Не забыць ветэрану, як пры прарыве варожай абароны на поўнач ад Варшавы лоб у лоб сутыкнуўся яго танк з фашысцкім «тыграм». Жудасную «рукапашную» выйгралі нашы танкісты. І былі яшчэ баі пад Берлінам і ва Усходняй Прусіі, штурм Кенігсберга і ярасны бой за Губінен (зараз Гусеў). Ордэнамі Чырвонай Зоркі і Айчыннай вайны II ступені адзначыла Радзіма доблесць і воінскую адвагу свайго сына.

Доўгачаканы дзень Перамогі сустрэў старшына Абраменкаў на Эльбе. Яшчэ тры гады служыў у арміі.

...З 1965 г. Абраменкаў жыве і працуе ў Новалукомлі. Да лістапада 1969 г. быў сакратаром парткома будаўніцтва флагмана беларускай энергетыкі — Лукомскай ДРЭС, потым стаў намеснікам дырэктара станцыі. Прызнаннем вялікіх заслуг Паўла Мітрафанавіча ў справе будаўніцтва і якаснай работы Лукомскай ДРЭС з'явілася ўзнагароджанне яго ў 1971 г. ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

Адметная рыса характару і стылю работы Паўла Мітрафанавіча Абраменкава — чуласць і ўвага да людзей, клопаты аб іх. У лёсе многіх новалукамчан прыняў асабісты ўдзел гэты просты ў абыходжанні, шчыры і абаяльны чалавек, многім дапамог — парадай, падтрымкай, цёплым словам.

*Р. Раманаў*

## Загінуўшыя ўдзельнікі патрыятычнага падполля, партызаны, асобы, якія актыўна садзейнічалі партызанскаму руху і патрыятычнаму падполлю, члены іх сем'яў, мірныя жыхары партызанскіх зон і раёнаў, што падвергліся фашысцкаму тэрору

### АКЦЯБРСКІ ПАСЯЛКОВЫ САВЕТ

#### ВЁСКА БАЯРЫ

**ЗЯМКО Аляксей Нічыпаравіч,** расстраляны за сувязь з партызанамі.

**ЗЯМКО Пётр Андрэевіч,** н. у 1924, партызан Смаленскага палка, прапаў без вестак у 1943.

**ЗЯМКО Яўген Фядосавіч,** расстраляны за сувязь з партызанамі.

**КАСЦЯНКА Вольга Сцяпанаўна,** расстраляна за сувязь з партызанамі.

**ПАДАЛЕЦ Фядосія Антонаўна,** расстраляна за сувязь з партызанамі.

**СЕРАБРО Гаўрыла Данілавіч,** н. у 1874, расстраляны за сувязь з партызанамі.

**СЕРАБРО Марыя Фёдараўна,** расстраляна за сувязь з партызанамі.

**СЕРАБРО Міхаіл Захаравіч,** расстраляны.

**СЕРАБРО Міхаіл Цімафеевіч,** н. у 1922, расстраляны за сувязь з партызанамі.

**СЕРАБРО Сямён Кірылавіч,** н. у 1925, партызан брыгады імя У. І. Леніна, прапаў без вестак пры выкананні баявога задання ў 1943.

**СЕРАБРО Уладзімір Гаўрылавіч,** н. у 1912, партызан, прапаў без вестак у час нямецка-фашысцкай блакады.

**СЕРАБРО Яфім Астапавіч,** партызан, загінуў пры выкананні задання.

#### ВЁСКА ВЯЛІКАЯ ВЯДРЭНЬ

**АЛЕКСАНДРОВІЧ Аляксей Сцяпанавіч,** н. у 1925, партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў у 1943.

**БАРАДАЎКА Прохар Ігнатавіч,** н. у 1923, партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў у 1943 пры выкананні баявога задання ў в. Кулікі Сенненскага раёна.

**ДАРАШКЕВІЧ Уладзімір Мікітавіч,** н. у 1924, партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў у 1943.

**ДОЎГІ Пётр Максімавіч,** партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, прапаў без вестак 18.06.1944.

**ЗАЛЕСКІ Дзмітрый Антонавіч,** партызан, загінуў у 1943.

**ЗАЛЕСКІ Іван Прохаравіч,** партызан.

**ЗАЛЕСКІ Яўген Прохаравіч,** партызан.

**ЗЕЛЯНУХА Віктар Арцёмавіч,** партызан, прапаў без вестак 18.06.1944.

**ЗЕЛЯНУХА Дзмітрый Васільевіч,** н. у 1921, партызан брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў у 1943.

**КАРУНЕЦ Дзям'ян Фёдаравіч,** партызан, прапаў без вестак.

**КІРКІЖ Захар Міхайлавіч,** партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, прапаў без вестак 18.06.1944.

**КІРКІЖ Мікалай Аляксеевіч,** н. у 1921, партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, у 1943 пры выкананні баявога задання на тэрыторыі Сенненскага раёна расстраляў усе патроны па ворагу, падарваў сябе апошняй гранатай.

**ПАДАЛЕЦ Павел Савельевіч,** партызан 1-й брыгады К. С. Заслонава, загінуў у 1943 пры выкананні баявога задання.

**ПАЛЬЧЭХ Васіль Васільевіч,** партызан, прапаў без вестак 18.06.1944.

**ПАНКРАТАЎ Фядос Якаўлевіч,** разведчык 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў у 1943.

**СЛАВАК Мікалай Іванавіч,** партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў 25.01.1944.

**СЛАВАК Міхаіл Іванавіч,** н. у 1921, партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў у 1943 у в. Кулікі Сенненскага раёна.

#### ВЁСКА МАЛАЯ ВЯДРЭНЬ

**КАВАЛЕНКА Андрэй Аляксандравіч,** н. у 1916, загінуў у баі ў 1943.

**НОРКА Мікалай Рыгоравіч,** н. у 1901, забіты немцамі ў 1943.

### ПАСЁЛАК МІЦЬКАЎЦЫ

**МІЦЬКАВЕЦ Максім Мацвеевіч,** н. у 1907, партызан 1-й брыгады імя К. С. Заслонава, загінуў у 1943.

### ПАСЁЛАК ПЕРШАЕ МАЯ

**ХАТКЕВІЧ Мікалай Пракопавіч,** партызан, прапаў без вестак 30.04.1944.

### ВЁСКА ХАРАКОВА

**ШЫПУЛЯ Іван,** н. у 1910, партызан, загінуў у 1944.

## АЛЬШАНСКІ СЕЛЬСАВЕТ

### ВЁСКА АЛЬШАНКА

**АЛЕКСАНДРОВІЧ Васіль Ільіч,** партызан, прапаў без вестак у маі 1944.

**АЛЕКСАНДРОВІЧ Іван Ільіч,** партызан, прапаў без вестак.

**МІЦЬКАВЕЦ Кузьма Ульянавіч.** Расстраляны немцамі ў пачатку вайны.

**ПАДАЛЕЦ Сцяфан Паўлавіч,** партызан Лёзненскай брыгады, загінуў 22.06.1944 ля возера Палік.

**ПАДРЭЗ Ісак Сцяфанавіч,** партызан Чашніцкай брыгады «Дубава».

**ПУЗАНАЎ Васіль Сямёнавіч,** партызан Чашніцкай брыгады «Дубава», прапаў без вестак 14.03.1943.

**ПУЗАНАЎ Мяфодзій Сямёнавіч,** партызан, прапаў без вестак.

### ВЁСКА АСТАШОВА

### Мірныя жыхары, расстраляныя фашысцкімі карнікамі ў 1943

**БАРАДАЎКА В. В.,** н. у 1925.
**БАРАДАЎКА Е. А.,** н. у 1938.
**ДОЎГАЯ В. Б.,** н. у 1892.
**ДОЎГАЯ К. Ф.**
**ДОЎГАЯ М. К.**
**ДОЎГІ Е. Ф.**
**ЖАЎНО А. Я.,** н. у 1914.
**ЖАЎНО Н. Я.,** н. у 1940.
**ЖАЎНО Я. К.,** н. у 1903.
**КАЗЛОВА Е. Т.,** н. у 1900.
**КАЗЛОЎ Е. Ф.,** н. у 1938.
**КАТУЛЬСКАЯ А. Ф.,** н. у 1900.
**КАТУЛЬСКАЯ А. Х.,** н. у 1900.
**КАТУЛЬСКАЯ Е. І.,** н. у 1900.
**КАТУЛЬСКАЯ Е. Н.,** н. у 1942.
**КАТУЛЬСКАЯ Н. С.,** н. у 1938.
**НАСЫР А. П.,** н. у 1910.
**НАСЫР Е. В.,** н. у 1943.



К. У. Міцькавец з маці і сястрой

**ПЯСЕЦКАЯ С. Т.,** н. у 1895.
**ХАРКЕВІЧ А. Я.,** н. у 1897.
**ЯСКЕВІЧ Е. Н.**

### ВЁСКА БАРАВЫЯ

**ШАХ Мацвей Пятровіч,** партызан, прапаў без вестак.

### ВЁСКА БАРАДАЎКІ

**БАРАДАЎКА Аляксей Макаравіч,** партызан.

**КРЭЛЬ Іван Пятровіч,** партызан Смаленскага партызанскага палка, прапаў без вестак 15.08.1944.

### ВЁСКА ВІШКАВІЧЫ

**КАСЦЯНКА Аляксандр Фёдаравіч,** партызан Чашніцкай брыгады «Дубава».

**КАСЦЯНКА Кузьма Фаміч,** партызан брыгады імя К. С. Заслонава, прапаў без вестак.

**МАЧУЛЬСКІ Канстанцін Вітольдавіч,** н. у 1917, партызан, прапаў без вестак у 1944.

**СЯНЬКО Лявонцій Фёдаравіч,** н. у 1902, партызан Чашніцкай брыгады «Дубава», загінуў 24.03.1944.

## ВЁСКА ВЯЖОЎКА

**АНІСКЕВІЧ Васіль Іванавіч,** н. у 1923, партызан, загінуў у 1944.

**АНІСКЕВІЧ Міхаіл Іванавіч,** партызан, загінуў 4.05.1944 каля в. Харакова.

**АНУФРЫЕЎ Церах Севасцьянавіч,** партызан, загінуў у 1943.

**ГНЯЎКО Нічыпар Емяльянавіч,** н. у 1913, партызан, прапаў без вестак у жніўні 1943.

**ПАДАЛЕЦ Фёдар Піліпавіч,** н. у 1925, партызан, загінуў у 1944 ва Ушацкім раёне.

## ВЁСКА ДРЫМАЎШЧЫНА

**БАКАН Аляксей Сямёнавіч,** прапаў без вестак.

**ЛУЗГІН Васіль Аляксеевіч,** партызан брыгады імя К. С. Заслонава, прапаў без вестак.

**ЛУЗГІН Уладзімір Іванавіч,** н. у 1927, прапаў без вестак.

## ВЁСКА ДУБІНЦЫ

**ЦЫРУЛЬНІК Васіль Цімафеевіч,** партызан Лёзненскай брыгады, прапаў без вестак.

## ВЁСКА ЗАЙМІШЧА

**ДОЎГІ Сямён Андрэевіч,** партызан Лёзненскай брыгады, прапаў без вестак 29.06.1944.

## ВЁСКА ЛУЦІК

**КОРБАН Васіль Міронавіч,** партызан брыгады імя К. С. Заслонава, прапаў без вестак 18.06.1944.

**КОРБАН Гаўрыла Якаўлевіч,** партызан.

**КОРБАН Іван Лявонавіч,** партызан.

**КОРБАН Пётр Антонавіч,** партызан.

**КОРБАН Сцяпан Рыгоравіч,** партызан, прапаў без вестак.

## ВЁСКА МАРЫНЦЫ

**ПАДАЛЕЦ Міхаіл Пятровіч,** партызан Сенненскай брыгады, загінуў 23.02.1944 у Сенненскім раёне.

**ПАДАЛЕЦ Сцяпан Паўлавіч,** н. у 1913, партызан Лёзненскай брыгады, прапаў без вестак 21.06.1944.

**ПАДРЭЗ Васіль Дзмітрыевіч,** н. у 1925, партызан Сенненскай брыгады.

**САПЕЛКА Якаў Яфімавіч,** н. у 1926, партызан Чашніцкай брыгады «Дубава», прапаў без вестак.

## ВЁСКА ПАПОЎКА

**ЖАЎНО Аксенцій Фядотавіч,** партызан, загінуў 6.08.1944.

## ВЁСКА ПРЫМАЧЫНА

**КАЛЕСНІКАЎ Ціхан Панцялеевіч,** партызан, загінуў 28.06.1944 у Лепельскім раёне.

## ВЁСКА СМАЛЯНЦЫ

**НОРКА Васіль Аляксеевіч,** партызан, прапаў без вестак у маі 1944.

## ВЁСКА ТАРАНТОВА

**АКСЮТА Іван Фёдаравіч,** партызан.

**АНІСКЕВІЧ Сяргей Міхайлавіч,** партызан.

**ДОЎГІ Іван Паўлавіч,** партызан Чашніцкай брыгады «Дубава», загінуў у 1944.

**ДОЎГІ Рыгор Дзмітрыевіч,** партызан, загінуў 1.05.1944.

**ДОЎГІ Ягор Дзямідавіч,** н. у 1924, партызан, прапаў без вестак.

## ВЁСКА УХЛЁ

**КАРАТКЕВІЧ Васіль Міхайлавіч,** н. у 1921, партызан, прапаў без вестак 15.10.1943.

**КАРАТКЕВІЧ Павел Фёдаравіч,** партызан.

**МАРЦІНОВІЧ Іван Ермалаевіч,** н. у 1925, партызан, прапаў без вестак 21.06.1944.

**МАРЦІНОВІЧ Сідар Андрэевіч,** сувязны-падпольшчык, загінуў у 1942.

**МАРЦІНОВІЧ Фама Архіпавіч,** н. у 1924, партызан, прапаў без вестак у 1944.

**ПАТОЦКІ Аркадзь Антонавіч,** партызан Лёзненскай брыгады, прапаў без вестак 21.06.1944.

**ШПІКЕВІЧ Леанід Сяргеевіч,** партызан, прапаў без вестак 21.06.1944.



С. А. Марціновіч

### ВЁСКА ШАЎКОЎШЧЫНА

**КОРБАН Васіль Міхайлавіч,** партызан.
**КОРБАН Міхаіл Усцінавіч,** партызан брыгады імя К. С. Заслонава.
**МІЦЬКАВЕЦ Васіль Аляксеевіч,** партызан.
**САФОНАЎ Міхаіл Нічыпаравіч,** партызан, прапаў без вестак.
**ЧАРНУХА Ягор Аляксандравіч,** партызан брыгады імя К. С. Заслонава, прапаў без вестак 18.06.1944.

### ВЁСКА ЯЗБА

**ШЫРКО Сцяпан Рыгоравіч,** партызан Чашніцкай брыгады «Дубава».

### ВЁСКА НЕВЯДОМА

**БАРАДАЎКА Мікалай Раманавіч,** партызан Чашніцкай брыгады «Дубава», прапаў без вестак.
**ГАРБАДЗЕЙ Мікалай,** партызан Чашніцкай брыгады «Дубава».
**ДОЎГІ Іван Дзмітрыевіч,** партызан, прапаў без вестак.
**КАТУЛЬСКІ Дарафей Васільевіч,** партызан Чашніцкай брыгады «Дубава», загінуў у лістападзе 1943.
**ШАХ Мацвей Пятровіч,** партызан 1-й Віцебскай брыгады, загінуў 8.02.1944 у в. Мамошкі Сенненскага раёна.
**ШАШКО Віктар Пятровіч,** партызан Чашніцкай брыгады «Дубава», прапаў без вестак.

## АНТАПОЛЬЕЎСКІ СЕЛЬСАВЕТ

### ВЁСКА АНТАПОЛЛЕ

**ВАЗНЯК Пётр Ігнатавіч,** н. у 1914, партызан, загінуў 14.12.1943.

### ВЁСКА АСЯРОДКІ

**ШТКЕВІЧ Іван Сяргеевіч,** партызан Чашніцкай брыгады «Дубава», загінуў у Латвіі.

### ВЁСКА БАБОЎКА

**БАЎТРУШКА Фёдар Арсенцьевіч,** партызан брыгады імя А. Ф. Данукалава, прапаў без вестак.
**БАЎТРУШКА Фёдар Кірылавіч,** партызан Сенненскай брыгады, прапаў без вестак 19.09.1943.
**БУРЧЫК Ягор Савельевіч,** партызан Чашніцкай брыгады «Дубава».
**ПЛЯСКАЧ Мікалай Тарасавіч,** партызан, загінуў у в. Мядзвецк Чашніцкага раёна.

### ВЁСКА БАРАЎЦЫ

**БАРАВЕЦ Андрэй Рыгоравіч,** партызан Сенненскай брыгады, прапаў без вестак.

### ВЁСКА БАРОК

**ЭРТМАН Мікалай Фраццавіч,** партызан, прапаў без вестак.

### ВЁСКА БАРСУКІ

**ЗАСЬКО Яўген Данілавіч,** партызан, прапаў без вестак.
**НІЗАВЕЦ Віктар Кузьміч,** загінуў у 1943.
**НІЗАВЕЦ Емяльян Іванавіч,** н. у 1925, партызан, загінуў 27.03.1943.
**НІЗАВЕЦ Кузьма Пятровіч,** павешаны ў 1941.
**САВІЦКІ Іван Кандратавіч,** расстраляны.

### ВЁСКА БАЯРЫ

**АДЫНЕЦ Яўген Лаўрэнцьевіч,** партызан Лёзненскай брыгады, прапаў без вестак.
**ГРЫГАРЭНКА Іван Еўдакімавіч,** партызан, прапаў без вестак.
**ГРЫГАРЭНКА Павел Іванавіч,** н. у 1923, партызан Сенненскай брыгады, прапаў без вестак.
**ЕЎПАК Андрэй Міхайлавіч,** партызан, памёр ад ран.
**ЧАРНУХА Уладзімір Гаўрылавіч,** н. у 1911, партызан, прапаў без вестак.

### ВЁСКА БЕЛАЯ ДУБРОВА

**БАЎТРУШКА Васіль Кузьміч,** партызан, загінуў 5.06.1943 пад г. Курскам.

### ВЁСКА БЕЛЬНЯКІ

**КАРАЛЁЎ Уладзімір Сямёнавіч,** партызан, загінуў 24.12.1943.

### ВЁСКА БУДЗІЛАВА

**ДАШКЕВІЧ Павел Ісакавіч,** партызан брыгады імя А. Ф. Данукалава, прапаў без вестак.

